ЛіМ

Літаратура і мастацтва

газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

1 ЛЮТАГА 2002г. № 5/4139 КОШТ 280 РУБ.

ПРЫЧАСЦЕ БУЙВАЛА

Вольга ІПАТАВА: «Беларускаму пісьменніку, як ён ні спрабуе ад гэтага ўхіліцца, трэба зноў і зноў вырашаць, кожнаму для сябе і ўсім разам, чым кіравацца ў жыцці, у творчасці, у грамадскай дзейнасці— прычасцем кветкі ці прычасцем буйвала».

4

ЛЮДЗІ

Паўла ВЕРАБ'ЁВА ў рубрыцы "Лінія жыцця"

5

НОВЫЯ ВЕРШЫ

Ніны МАЦЯШ і Галіны ДАШКЕВІЧ

8

ХОЛАДНА

Апавяданне Маргарыты ПРОХАР

9,12

У ХОРЫ ЎСЯ МУЗЫКА — ДУХОЎНАЯ

Наталля МІХАЙЛАВА: «Харысты на роўных падзяляюць поспех дырыжора. А няўдачы, бадай, больш адбіваюцца на кіраўніку...»

10—11

РАМАНТЫК З ПЭНДЗЛЕМ І САХАРОМ

Вандроўныя нататкі Мікіты СУПРУНЧУКА, напісаныя пасля вяртання з Нарвегіі, дзе ён разгадваў таямніцы загадкавай Скандынавіі

13—15

БУДЗЬМА РАЗАМ!

Шаноўныя чытачы!

Напамінаем, падпіска на "ЛіМ" на першае паўгоддзе працягваецца. Яе можна аформіць у любым паштовым аддзяленні. Кошт індывідуальнай падпіскі на адзін месяц — 1100 рублёў, на тры — 3300 рублёў, на пяць — 5500 рублёў.

Індывідуальны індэкс — 63856.

Кошт ведамаснай падпіскі на адзін месяц — 2500 рублёў, на тры — 7500 рублёў, на пяць — 12500 рублёў.

Ведамасны індэкс — 63857.

Вада... Крынічная вада...
Відаць, пілі такую продкі...

КОЛА ДЗЁН

Кола дзён — гэта, вядома ж, кругабег часу. У жыцці прыроды ён — адвечны і няўхільны: зіма, вясна, лета і восень, потым зноў усё тым жа звычным парадкам. У жыцці чалавека быццам таксама адвечны кругабег: дзед, бацька, сын, унук, а там, як спяваецца ў вядомай песні, "все опять повторится сначала". Ды на гэтым падабенства і канчаецца. У прыроды, бадай, сапраўды няма "плохой погоды". А ў чалавека досыць часта — суцэльная і цягам доўгіх гадоў цераспалосіца. Асабліва ў пераломныя, скрутныя часіны, у перыяды ломак, перабудоў і рэарганізацый. У нас цяпер якраз гэткі час.

КАЗАЧКА ТЫДНЯ

БЕЛТА, з падачы Міністэрства статыстыкі і аналізу, паведаміла, што летась рэальная заработная плата ва ўсіх галінах эканомікі і бюджэтнай сферы ў параўнанні з 2000 годам павялічылася на 30,3 працэнта. Паверым, спадарове-таварышы? Можна было б і паверыць, калі б не трэба было штодня хадзіць у прадуктовыя крамы, плаціць за камунальныя паслугі, за лекі, праезд у грамадскім транспарце, падноскі да стаптаных чаравікаў, за рамонт старога, сцямнелага тэлевізара...

ТУРЫСТЫ ТЫДНЯ

У 2001 годзе Беларусь прыняла 63 тысячы арганізаваных турыстаў і 205 тысяч так званых наведвальнікаў, якія правялі ў нашай краіне менш за суткі, без начлегу. Поруч з гэтымі надта ж сціплымі лічбамі варта паставіць такую: 1,2 мільёна. Акурат столькі беларусаў выязджалі летась за мяжу (многія па шмат разоў, вядома). Доля турызму ў нашым ВУПе — на ўзроўні 1 працэнта, у той час як у краінах з такім жа турыстычным патэнцыялам яна складае каля 10 працэнтаў. І тут, на жаль, мы не робім таго, што маглі б. І тут усё тое ж наша, звычнае: "Ат, абы не было вайны..."

СПЫНЕННЕ ТЫДНЯ

Людзі сярэдняга і старэйшага веку памятаюць, з якою ўрачыстасцю адкрываўся амаль чвэрць веку назад Наваполацкі завод БВК. Тады мо былі нават і перабольшаны незаменнасць і спажыўнасць бялкова-вітамінных канцэнтратаў, аднак жа завод працаваў, стаў флагманам савецкай мікрабіялагічнай прамысловасці, яго прадукцыя карысталася попытам і, буземоўна, спрыяла росту і прывагам парсючкоў ды бычкоў. І вось завод... спынены. Не першы раз за апошнія гады. Ды цяпер — надоўга, мо нават назаўсёды. Спажыўцы ягонай прадукцыі, а гэта пераважна прадпрыемствы з сістэмы Мінсельгасхарчу, неплацежаздольныя, не сплачваюць заводу БВК даўгоў, і завод — сканаў. Ці ажыве ён? А галоўнае, ці абыдзецца наша жывёлагадоўля без наваполацкіх парафінавых кармавых дрожджаў?

ТАРЫФЫ ТЫДНЯ

З 1 лютага, гэта значыць з сённяшняга дня, тарыфы на праезд па сталіцы ў грамадскім транспарце выраслі на 50 працэнтаў. Адна паездка на метро, аўтобусе, тралейбусе і трамваі зараз каштуе мінчукам і гасцям Мінска 120 рублёў, пенсіянерам і льготнікам — 60 рублёў. А за колькі дзён перад гэтым было аб'яўлена аб павышэнні тарыфаў на праезд у прыгарадных і міжгародніх аўтобусах. Адным словам, расцём, браткі, расцём!

ПАХВАЛЬБА ТЫДНЯ

Наша краіна займае лідзіруючае месца па тэмпах тэлефанізацыі сярод краін СНД. На кожных 100 жыхароў Беларусі маецца 30 тэлефонных нумароў. Пра гэта паведаміў міністр сувязі Уладзімір Ганчарэнка на прэс-канферэнцыі ў Палацы рэспублікі ў Мінску. Лічба, названая міністрам ледзь не з гонарам, быццам бы і радуе: амаль кожны трэці беларус мае тэлефон. Яна радуе, бо параўнанне робіцца з тымі краінамі, дзе сітуацыя — горшая.

МЯСТЭЧКІ ТЫДНЯ

Добрая навіна прыйшла з Віцебшчыны, пра што паведаміла газета "Рэспубліка" за 30 студзеня. Аблвыканкам звярнуў нарэшце ўвагу на лёс мястэчак — Бягомля, Асвеі, Езярышча, Багушэўска, Суража, Копыся і іншых, распрацаваў праграму па адраджэнні гэтых былых "раённых сталіц". Гэта добры прыклад і для іншых аблвыканкамаў! Бо такіх, на сённяшні дзень занядбаных, мястэчак шмат паўсюль на Белраусі. А ў іх жа жыве нямала людзей, недзе ў сярэднім ад дзвюх да пяці тысяч чалавек. Шчаслівейшага вам лёсу, малыя гарады!

ДЭБЮТ ТЫДНЯ

24 студзеня, у мінулую нядзелю, на Беларускім тэлебачанні адбылася прэм'ера перадачы "Галоўнае пытанне". Гаворка ішла аб лёсе беларускага рубля, а практычна аб тым, калі мы нарэшце пачнём жыць лепей. Вёў перадачу кандыдат эканамічных навук Віктар Кур'ян. Яго ад душы можна павіншаваць з гэтым дэбютам: гаворка атрымалася сур'ёзная, прынцыповая, кампетэнтная. Магчыма, не ўсё было бездакорна ў сэнсе відовішчнасці, але зместам сваім перадача была безумоўна ўдалай. А калі б, да ўсяго, яна гучала па-беларуску, дык наогул ёй, як кажуць, цаны не было б.

ХАДАЙНІЦТВА ТЫДНЯ

Улады ў Навагрудку вырашылі хадайнічаць аб прысваенні імя Янкі Купалы Бянінскай сярэдняй школе. У гэтых мясцінах, а менавіта ў маёнтку графа Даніловіча будучы народны пясняр працаваў некалькі месяцаў (у 1909 годзе) упраўляючым, адсюль пасылаў допісы ў "Нашу Ніву", тут напісаў некаторыя свае вершы. Наданне школе імя песняра будзе добрым знакам увагі і пашаны да нашага нацыянальнага Прарока і Апостала ў год ягоных 120-х угодкаў.

ТРУБАЧ ТЫДНЯ

"Народная газета" за 29 студзеня паведаміла радасную навіну з Гродна — адзіны на Беларусі слон Сурак, здаецца, паміраць не збіраецца. У заапарку лічаць, што газетныя паведамленні аб ягонай блізкай і непазбежнай смерці — заўчасныя. Тут спадзяюцца, што Сурак проста захварэў і што гэтую сваю хваробу ён асіліць. Паявілася і першая адзнака папраўкі — слон ужо трубіць...

Трэба вучыцца зарабляць

Галоўнае патрабаванне часу — уменне дзяржаўных устаноў вучыцца зарабляць самім. Аб гэтым ужо неаднаразова ў гэтым годзе гаварыў прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка. Важнасць такога падыходу да дзейнасці органаў і арганізацый сферы культуры падкрэсліў на пасяджэнні падагульняючай калегіі Міністэрства культуры і кіраўнік міністэрства Леанід Гуляка. Пасяджэнне прайшло 24 студзеня і было прысвечана абмеркаванню вынікаў 2001 года і планаў на сёлетні. Удзел у ім прынялі віцэ-прэм'ер Уладзімір Дражын, памочнік прэзідэнта — начальнік галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Іван Карэнда, прадстаўнікі парламента, Савета Міністраў, Адміністрацыі Прэзідэнта, Выканкама СНД, начальнікі абласных і раённых структур сферы культуры, кіраўнікі творчых саюзаў, сродкаў масавай інфармацыі.

У сваім дакладзе міністр культуры акрэсліў даволі значны спіс таго пазітыўнага, што ўдалося зрабіць у мінулым годзе. У большай ступені гэта ўдалося пры падтрымцы кіраўніцтва краіны. Меры па такой падтрымцы былі выпрацаваны на рэспубліканскай нарадзе работнікаў культуры з удзелам кіраўніка дзяржавы. Пратакол даручэнняў, дадзеных пасля гэтай нарады, амаль выкананы, адзначыў Леанід Гуляка, а ўключалі яны вельмі важныя для дзеячаў культуры і мастацтва пункты, накіраваныя на ўмацаванне сацыяльнага, матэрыяльнага і маральнага становішча работнікаў сферы.

Пералічэнне зробленага ў мінулым годзе заняло б вельмі шмат месца, ды і мерапрыемствы гэтыя ва ўсіх на слыху: традыцыйныя музычныя і тэатральныя фестывалі рэспубліканскага і міжнароднага значэння, конкурсы, агляды, выстаўкі, спектаклі, канцэрты. Прафесійнае і самадзейнае мастацтва развівалася, і гэта адно з галоўных дасягненняў, якое, на думку міністра, неабходна захаваць і ў будучым.

У цэлым даволі станоўча ацэньваючы вынікі 2001 года, міністр акрэсліў і шэраг праблем, вырашаць якія неабходна ў гэтым годзе. Напрыклад, узняць узровень наведвання тэатраў, павялічыць колькасць новых пастановак і канцэртных праграм, асабліва для дзяцей. Па-ранейшаму востра стаіць пытанне з паляпшэннем матэрыяльна-тэхнічнай базы многіх арганізацый культуры, асабліва сельскіх. Не адпавядае сённяшняму часу забяспечанасць і з неабходным абсталяваннем, тэхнічнымі сродкамі, музычнымі інструментамі, сцэнічнымі касцюмамі. Застаюцца актуальнымі праблемы камплектавання бібліятэчных фондаў, захаванасці музейных экспанатаў і шэраг іншых, вырашэнне якіх зноў упіраецца ў недастатковае фінансаванне.

Прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, якія выступілі на пасяджэнні, у асноўным таксама адзначалі гэтыя ж праблемы. Праўда, кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага тэатра балета Валянцін Елізар'еў заклікаў сваіх калег больш актыўна і дынамічна паводзіць сябе ў новых эканамічных умовах. Мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Рэспублікі Беларусь Міхаіл Фінберг лічыць, што зарабляць грошы перашкаджае яшчэ вельмі шмат прычын, якія не залежаць ад артыстаў. Гэта і высокая арэнда канцэртных пляцовак, і адсутнасць належнай прапаганды творчасці лепшых нацыянальных калектываў па тэлебачанні, дзе рэкламуюцца імёны не беларускіх выканаўцаў і кампазітараў. Старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў Вольга Іпатава наракала на тое, што паэтаў і празаікаў недастаткова прыцягваюць у розныя камісіі, якія вырашаюць праблемы развіцця культуры, але, на вялікі жаль, голасу пісьменніка амаль не чуваць на розных пасяджэннях і абмеркаваннях. Не сустрэць у кнігарнях, асабліва ў вёсцы, і кніг беларускіх пісьменнікаў.

Віцэ-прэм'ер Уладзімір Дражын паабяцаў з боку ўрада падтрымку і дапамогу сферы культуры. Ён назваў міністэрства адным з перадавых па стылі і метадах работы. А як галоўныя акрэсліў тры праблемы: удасканаленне кадравай падрыхтоўкі, захаванне і ўмацаванне матэрыяльнай базы і ўкараненне новых тэхналогій. Ён выказаў упэўненасць, што работнікі сферы культуры, творчая інтэлігенцыя будуць і надалей дастойна працаваць на карысць грамадства.

Уладзімір Дражын уручыў таксама Ганаровую грамату Савета Міністраў загадчыцы аддзела культуры Вілейскага райвыканкама Крысціне Шымакоўскай за значны ўклад у развіццё нацыянальнай культуры, адраджэнне і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны. А Ганаровы знак Міністэрства культуры ўручыў Леанід Гуляка Дануце Чарнушэвіч і Аляксандру Карачану.

Вольга ШЧАДРЫНА,
БЕЛТА

У Саюзе беларускіх пісьменнікаў

Адбылося першае ў гэтым годзе пасяджэнне Рады Саюза беларускіх пісьменнікаў, на якім былі разгледжаны надзённыя пытанні пісьменніцкага жыцця. У іх абмеркаванні прынялі ўдзел старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў Вольга Іпатава, намеснікі старшыні Навум Гальпяровіч і Віктар Праўдзін.

Галоўным пытаннем было вылучэнне твораў беларускіх пісьменнікаў на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Спрэчкі па прапанаваных кандытатурах разгарнуліся ў шырокую дыскусію пра набыткі беларускай літаратуры за апошнія гады. У спрэчках выступілі члены Рады, вядомыя беларускія пісьменнікі У.Гніламёдаў, С.Андраюк, Г.Далідовіч, В. Зуёнак, А.Мальдзіс, А.Марціновіч, К.Камейша, У.Паўлаў, І.Чарота і іншыя.

У выніку тайнага галасавання членаў Рады на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры (паэзія, проза, крытыка, літаратура для дзяцей і юнацтва, публіцыстыка) былі вылучаны творы В. Гардзея, В.Жураўлёва, А. Казлова, Н.Мацяш, У. Мархеля, У.Саламахі, Ю.Станкевіча, А. Федарэнкі, У.Ягоўдзіка. Таксама вылучаны на атрыманне Дзяржаўнай прэміі РБ культурна-асветніцкі праект — кніжная серыя «Беларускі кнігазбор», стваральнікамі якога з,яўляюцца К. Цвірка і Г. Вінярскі.

Па другім пытанні «Аб сучасным стане работы літаратурна-мастацкіх выданняў «Полымя», «Маладосць», «Нёман», «Крыніца», «Беларусь», «ЛіМ» з інфармацыяй выступіў В. Праўдзін. Ён асаблівую ўвагу звярнуў на стан падпіскі на беларускія літаратурныя выданні, які нельга назваць задавальняючым і які не адпавядае патрабаванням часу. У выступленнях прадстаўнікоў літвыданняў, членаў Рады прагучалі прапановы па пераадоленні гэтай вострай сітуацыі. Заклапочанасць выданнем часопісаў гучала ў выступленнях Р. Баравіковай, С. Законнікава, А. Канапелькі, В. Зуёнка, А. Шабаліна, А. Пісьмянкова, В. Блакіта, А. Бутэвіча, У. Ліпскага, Л. Дранько-Майсюка і іншых.

Сярод іншага, на пасяджэнні Рады былі закрануты пытанні правядзення святкавання семідзесяцігоддзя «Літаратуры і мастацтва» і падрыхтоўкі пленума СБП па крытыцы.

Я.ІВАНОЎ

●

Зборнік твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа, прысвечаны 120-годдзю з дня іх нараджэння, рыхтуецца ў Балгарыі. Пра гэта паведаміў у лісце на імя старшыні СБП Вольгі Іпатавай Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Балгарыі Аляксандр Пятроў. Ужо вырашаны пытанні фінансавання, вызначана выдавецтва і склад перакладчыкаў. Каардынатарам праекта з'яўляецца даўні сябар нашай краіны Стэфан Паптонеў.

Зараз вырашаецца пытанне пра наведванне С. Паптоневым Саюза беларускіх пісьменнікаў. У планах перакладчыка— падрыхтоўка юбілейнага зборніка, анталогіі беларускай прозы, кнігі вершаў Вольгі Іпатавай.

Н.К.

ПРЭЗЕНТАЦЫІ

Святая зямля за акном мінскай кватэры

9 студзеня ў памяшканні Ізраільскага культурнага цэнтра ў Мінску адбылася прэзентацыя манаграфіі "Ізраіль Басаў". Аўтар тэксту і ўкладальнік мастацтвазнаўца Ларыса Фінкельштэйн. Выданне пабачыла свет з ласкі амерыкана-габрэйскай арганізацыі "Джойнт". Наклад невялікі. Усяго 500 асобнікаў. Такім чынам манаграфія патрапіць толькі ў бібліятэкі ды яшчэ да шчыльнага кола сяброў і блізкіх мастака. Ізраіль Басаў (1918—1994) — надзвычай цікавая асоба, самабытны мастак. Сёння, калі на руінах «сацыялістычнага рэалізму" сцвярджаецца новая шкала каштоўнасцяў, творчасць Ізраіля Мацвеевіча Басава бачыцца з іншага гледзішча. За савецкім часам ягоная творчасць была нібыта на ўскрайку, недзе па-за "генеральнай" лініяй (адпаведна — па-за межамі дзяржзаказу). Сёння ж яна ўспрымаецца як праява свабодалюбства, як сведчанне духоўнага супраціву, як рэалізацыя натуральнага права мастака быць самім сабою пры якой заўгодна ўладзе і сацыяльным ладзе. Сёння Ізраіля Басава называюць выдатным і нават вялікім мастаком. Ізраільскія мастацтвазнаўцы сцвярджаюць, што бачаць у ягоных палотнах краявіды Святой зямлі і канкрэтна — Ерусаліма; што ягоныя сюжэтныя палотны — не што іншае, як аповед пра старажытную гісторыю габрэйскага народа. Цікавае сцвярджэнне, калі браць да ўвагі, што мастак нарадзіўся ў Мсціславе, большую частку жыцця пражыў у Мінску і ніколі не выязджаў з Беларусі. Але ж і Язэп Драздовіч ніколі не бываў на Марсе ды Сатурне, свае касмічныя краявіды ён рабіў, натхняючыся беларускімі палеткамі, лясамі, пагоркамі. Дык і Басаў мог убачыць у Мінску Ерусалім. Была б душа відушчая...

На прэзентацыі Ларыса Фінкельштэйн пазнаёміла прысутных з урыўкамі свайго тэксту, са сваёй трактоўкаю твораў мастака.

Як на маю думку, спадарыня Фінкельштэйн занадта драматызавала жыццё Ізраіля Басава. Так, ён не меў шырокага прызнання — але ён да гэтага і не імкнуўся. Так, часам не хапала грошай на жыццё, нават пры ягоным сціплым побыце і свядомым абмежаванні патрэбаў — але хто з мастакоў, асабліва на пачатку творчасці, з гэтым не сутыкаўся? Не быў зразуметым пры жыцці, не атрымаў заслужанай пашаны — ды ўсё ж ягоныя творы ёсць у Нацыянальным мастацкім музеі; да таго ж, ці можам мы сёння сцвярджаць, што нарэшце "правільна" разумеем ягоную творчасць? Зрэшты, сапраўдны мастак ужо па вызначэнні, па характары сваёй дзейнасці знаходзіцца ў перманентным канфлікце з грамадствам. Бо ставіць пад сумнеў усталяваныя стэрэатыпы і звыклыя паняцці.

Так што мастаку скардзіцца на непаразуменне, на непрызнанне — гэта тое ж самае, што парасону скардзіцца на дождж.

Дарэчы, калегі Ізраіля Басава ставіліся да яго з павагаю. У прыватнасці, Аляксандр Кішчанка (сам асоба неардынарная) творчасцю Басава захапляўся, знаходзіў у ягоных палотнах і глыбіню думкі, і высокую эмацыянальнасць.

На прэзентацыі прагучала думка, што ў Басава не было непасрэдных вучняў, але ягоны ўплыў на наша нацыянальнае мастацтва другой паловы мінулага стагоддзя яшчэ насамрэч не асэнсаваны. Можа, і так. Вялікае бачна здалёк.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

ПРЭМ'ЕРЫ

Бенефіс у рытме вальса

Бенефіс сёння — даволі рэдкае слова на тэатральных афішах. Ды і каб наладзіць вечар у гонар творчай асобы, звычайна чакаюць, як кажуць, круглай даты. А вось у Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі вырашылі не чакаць і павіншаваць вядучую актрысу тэатра Таццяну Мархель без залішняй афіцыйнасці і з вялікай доляй гумару. Мастацкі кіраўнік тэатра Валерый Анісенка зазначыў: «Усе пытаюцца: дык што, у Мархель — юбілей? Не юбілей. Наша пяшчота, захапленне, любоў да выдатнай актрысы, да нашай каляжанкі — нагода, каб мы сустрэліся разам».

Таццяна Рыгораўна Мархель — актрыса кіно і тэатра, уладальніца цудоўнага голасу, любімы студэнтамі педагог, заслужаная артыстка рэспублікі. Не дзіва, што на яе бенефісе сабраліся прадстаўнікі самых розных мінскіх тэатраў — операга, Тэатра-студыі кінаакцёра, дзе працавала раней Таццяна Рыгораўна, Тэатра сатыры і гумару «Хрыстафор», спектакль якога «Дзень танкіста» дадаў да творчага аблічча актрысы яшчэ адзін яркі камедыйны нюанс. Канечне ж, не засталіся ўбаку і артысты самаго РТБД, якія падрыхтавалі да бенефісу вясёлы капуснік, трапна ўзгадаўшы пушкінскую Таццяну. Кожны з тых, хто выходзіў на сцэну ў гэты вечар, мог бы доўга і ад шчырага сэрца прамаўляць прыемныя словы ў адрас сапраўды народнай па папулярнасці актрысы. Але гаспадар-распараджальнік вечара Валерый Анісенка аддаў перавагу не словам, а «справе» — спевам, танцавальным нумарам, гумарыстычным сцэнкам, якія былі паядданы гукамі цудоўнага вальса.

Не гэтак даўно ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі адбылася прэм'ера спектакля «Жанчыны Бергмана» па п'есе Мікалая Рудкоўскага. Таццяна Рыгораўна ў гэтай пастаноўцы здзівіла незвычайным трагізмам сваёй гераіні, а яе роля Інгрыд стала сапраўдным адкрыццём для тэатральнай публікі. Спадзяёмся, што наперадзе гэтакую жыццярадасную і адораную актрысу чакае яшчэ не адна ўдалая праца — у тэатры, кіно, на эстрадзе.

Юлія ПАЛАЧАНІНА

На здымку: Т. МАРХЕЛЬ у спектаклі "Жанчыны Бергмана".
Фота Г. ЖЫНКОВА

НОВАЕ

Вільня ў душы, Вільня ў сэрцы

Выдавецтва "Юнацтва" не першы год выпускае зборнікі гістарычнай літаратуры «Бацькаўшчына", якія даўно ператварыліся ў своеасаблівыя дапаможнікі для падрастаючага пакалення для лепшага вывучэння мінулага свайго краю, знаёмства са знакамітымі людзьмі. А яшчэ, што вельмі важна, асобныя выпускі, як правіла, прысвячаюцца пэўным падзеям, а то і гарадам. Гэтым разам прыйшла чарга Вільні, якая і з'яўляецца як бы героем дзевятага выпуску "Бацькаўшчыны", што толькі што прыйшоў да чытача.

Нязменны складальнік зборнікаў Сяргей Панізнік у прадмове "Вільнюс — прыяцелю мой ласкавы" зазначае: "З Вільняю знітавана духоўнае, нацыянальнае адраджэнне беларусаў. Прамовім толькі два словы: "Наша Ніва", — і яркімі зоркамі ўсплывуць у памяці дзесяткі імёнаў будзіцеляў, нязломных духам сейбітаў. Сапраўды, на промнях стагоддзяў пагойдваецца калыска нашае культуры — Вільня, творчая радзіма вялікай плеяды класікаў Роднага Слова". А як не ўслухацца ў развагі Рыгора Барадуліна "Вільня ў нашых душах": "Кожны крывіч, кожны беларус носіць Вільню ў сваёй душы. А ўсё, што жыве ў душы, не разбураецца, не руйнуецца, яно непадлеглае нават бязлітаснаму часу".

Сапраўды, Вільня ў нашай душы, Вільня ў нашым сэрцы, а ў дачыненні да гэтага выпуску "Бацькаўшчыны" трэба сказаць,што Вільня і ў кнізе. Згадкі Рыгора Іванавіча ўзяты з першага раздзела "Ой, у Вільні, Вільні ўсе званы зазванілі...", а ў ім ёсць яшчэ і падборка з фальклорных запісаў "Пайшла тая слава...", і матэрыялы, аўтарамі якіх з'яўляюцца Генадзь Каханоўскі ("Мінск, Маладзечна, Вільня..."), Іван Шамякін ("Поплеч!"), Альбінас Жукаўскас ("Жывая плынь братэрства"), Максім Танк ("Гартаючы лісткі календара").

Прадстаўлены ў выпуску і раздзелы "Калыска слова", "Віленскія сутворцы", "Вандроўка ў блізкі свет". Каторы ні возьмеш — слова шчырае, слова прачулае пра горад, які займае такое важнае ў гісторыі нашай дзяржаўнасці, пра слаўных людзей, якія ў розны час жылі ў Вільні, а некаторыя і тварылі там. Гэта і слова пра сам дух беларускі, пра тую асаблівую атмасферу, што напаткоўвае ў гэтым слаўным горадзе, у якім па-ранейшаму многае дыхае беларускасцю.

Сяргей Панізнік апошнім часам па сутнасці жыў Вільняй, жыў гэтай кнігай, па крупінках парадкуючы багатыя матэрыялы. І, канечне ж, пад адной вокладкай сабрана далёка не ўсё: "Дзесяткамі гадоў збіраўся матэрыял, змешчаны ў гэтым анталагічным зборніку. Выбачаюся перад аўтарамі (а яны таксама жылі і жывуць "галавой да Вільні"), творы якіх апынуліся ў другім, укладзеным мною, томе і чакаюць свайго выдаўца".

Да месца патлумачыць значэнне выразу "галавой да Вільні". Узята яна з прытчы, што ў свой час расказвала С. Панізніку яго маці пра сваіх суседзяў, якія да вайны жылі ў Віленскім ваяводстве: "...каб аформіць купчую на зямлю, пасудзіцца з панам, трапіць да важнага лекара, а разам з тым купіць кнігу або чысленнік (каляндар), маміны суседзі адпраўляліся ў Вільню. Дабіраліся яны пехатою ажно трое сутак. І быў самы вялікі клопат у дарозе, калі збіраліся пераначаваць, — гэта правільна легчы: галавою да Вільні. Тады назаўтра раніцою яны ведалі накірунак далейшага шляху".

Калі працягваць "разгортваць" гэты вобраз, дык дарогу на Вільню ўказваюць дзесяткі пісьменнікаў, сярод якіх Максім Багдановіч, Янка Купала, Якуб Колас, Максім Гарэцкі, Уладзімір Караткевіч і тыя, хто жыве і піша сёння. Завяршае ж выпуск падборка згадак, меркаванняў настаўніцы беларускай школы імя Ф. Скарыны ў Вільні Леакадзіі Мілаш, што пазначана як "Віленская хроніка Леакадзіі Мілаш..."

А. АН-ЕВІЧ

ВЫСТАВЫ

Знаёмцеся: польскі плакат

Вялікая экспазіцыя польскага плаката 1975—2000 гадоў адкрыла новы выставачны год у музеі Беларускай акадэміі мастацтваў. Выстава падрыхтавана і прадстаўлена Польскім інстытутам у Мінску. Першая выстава польскага плаката ў Мінску адбылася ў 1996 г. у Рэспубліканскай мастацкай галерэі ("Польскі плакат 1985—1995 гг."), яна выклікала вялікую цікавасць гледачоў і спецыялістаў. І невыпадкова. Польскі плакат — з'ява адметная ў сусветнай мастацкай культуры. Для спецыялістаў менавіта польскі плакат пасляваеннага часу прадстаўляе еўрапейскую школу плаката. Параўнаць польскі плакат па значнасці можна хіба што з японскім, які вызначае стылёва іншую плынь развіцця гэтага мастацтва.

Плакат, як мастацкая з'ява, робіцца шырокавядомым і прызнаным у 80-я гады XIX стагоддзя. На яго развіццё паўплывалі і кубізм, і экспрэсіянізм, найбольш канструктывізм, што ўрэшце вырашыла пытанне пластычнай мовы плаката. "Аўтар плаката павінен валодаць некалькімі мастацкімі спецыяльнасцямі, быць мастаком і дызайнерам, псіхолагам, а галоўнае — здольным данесці інфармацыю пра падзеі мовай вобразаў шырокаму колу гледачоў і быць адначасова наперадзе настрояў грамадства, — разважае мастацтвазнаўца Міхал Баразна. — Засяродзіць увагу чалавека, які падпарадкаваны сучаснаму імкліваму руху жыцця, стандартным памерам аркуша, задрукаваным літарамі, каляровымі плямамі, росчыркамі, надзвычай цяжка. Але толькі пасля жорсткіх выпрабаванняў у "палявых умовах" лепшыя работы плакатыстаў паказваюцца на міжнародных выстаўках, трапляюць у музейныя калекцыі, на старонкі ўплывовых выданняў".

Польскі плакат вылучаецца не толькі характэрнай для гэтага мастацтва лаканічнасцю мовы, але і запамінальнай відовішчнасцю, фармальнай свабодай, спецыфічна-аўтарскім падыходам. Кожны плакат стварае вобраз вельмі дакладны і нестандартны адначасова. Ён запамінаецца вольнай трактоўкай, нечаканымі падыходамі да вырашэння тэмы, смеласцю ў кампазіцыйнай будове, высокім густам падачы, разнастайнасцю колеравай гамы і шрыфтавога афармлення. І, галоўнае, польскі плакат ніяк не назавеш заштампаваным, аднастайным, залішне тэхналагічным, кожны ліст нясе непаўторны адбітак рукі аўтара. А мастакоў-плакатыстаў за 1960—90-я гады Польшча дала свету нямала: Г. Тамашэўскі, А. Пангоўскі, Е. Чарняўскі, Л. Маеўскі, Т. Шулецкі, В. Свежы, М. Васілеўскі, К. Баран ды іншыя. Поспех да польскага плаката прыйшоў яшчэ ў тыя часы, калі манаполіяй на плакат валодала дзяржава і прыярытэтным быў палітычны плакат. Але і тут можна заўважыць вялікі аб'ём фармальных свабод, забароненую сімволіку ды іранічныя адносіны да прапагандысцкіх ідэй. Але гэтак жа папулярнымі ў Польшчы былі і тэатральны, цыркавы, музычны, рэкламны плакаты. Найбольшы росквіт польскага плаката прыпадае на 80—90-я гады. І гэта тычыцца не толькі знакамітых плакатаў "Салідарнасці", выбарчых, рэлігійных плакатаў, але і відовішчных, лепшыя з якіх прадстаўлены зараз на выставе ў Беларускай акадэміі мастацтваў.

Сёння польскія даследчыкі мастацтва спрачаюцца, ці не знікне польскі мастацкі плакат у безлічы камерцыйнай халтуры, якая запаланяе вуліцы польскіх гарадоў стандартнымі плакатнымі дошкамі. Але плакат трымае свае пазіцыі. І гэта падмацоўваецца міжнароднымі конкурсамі, дзе пераможцамі выходзяць польскія плакатысты.

Н. ШАРАНГОВІЧ

АБСЯГІ

ГРОДЗЕНШЧЫНА...

Гаварылі пра мову, літаратуру

У Лідскім мастацка-краязнаўчым музеі прайшла сустрэча з гродзенскім пісьменнікам Сяргеем Астраўцом. Творца расказаў землякам, як нараджалася ягоная кніга "Цэнзарскія нажніцы", аб сваёй літаратурнай працы. У гаворцы прынялі ўдзел Валерый Сліўкін, Анатоль Кулеш, Уладзімір Васько, Серафім Янец, Пётр Макарэвіч. Адны з іх даўно пішуць вершы, другія выступаюць у друку як публіцысты. Абмен думкамі не абмежаваўся творчасцю госця, а выліўся ў дыялог пра сучасны стан прыгожага пісьменства, лёс роднай мовы.

Вяртанне кніганошаў

Дзесяты год працуе літоўская школа ў вёсцы Пеляса Воранаўскага раёна. Тут вучацца на роднай мове дзеці літоўцаў, якія кампактна пражываюць у наваколлі. Нядаўна настаўніцкі калектыў адрадзіў у гэтых мясцінах распаўсюджаны ў Літве ў XVIII—XIX стагоддзях рух кніганошаў. Раз на тыдзень старшакласнікі наведваюць бліжэйшыя вёскі і дастаўляюць сялянам прывезеныя з Вільні кнігі, а таксама газеты і часопісы. Асабліва задаволеныя такой акцыяй людзі сталага веку. Адказвае за дзейнасць юных прапагандыстаў літаратуры настаўніца Жывіле Дайнене.

Спектаклі для школьнікаў

Два спектаклі — "Дарога на Віфлеем" і "Зімовая казка" — паглядзелі нядаўна лідскія школьнікі. Першы паказаў сталічны тэатр юнага гледача, другі — Слонімскі драматычны тэатр. Абодва калектывы сваімі цікавымі пастаноўкамі выклікалі захапленне не толькі ў дзяцей, але і ў іх бацькоў.

Алесь ЖАЛКОЎСКІ

ГОМЕЛЬШЧЫНА...

Запрасілі ў Ватыкан

Гомельскі жывапісец Андрэй Крылоў адносіцца да сярэдняга пакалення сяброў Саюза мастакоў. Нарадзіўся ён на Віцебшчыне. Быў удзельнікам першага міжнароднага пленэру імя Марка Шагала. Андрэй — аўтар палотнаў пра беларускую зямлю: "Ружы", "Восеньская раніца", "Апошні бэз"... Яго творы знаходзяцца ў музеях і калекцыях Германіі, Францыі, Італіі, Польшчы. Нядаўна мастака запрасілі ў Ватыкан для наведвання тэмтэйшай карціннай галерэі. Зараз свае лепшыя жывапісныя творы Андрэй Крылоў экспануе ў карціннай галерэі абласной арганізацыі Саюза мастакоў.

Перамогі маладых

У Гомельскім гарадскім цэнтры культуры ва ўрачыстай абстаноўцы прайшло ўзнагароджанне пераможцаў конкурсу "Зорнае юнацтва — 2001". Творчае спаборніцтва правёў гарвыканкам. Таленавітая моладзь сапернічала па адзінаццаці намінацыях. Пераможцамі ў намінацыях "сцэнічнае майстэрства", "проза і паэзія", "выяўленчае мастацтва" сталі Таццяна Зарэцкая, Віталь Петрашко, Арцём Смыкоўскі.

Тыдзень ізраільскага кіно

У Гомельскім цэнтральным кінатэатры імя Калініна прайшоў тыдзень ізраільскага кіно. У цырымоніі яго адкрыцця браў удзел Надзвычайны і Паўнамоцны пасол гэтай краіны ў Беларусі Марцін Пелед Флекс. Яго прыняў мэр Гомеля Леанід Барабанаў. На прэс-канферэнцыі пасол расказаў пра развіццё беларуска-ізраільскіх культурніцкіх стасункаў.

Аляксей ШНЫПАРКОЎ

ВІЦЕБШЧЫНА...

Прэзентацыя зборніка

У бібліятэцы імя У. Караткевіча адбылася прэзентацыя зборніка вершаў віцебскага журналіста Алеся Шпыркова "Карабель мой блакітна-зялёны". Вучні і настаўнікі Віцебскай сярэдняй школы № 11 з цікавасцю слухалі вершы Шпыркова і самі выступілі з літаратурнай кампазіцыяй па ягоных творах. Пра творчасць калегі гаварылі на вечарыне А. Канапелька, Д. Сімановіч, А. Салтук, Ф. Сіўко.

Святлана ГУК

МАГІЛЁЎШЧЫНА...

Класічны габелен

У выставачнай зале Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея адкрылася экспазіцыя класічных габеленаў. На ёй — 56 работ, створаных майстрамі Парыжскай фабрыкі габеленаў. Знакамітая фабрыка існуе ўжо больш за трыста гадоў. На выставе ў Магілёве прадстаўлены копіі твораў, якія захоўваюцца ў музейных зборах Лондана, Парыжа, Бруселя, Амстэрдама.

Алесь ПЯТРОВІЧ

БРЭСТЧЫНА...

Захаваць спадчыну

На тэрыторыі Брэстчыны знаходзіцца каля дзвюх з паловай тысяч помнікаў гісторыі, архітэктуры і археалогіі. Згодна з Законам аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны паўсюдна ствараецца дзяржаўны спіс гэтых святыняў. На Брэстчыне з гэтай нагоды мясцовы аблвыканкам сумесна з Дэпартаментам Міністэрства культуры па ахове спадчыны і рэстаўрацыі помнікаў наладзіў 25 студзеня абласны семінар-практыкум. На ім разгледжаны парадак, умовы і вызначаны тэрміны стварэння новага дзяржаўнага спісу.

Удзельнікі семінара наведалі ў вёсцы Скокі родавае гняздо выдатнага пісьменніка-драматурга Юльяна Нямцэвіча — паплечніка Тадэвуша Касцюшкі. Пасля ўдзельнікі нарады пазнаёміліся з дзейнасцю Брэсцкага райвыканкама па ўсталяванні інфармацыйна-ўказальных знакаў да найбольш значных помнікаў гісторыі і прыроды.

НАШ КАР.

МІНШЧЫНА...

Графіка, пейзаж, нацюрморт

З гэтага тыдня ў абласным Цэнтры народнай творчасці адкрылася персанальная выстава кіраўніка Маладзечанскай народнай студыі выяўленчага мастацтва Анатоля Акуліка. Анатоль Арсенцьевіч — колішні выпускнік тэатральна-мастацкага інстытута, плённа працуе ў самых розных накірунках выяўленчага мастацтва. У экспазіцыі — 35 работ. Гэта пейзажы, нацюрморты, графічныя творы, выкананыя гуашшу і тушшу.

Па сучасных тэхналогіях

У лекцыйнай зале Нацыянальнай бібліятэкі 29 студзеня адбылася прэзентацыя лабараторыі па пераводзе ў электронна-лічбавую форму фондаў грамзапісу. Дзейсную дапамогу ў гэтым аказалі амбасада ЗША і яе інфармацыйны цэнтр

НАШ КАР.

ЧАСАПІС

У госці да школьнікаў

У сярэдняй школе № 98 заведзена добрая традыцыя — праводзіць сяброўскія сустрэчы вучняў з вядомымі дзеячамі культуры. На гэты раз дзверы школьнай гасцёўні адчыніліся для паэта Г. Бураўкіна і празаіка і публіцыста Я. Лецкі.

Вучням і настаўнікам было цікава бліжэй пазнаёміцца з жыццём і грамадскай дзейнасцю Генадзя Мікалаевіча і Яўгена Рыгоравіча, прычыніцца да іх творчасці, думак, поглядаў. Госці з задавальненнем адказвалі на пытанні, з ахвотай разважалі над жыццёвымі праблемамі, дзяліліся з малодшым пакаленнем сваім вопытам.

Напрыканцы было шмат жадаючых атрымаць аўтографы, пагутарыць з літаратарамі.

Вучні з нецярпеннем чакаюць новых сустрэч з цікавымі людзьмі. Будзем рады бачыць іх у нашай гасцёўні.

Ірына ЦЕЦЯРУК

У адзіным палёце

У галерэі Нацыянальнага мастацкага музея РБ адкрылася выстава твораў вядомых беларускіх мастакоў — Георгія і Наталлі Паплаўскіх. Сёння іхнія імёны сімвалізуюць высокі творчы патэнцыял, адметны стыль, а таксама сямейны творчы, калі хочаце, "клан", дзе расце і квітнее новае пакаленне графікаў.

Георгій і Наталля скончылі Мінскае мастацкае вучылішча, Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут, што сталі стартавай пляцоўкай для фарміравання гэтых арыгінальных творчых асоб. Творчасць і грамадская дзейнасць Паплаўскіх уганаравана шмат якімі дзяржаўнымі і грамадскімі ўзнагародамі. Георгій Паплаўскі — народны мастак Беларусі, правадзейны член РАМ, НАН РБ, прафесар творчых майстэрань Беларускай акадэміі мастацтваў, лаўрэат міжнародных прэмій. Неаднаразова быў узнагароджаны дыпломамі і медалямі Францішка Скарыны. Найбольш вядомымі сталі творы, якія выйшлі ў выдавецтвах "Беларусь", "Мастацкая літаратура", "Юнацтва" і іншых, дзе ён выканаў афармленне кніг Я. Купалы, Я. Коласа, Я. Брыля, В. Быкава, А. Адамовіча... Знакамітыя графічныя цыклы серыі "Азёрны край", "Браслаўшчына", "Індыйскі дзённік" увайшлі ў гісторыю беларускай графікі як сімвалы ўзаемасувязі і пераасэнсавання традыцый розных культур свету. З новых прац у экспазіцыю ўвайшлі "Партрэт жонкі мастака" (2002), "Тропікі. Куба" (2001) і іншыя.

Наталля Паплаўская стварыла ілюстрацыі для шмат якіх беларускіх казак, а таксама дзіцячых кніг. Хто не ведае яе літаграфій "Дзядок", "Залатая яблынька" з серыі "Героі беларускіх казак"! Яе творчы лёс на працягу дзесяткаў гадоў таксама звязаны з выдавецтвамі "Беларусь", "Народная асвета", "Мастацкая літаратура", што спрыяла сталенню таленту Наталлі. Яшчэ на Усесаюзным конкурсе за лепшае афармленне выданняў 1970 года Георгій і Наталля Паплаўскія былі ўзнагароджаны дыпломамі і медалямі за ілюстрацыі школьных падручнікаў. За распрацоўку нацыянальнай тэмы ў афармленні кніг і серыю літаграфій пад назвай "Палессе" Наталлі Паплаўскай было нададзена званне лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

Георгій і Наталля Паплаўскія імкнуцца абазначыць новыя траекторыі сваіх мастацкіх шляхоў на віражах XX ст. Сёння творы Паплаўскіх знаходзяцца ў зборах Нацыянальнага мастацкага музея РБ, музеяў сучаснага мастацтва ў Мінску, Маскве, у замежных прыватных калекцыях Расіі і Еўропы.

Людміла НАЛІВАЙКА

НАДЗЁННАЕ

Прычасце буйвала

Ад рэдакцыі. Гэта — пяты і пакуль што апошні артыкул старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў Вольгі Іпатавай на тэму сённяшняга пісьменніцкага жыцця. На думку Вольгі Міхайлаўны, увага грамадскасці да праблем, пастаўленых у артыкулах, дасягнутая, апроч таго, у размову ўжо ўключыліся пісьменнікі і журналісты, у тым ліку і з іншых краін.

Што ж тычыць рэакцыі ўлады, то ўсё, відаць, яшчэ толькі пачынаецца...

Калісьці ў маладосці я была захопленая выслоўем мудрага японца Кавабаты: «Той, хто прыняў прычасце кветкі, ніколі не прыме прычасця буйвала».

Чым больш я думала над гэтымі словамі, тым больш яны мне падабаліся. Асабліва ў адносінах да Творцы — мастака ці паэта. Ён па прызванні сваім, па таленце, дадзеным Усявышнім, павінен быць мяккім сэрцам, чуйна слухаць Прыроду і адчуваць найтанчэйшы зрух чалавечай душы. Ён ад нараджэння ўжо прычасціўся да к в е т к і, і таму ніколі не захоча тварыць Зло.

Але ёсць людзі, якія, па вызначэнні казак і паданняў, маюць «каменнае сэрца». Раўнадушныя да пакут і пачуццяў іншых, хцівыя і няздольныя спачуваць, яны спрабуюць дабіцца патрэбнага ім сілай. Гэта тыя, хто, па словах пісьменніка, прыняў «прычасце буйвала». Гора той краіне, дзе яны ў большасці! Дзе палітыка вызначаецца не павагай да Асобы, да яе непаўторнасці, а спробай нівеліраваць усіх, як кажуць, «на адзін капыл». Бо і сучаснае, надта ж аддаленае ад сапраўдных каштоўнасцей Быцця чалавецтва ўсё болей схіляецца да разумення сябе, сваёй гісторыі, разглядаючы яе, па словах Ф. Шэлінга, як «важны этап развіцця абсалюту і рэалізацыі творчай інтуіцыі суб'ектаў — людзей на шляху іх зліцця з вышэйшай аб'ектыўнасцю». І кожны народ так ці іначай прымае ўдзел у рэалізацыі сваёй касмічнай задачы.

Нават калі сам ён аб гэтым не задумваецца і не хоча слухаць ніякіх філосафаў.

... Недзе ў снежні я шукала ў кнігарні беларускі каляндар.

— У нас няма. Ды мы іх ніколі і не бяром, — заявіў прадавец.—Каму яны патрэбныя?

— Раз шукаю, значыць, патрэбныя. А чаму вы так зняважліва кажаце пра сваё? Хіба гэта нармальна?

І тут у размову ўступіў нейкі абадраны, з сінявата-барвовым тварам "кліент", які невядома чаго забрыў у тую кнігарню.

— А ты фашыстка, — сказаў ён мне.

— Гэта чаму ?

— А на фашысцкай мове гаворыш!

Я пачала было гаварыць пра тое, што мова мая, што бацькі змагаліся з фашызмам, і ад вялікай маёй радні на Віцебшчыне амаль нікога не засталося... Але ён не слухаў. І я павярнула да выхаду.

— Фашыстка! — бег за мной і крычаў гэты недамерак. — Я сам чуў, ШТО па тэлевізары пра такіх, як ты, гаварылі! Што вы ўсе супраць улады, га!

Адбывалася ўсё гэта ў цэнтры сталіцы — якраз недалёка ад Тэатра юнага гледача. І я ўспомніла, што заслужаная артыстка гэтага тэатра расказвала, як пасля спектакля падгулялыя падлеткі збівалі яе з каляжанкай, і яна маўчала, толькі захіляла сабой маладзейшую, бо тая была — цяжарная. А другая, кіназнаўца, нядаўна падзялілася ўражаннямі аб тым, як адбівалася ў сваім жа пад'ездзе ад рабаўніка. Ды, зрэшты, было што ўзгадаць і мне — колькі гадоў таму, калі я праз парк Горкага вярталася з Нацыянальнай бібліятэкі ў Дом літаратара, мяне спрабавалі спіхнуць у ледзяную Свіслач, і, калі б на мастку не паказалася група моладзі і не спалохала нападоўцу, наўрад ці выбралася я ў цяжкім зімовым адзенні з тых гранітных берагоў.

Усе гэтыя напады нідзе не рэгістраваліся. А колькі ж іх адбываецца штодня! Недзе чытала афіцыйныя лічбы: здаецца, кожны дзесяты жыхар краіны, уключаючы немаўлят і старых, прыцягваўся да судовай адказнасці. Але ці змяншаецца колькасць злачынстваў? І ці можна з імі справіцца аднымі карнымі метадамі?

Цяжкая, нябачная, але надта адчувальная аўра агрэсіі, злобы, нянавісці нібыта кладзецца на ўсіх нас. У аўтобусе, варта ўспыхнуць спрэчцы, пачынаюць віраваць такія страсці, што, здаецца, людзі вось-вось пачнуць душыць адзін аднаго з-за таго толькі, што нехта некага штурхнуў альбо не саступіў месца. Што ўжо казаць пра больш сур'ёзныя правіны!

Агрэсія, альбо, як кажуць у народзе, навала — гэта метастазы, якія раз'ядаюць грамадства хутчэй і страшней, чым іржа самы стойкі метал.

І самае жахлівае, калі іх ініцыіруюць самі інстытуты ўлады, якія па сваім прызначэнні прызваныя кансалідаваць грамадства, сцішаць звярыныя інстынкты, уздымаць душу і, значыць, духоўнасць.

Сапраўды, тэлебачанне шмат "пастаралася", каб не толькі ў маладасведчаных, малаграматных людзей узнікла сляпая, безразважная, але ад таго не менш страшная *н е п р ы я з н а с ц ь д а б е л а р у с к а г а*. Яна, у запале палітычных баталій, накіроўвалася супраць канкрэтных людзей, але ж у выніку ўсё роўна агрэсія, выпушчаная, ці, дакладней, запушчаная ў грамадства, працуе, яна нікуды не дзелася. Знішчыць, "анігіліраваць" яе можна — і пра гэта кажуць нам усе рэлігіі свету — толькі любоўю, толькі самаахвярнасцю. У народзе казалі — "замаліць".

Я часта задаю сабе пытанне — колькі ж гэта трэба духоўнай і фізічнай энергіі, каб замольваць усю тую навалу, што мы перажылі ў апошнія часы? І ці ёсць яна ў нас ? Колькі яе засталося пасля крыўд, зняваг, пасля сітуацый, калі, здаецца, ірвалася сэрца?

На пытанне Уладзіміра Паўлава, сакратара Саюза пісьменнікаў — "Па якім праве адбіраюць будынак паліклінікі, за які пісьменнікі заплацілі 85 тысяч рублёў?" (што ў тыя гады было велізарнай сумай), І. Ціцянкоў, тады "другі чалавек у краіне," як яго называла прэса, адказаў коратка і ясна:

— Так нада.

"Так нада" — маглі б адказаць на той жа мове "революционной целесообразности" тыя, хто сёння не адказвае на лісты сакратарыята Саюза пісьменнікаў, куды ўваходзяць вядомыя пісьменнікі, кіраўнікі выдавецтваў і друкаваных органаў СБП.

Усё яшчэ — не адказваюць! На простае і надта ж, відаць, непрыемнае пытанне: чаму, паабяцаўшы ўзяць на сябе клопат па хаця б мінімальным забеспячэнні апарату Саюза пісьменнікаў узамен адабранай па палітычных матывах маёмасці, гэтага не робяць?!

Чаму, у асобе віцэ-прэм'ера М. Дземчука паабяцаўшы на з'ездзе пісьменнікаў (калі той адказваў на пытанні) вярнуць наш дом, зноў жа парушаюць і гэтае абяцанне?!

Мне ўдалося-такі пагаварыць з некаторымі дзяржаўнымі і парламенцкімі асобамі, якія нават па сваім статусе, здавалася, павінны б вырашыць праблему нефінансавання, праблему нявыплаты ажно за сем месяцаў (сем месяцаў!) *з а п л а н а в а н ы х* у бюджэце на 2001 год грошай.

— Як вы ставіцеся да гэтага беззаконня? — відаць, на іхні погляд вельмі наіўна пыталася я.

— Пытанне вырашаецца...

Яно "вырашаецца", а запазычанасць перад людзьмі расце! Яно "вырашаецца", але стаіць на месцы, нібыта прыклеенае да чагосьці... ці да Кагосьці!

Пераслед пісьменнікаў ніколі не застаецца не пакараным. Султана Махмуда Газневі, напрыклад, вось ужо амаль тысячу гадоў дакараюць тым, як ён ставіўся да вялікага Фірдаусі. Лонданскае таварыства псіхічных даследаванняў праз сто (!) гадоў усё ж папрасіла прабачэння за свае лжывыя вывады наконт А. Блавацкай, рускай пісьменніцы і заснавальніцы Тэасофскага таварыства. Даследчыкі дакопваюцца да таго, што пісаў Бэндэ і што ў сакрэтных паперах адказваў Панамарэнка пра таго ці іншага беларускага пісьменніка.

Імёны ўсіх тых, хто так ці іначай у сённяшнія часы дапамагаў Саюзу пісьменнікаў альбо "тапіў" яго, будуць, на маю думку, узгадвацца і праз многія, многія гады...

А пакуль мы "выжываем". Не тэлефануйце ў свой саюз — тэлефоны адключаныя, на паездкі ў вясковую школку (такіх лістоў-просьбаў ладна сабралася на маім стале) таксама няма сродкаў. Я праз газету прашу прабачэння за маўчанне — пытанне ж усё "вырашаецца"...

Адны ўнёскі сябраў Саюза пісьменнікаў не вырашаць шматлікія і вельмі цяжкія для ўсіх праблемы выжывання арганізацыі. Аўтар цікавейшых кніг па археалогіі Беларусі, вучоны і таленавіты публіцыст Алег Трусаў, які ўзначальвае Таварыства беларускай мовы, прызнаўся неяк, што 90% часу і сіл ідзе ў яго на тое, каб знайсці для арганізацыі грошы. Гэта для арганізацыі, якую краіна Беларусь, у адрозненне ад бэпэсэмаўцаў, павінна была б падтрымліваць і зрабіць адной з асноўных грамадскіх арганізацый!

Але ў гэтай структуры, пры ўсёй цяжкасці і складанасці яе жыцця, ёсць перад Саюзам пісьменнікаў адна перавага — у ТБМ могуць прыняць кожнага, хто пажадае клапаціцца аб беларускай мове і дапамагаць таварыству. Нават і генеральнага пракурора краіны Віктара Шэймана. Калі б ён таго захацеў.

Але Саюз пісьменнікаў, хаця і накіраваў нядаўна ліст Генеральнаму пракурору краіны аб беззаконні, не мог бы, нават прыняць сп. Шэймана ў свае шэрагі. Для гэтага патрэбныя публікацыі, кнігі прозы альбо вершаў. А значыць, наша нешматлікае ГА не можа набраць столькі сяброў, каб яны маглі ўтрымліваць на свае ўзносы бібліятэку з яе падпіскай і хаця б бухгалтара. Без бухгалтара проста не можа існаваць юрыдычна аформленая арганізацыя, якая, як і ўсе іншыя, павінна адсылаць па розных дзяржаўных установах сотні нейкіх даведак на даведкі, запаўняць паперы на падаткі, адлічэнні, запыты.

Вось толькі адзін прыклад бязглуздзіцы, якую наша гераічная Святлана Адамаўна, хаця і хадзіла па ўсіх адпаведных інстанцыях, усё ж не магла прадухіліць: узносы пісьменнікаў, якія яшчэ заставаліся на рахунку (на выпадак пахавання ці тэрміновай дапамогі) былі гвалтоўна знятыя як ... аплата падаткаў на заробак, які *н е в ы д а в а л і!* ПАСЕ можа смела хваліць Беларусь за добра наладжаную сістэму збору падаткаў— што-што, а экспрапрыіраваць у нас навучыліся!

Прывяду ўсё ж яшчэ прыклад — грошы з Міжнароднага пісьменніцкага літфонду мы можам атрымліваць цяпер толькі з дазволу Дэпартамента па гуманітарнай дапамозе, і яго чыноўнікі патрабуюць, каб было ўказана, каму і для чаго адпраўленыя з Масквы не дзяржаўныя, між іншым, грошы. Атрымліваецца — мы павінны ўказаць, на *ч ы ё будучае п а х а в а н н е* прызначаныя тыя невялікія сумы, якія зрэдзь падкідаюць нам калегі, у якіх засталося ўсё, што назбіраў за доўгія гады Літаратурны фонд усёй краіны. Нездарма ж там ідуць такія баталіі, што пры "разборках" ужо не абыходзяцца без АМОНа, што мы і назіраем на тэлевізійных экранах і ад чаго пакуль што ўхіліліся, спрабуючы захаваць адзіным, не дзяліць Саюз пісьменнікаў.

Але як жа шчыруюць у адваротным накірунку "добразычліўцы"!

Дабіліся свайго — у адносінах да пісьменнікаў у краіне пакуль што пануе Права Сілы, якое мала што мусіш прымаць як неабвержную рэальнасць, спрабуючы неяк уладкаваць наша пісьменніцкае гняздо на краі бездані. Якое ўядаецца ў душу, нават у дыханне. Так сіліконавы пыл забівае лёгкія, дзень за днём атручваючы іх не ўласцівымі для Жывога часцінкамі.

Але яму, гэтаму Праву Сілы яшчэ, аказваецца, трэба *п а к л а н і ц ц а*. Яму трэба радасна спяваць гімны і складаць панегірыкі. Зазіраць у вочы і вітаць песняй.

І тым прыняць *"п р ы ч а с ц е б у й в а л а."*

Гэтае прычасце спрабаваў прыняць А. Фадзееў. І хаця, як сведчаць дакументы, ён адпраўляў у лагер да аўтара "Хаджы Насрэддзіна", якому падпісаў прысуд у Сібір, харчовыя пасылкі, адчуванне згвалтаванай душы прывяло яго ў рэшце рэшт да ракавога стрэлу.

Як атруту, яго падносілі да вуснаў Янкі Купалы. І ён высільваў песні пра шчаслівы калгасны лад — і не вытрываў аднойчы, паспрабаваў сысці з жыцця. Бо ён быў салаўём, ён быў Песняй, якую глушыла клетка.

Відаць, беларускаму пісьменніку, як ён ні спрабуе ад гэтага ўхіліцца, трэба зноў і зноў вырашаць, кожнаму для сябе і ўсім разам, чым кіравацца ў жыцці, у творчасці, у грамадскай дзейнасці — прычасцем кветкі ці прычасцем буйвала.

Вольга ІПАТАВА,
старшыня Саюза
беларускіх пісьменнікаў

P.S. Дзякуй усім, хто прапанаваў так патрэбную сёння СБП дапамогу. Алесь Бабаед, напрыклад, увогуле гатовы аддаць у Мінск свае хаця і не новыя, але яшчэ прыдатныя для пісьменніцкіх паездак „Жыгулі". Іншыя хацелі б пералічыць на рахунак СБП пэўныя сродкі. Для гэтай мэты нагадваем небюджэтны разліковы рахунак : 362 200 000 0087. Філіял 511 АСБ Беларусбанка. Код 815. Саюз беларускіх пісьменнікаў.

●

Министерство финансов на ваше обращение в Комитет Государственного контроля Республики Беларусь по вопросу выплаты заработной платы за 2001 год сообщает.

Государством оказывается финансовая поддержка общественным объединениям в соответствии с Законом Республики Беларусь «Об общественных организациях» исходя из возможностей бюджета. Учитывая определенные трудности с исполнением доходной части бюджета, имело место нерегулярного финансирования указанных категорий организаций.

Первый заместитель министра
А. И. Сверж

Людзі

Іван

Канец 40-х гадоў мінулага стагоддзя. Позняя лістападаўская раніца. Добры марозік, першы сняжок. Малады хлопец з гармонікам пад пахай подбегам бяжыць пасля вечарынкі ў суседняй вёсцы дадому, у родную вёску. Шляху — чатыры кіламетры лесам. Трэба паспець нешта перакусіць ды на работу ў МТС, да якой яшчэ шэсць кіламетраў. За спазненне — пад суд.

"І раптам гляджу, — гэта ўжо ўспамінае той хлопец, — на снезе сляды босых ног. І з вёскі кіруюць проста на Проню. Усярэдзіне ў мяне нешта ёкнула: не з добрага гэта чалавек такой ранню на рэчку босы пакіраваў. Адным словам, узроілася мне, што гэты хтосьці ўздумаў самагубства, і я, забыўшыся на работу, кінуўся следам. Прыбягаю, задыхаўшыся, аж бачу — невысокі каржакаваты дзядок на рэчцы корпаецца.

Дзед, што ты тут робіш? — гукаю.

"Ды вось рыбкі захацелася, я вершы паставіў нанач, а цяпер правяраю".

"А босы чаму?"

"Лядок яшчэ тоненькі, мог праламацца, дык я ногі намачыў бы".

Відаць, здзіўленне на хлопцавым твары было такое, што не засталося незаўважаным для дзеда.

"Ты не бойся і не думай абы-чаго, прыходзь лепш увечары да мяне на юшку, — запрасіў ён. — Ведаеш, дзе я жыву?"

"Такі мяне інтарэс разабраў, — працягвае ўспамінаць гарманіст, — што ледзь дачакаўся заканчэння рабочага дня. Увечары толькі адчыніў дзверы ў сенцы дзедавай хаты, па адпаведным паху адчуў, што юшка такі зварана і ўдалася. Ледзь я пераступіў парог, дзед адразу пачаў наліваць у талеркі: дагэтуль вячэраць не пачынаў, сядзеў і чакаў мяне. Наліў па вялікай шклянцы самагонкі, выпілі, закусілі юшкай. Ён налівае яшчэ па шклянцы, на закусь ставіць вялізную місу мёду. Пакаштаваў я і мёду.

"А цяпер ідзі, — кажа, — і запомні, больш нічога і ніколі не бойся".

"Як нечакана наша знаёмства пачалося, гэтак раптоўна дзед яго і спыніў. Такога дзеда сустрэнеш не кожны дзень, і я, натуральна, пачаў распытваць людзей. Дзед даўно жыў адзін, жонка памерла. Але ў яго хаце ўсё было настолькі дагледжанае, што адсутнасці жаночага клопату не адчувалася. Акрамя хатняй гаспадаркі, трымаў яшчэ некалькі дзесяткаў вулляў.

З пчоламі звязана і адна даўнішняя гісторыя пра дзеда, якую мясцовыя людзі памятаюць і цяпер, пераказваюць адзін аднаму. Яшчэ да рэвалюцыі дзед меў некалькі соцень вулляў, быў моцным гаспадаром. Аднойчы ён павёз прадаваць мёд-у мястэчка. Назад вяртаўся позна ўвечары праз лес. А бандзюкі ў мястэчку ўгледзелі, што ў дзеда шмат грошай, і вырашылі абрабаваць яго. Ушасцярых яны і перастрэлі дзеда на вузкай лясной сцежцы. Ды сталася, што на сваю пагібель. Усіх шасцёх дзед прыбіў насмерць. Дзед маленькі, ростам, можа, крыху большы за паўтара метра. У вёсцы ніхто і ніколі не помніў, каб ён з кім і калі біўся. У тое, што ён прытоўк шасцярых мардаваротаў, цяжка было паверыць.

Дзеда судзілі. Суддзі дапытваліся, маўляў, раскажы, дзед, як ты іх біў?

"Я іх і не біў зусім. Я проста махнуў левай рукой — адны паваліліся, махнуў правай рукой — паваліліся астатнія", — тлумачыў на судзе ён.

Улічыўшы суадносіны сіл і тое, што не дзед напаў, а на яго, суд прызнаў перавышэнне неабходнай меры абароны, і дзед абышоўся штрафам. Але ў тым, што ён біў тых бандытаў, не прызнаў ні на судзе, ні потым, праз некалькі дзесяткаў год", — так завяршыў расказчык свой аповед.

Той малады гарманіст праз дзесяць год стаў маім бацькам.

Таксама праз дзесяць год той дзіўны і загадкавы дзед, які ўзімку хадзіў босы і забіваў шасцярых, нават не дакрануўшыся да іх рукой, зрабіўся маім прадзедам. Звалі яго Іван Станкевіч, або яшчэ — дзед Кучараўчык. Мянушку гэту яму далі за тое, што меў вельмі густыя, кучаравыя валасы. У маленстве мяне дарослыя таксама жартам іншы раз звалі дзедам Кучараўчыкам. Бо вельмі быў падобны на яго знешне і таксама нікога і ніколі першы не чапаў.

Пражыў дзед Кучараўчык больш за сто гадоў і памёр, калі мне было дзесяць. Першыя крокі я рабіў пры яго наглядзе.

Калі на Радаўніцу вяскоўцы збіраюцца на могілках, то заўсёды ўспамінаюць Кучараўчыка і гадаюць: а каму ён пакінуў сваю навуку?

Крысан

Дзеда Крысана, мамінага бацьку, я не памятаю. Ён пайшоў з жыцця, калі мне мінуў толькі год. Расказваюць, чалавек ён быў цвярозы і гаспадарлівы. Пры царскім часе яго прызначалі апекуном над гаспадарамі нядбайнымі, так званымі пустадомкамі. Без дазволу апекуна той, над кім прызначана апека, не меў права распараджацца ўласнай маёмасцю і грашыма.

Па натуры дзед быў услужлівы, любіў паспагадаць і дапамагчы людзям, прычым, як правіла, дапамагаў бескарысліва. Жанаты ён быў другі раз. У яго памерла жонка, а ў бабулі Хадоры загінуў муж. У Крысана застаўся сын, у бабулі — тры дачкі. Хацеў бы я пабачыць сёння мужыка, які ўзяў бы кабету з трыма дзецьмі, ды яшчэ ў такі галодны час, як калектывізацыя. Сумесна нарадзілі яшчэ траіх. Дакладней, трое засталіся жывыя. Першай выжыла мая мама. Перад гэтымі трыма пяцёра дзетак памерлі. Вось такая зыходная аснова для сумеснага жыцця. А калі папраўдзе разабрацца, дык не жыцця, а выжывання.

Дзед працаваў на знос у асноўным на рабоце цяжкай і малааплатнай. Калі працаваў у людзях і нейкая добрая душа вырашала пакарміць работніка, усё, што можна прынесці з таго абеду, прыносіў дамоў і дзяліў паміж дзецьмі.

Між тым характар у дзеда быў не проста ўспыльчывы, а, можна сказаць, узрыўны.

Бабуля расказвала:

"Ідзе дзед у хату, а ў двары квактуха з куранятамі на ганак залезла. Ён ніколі не абміне, пойдзе проста па куранятах, каторыя не паспелі адскочыць — падушыць.

Калі за абедам не паспееш прыняць посуд — увесь змяце далоў і ператопча. А пасля моўчкі ўстане, возьме пілу, сякеру — ды з двара. "Ты куды, Крысан?" — пытаю. "Як, куды? Лес піліць, трэба ж на посуд зарабіць".

На гулянках, няхай гэта вяселле, радзіны ці хрэсьбіны, ён звычайна рабіў так. Выпіваў шклянку гарэлкі, злёгку закусваў і ўставаў з-за стала: "Ну, Хадора, ты гуляй, а я пайшоў".

Пасля вайны, калі людзі вылезлі з зямлянак, у вёсцы яшчэ не было ні будынка сельсавета, ні калгаснай канторы, ні клуба. І сельсавет, і кантора былі ў дзедавай хаце. Увечары яна ператваралася ў клуб. Збіралася моладзь, ладзіла танцы. Ва ўсёй вёсцы знайшоўся толькі адзін гаспадар, які, меўшы сямёра дзяцей і не надта вялікую хату (яна стаіць і сёння і дае мне прытулак у часы наведвання радзімы) аб'яднаў пад сваім дахам усю гэту "грамадскасць". Не ведаю, як успрымала такую палітыку адкрытых дзвярэй бабуля на той час, але ўжо калі я быў падлеткам, то ніякіх крыўд на дзеда я ад яе не чуў. Відаць, яна была з тых жанчын, якія лічаць: што муж ні зробіць, то і добра. У дзеда ж была адна філасофская формула, якую ён вельмі часта паўтараў: "Ворага накармі, напаі і ў дарогу дай". Мусіць, гэтай формулай ён і кіраваўся, расчыняючы дзверы сваёй хаты.

Не так даўно я даведаўся, што дзед Крысан, аказваецца, пісаў вершы. Пра гэта мне паведаміў наш зямляк, прафесар Іван Кірылавіч Цішчанка, які, на жаль, таксама пайшоў з жыцця. На паперы вершаваныя вопыты дзеда Крысана не захаваліся. Але калі я пачаў цікавіцца, то сачыняў ён, здаецца, сатырычныя творы. Многія з іх вяскоўцы зналі на памяць.

Яшчэ дзед Крысан, як і мой прадзед Іван, быў выдатны пчаляр. Пчаліных сямей трымаў не многа, але мёду меў заўсёды шмат. Сёння, калі я і сам сярод пчол свой чалавек, дзіўлюся, як дзед з такім няўстойлівым, узрыўным характарам мог паразумецца з пчоламі, якія патрабуюць цярплівасці і засяроджанасці.

Зрэшты, пра ўменне дзеда Крысана паразумецца — наступны штрых. Аднойчы ўвечары, калі моладзь сабралася ў дзедаву хату на танцы, гаворка зайшла пра Тараданчыкавага сабаку. Тараданчык — гэта дзедаў сусед. Двары стаяць плот у плот. Сабака яго Шарык быў знакаміты сваёй бязмежнай лютасцю і неразборлівасцю. Для яго ўкусіць чалавека — што нагу задраць. Сабаку гэтага помню і я. Іншы раз ідзеш па вёсцы, а хто-небудзь паведамляе: "Сабака Тараданаў адарваўся!" Гэта азначала, што трэба вяртацца назад, бо Шарык не ашчаджаў ні малых, ні старых. Ноччу ён знаходзіўся на службе: вартаваў магазін. Калі Шарыка навязвалі на доўгі сталёвы трос каля магазіна, побач людзі стараліся не хадзіць. Вось пра гэтага легендарнага сабаку і зайшла гаворка.

"Ат, які гэта сабака, — азваўся раптам дзед Крысан. — Ягня, ды і толькі".

І заспрачаліся, што дзед зараз жа пойдзе і прынясе гэтае "страшыдла" на руках у хату. Праз некалькі хвілін дзед і сапраўды ўнёс на руках у хату Шарыка. Той стуліўся і паскавытваў, нібы шчанюк. А дзед гэтак жа як прынёс, так і аднёс сабаку назад на дзяжурства.

Аднак умельства сваё дзед дэманстраваў вельмі рэдка, мусіць, толькі тады, калі вымагалі абставіны. І нічога незвычайнага ў гэтым не бачыў.

Але была адна рэч, якую і ён лічыў незвычайнай і аніяк не мог даць веры, што такое магчыма. Незадоўга да ягонай смерці ўрад прыняў нейкую пастанову, згодна якой састарэлым сялянам павінны былі выплачваць якуюсь пенсію. Бацька мой збіраў дзеля гэтага неабходныя паперы, а дзед усё не верыў: як гэта так, ты нічога не робіш, а табе грошы дадуць? І ўвесь час думаў, што бацька над ім жартуе.

Да пенсіі дзед Крысан не дажыў усяго некалькі дзён, ды так і не зведаў, як жа яна выглядае, незаробленая капейка.

Павел

Пражыў жыццё, а не ведаў, што жыву пад чужым прозвішчам. Здавалася б, ну што тое прозвішча, вунь некаторыя жанчыны іх па дзесяць раз мяняюць, — і як у салон прыгажосці схадзіць. А тут нешта настолькі ўзрушыла, што не мог супакоіцца, пакуль не дабіўся такой-сякой праўды. І зноў мушу вяртацца далёка назад, у дарэвалюцыйныя часы, калі завязваўся тугі вузел майго радаводу, заварвалася ў гістарычным катле д'ябальскае ежыва з мільёнаў чалавечых лёсаў; і нябачна дна ў гэтым катле, і сёрбаць нам яшчэ і сёрбаць.

Дзед мой, Павел Васільевіч Вераб'еў, па нараджэнні Вераб'ёвым не быў. З малых гадоў застаўся круглым сіратой, і з літасці яго забраў у сваю сям'ю нейкі Вераб'ёў. Вось пра яго, гэтага Вераб'ёва, і неабходна сказаць некалькі слоў. Тое, што зрабіў ён, наўрад ці мае аналагі.

Прынамсі, учынак таго Вераб'ёва быў рэзка супрацьлеглым той завядзёнцы, калі ўласная крывінка і самая разумная, і сама прыгожая, і самая добрая. Калі дзеці павырасталі і наспеў час выдзяляцца ім у асобных гаспадароў, Вераб'ёў узяў і адпісаў усю маёмасць не ўласным дзецям, а сіраце, разам з маёмасцю перадаў і сваё прозвішча. Так, лічыў ён, патрабавала справядлівасць. Ці можа хто з вас прыпомніць выпадак, калі людзі кіраваліся не ступенню радства, а аб'ектыўнымі крытэрыямі ацэнкі асобы?

Невядома, і цяпер наўрад ці ўжо даведаешся, як склаліся адносіны майго дзеда з роднымі дзецьмі Вераб'ёва. Самаму ж дзеду пагаспадарыць у ахвоту не давялося. Лёсам было наканавана каб ён датыкнуўся да ўсіх самых вялікіх пажараў сваёй эпохі.

Імперыялістычная вайна. Вярнуўся, абжыўся.

Рэвалюцыя, грамадзянская вайна. Вярнуўся — абжыўся.

Першая калектывізацыя. Адным з першых у вёсцы адвёў на агульны двор жывёлу, завёз вупраж, інвентар, малацілку. Актывісты ўсё прафукалі.

Калі пачалася другая калектывізацыя, дзед ісці ў калгас адмовіўся наадрэз. Хаця ісці ўжо не было з чым. Сям'я самым сур'ёзным чынам галадала калі актывісты прыйшлі ў двор апісваць маёмасць і раскулачваць. А сам кулак тым часам паміраў з голаду.

"Бацька ўжо апух і не ўставаў з ложка. І ў гэты час нам з Баку прыйшла пасылка ячных круп. Нашы ездзілі на нафтараспрацоўкі ў заробкі, і вось нейкі родзіч прыслаў. Мама наварыла заціркі і стала з лыжкі карміць бацьку. А ён ужо не хацеў браць ежу, няхай дзецям, кажа, можа, яны хоць выжывуць. Заціркі ў рот улівалі сілай, і ён выжыў", — так расказваў мне мой бацька.

Дзед выжыў, бо трэба было яшчэ схадзіць на фінскую вайну, выжыць там, вярнуцца дамоў, каб неўзабаве пайсці яшчэ на адну вайну. Але жыццё яго, мусіць, стала ўжо не патрэбным дзяржаве. Ён загінуў пад Варонежам у 1942 годзе. Калі б ён застаўся жывы і вярнуўся і з гэтай вайны, мой бацька вырас бы зусім іншым чалавекам. Ён расказваў бы мне іншыя гісторыі, спяваў іншыя песні, і меў бы зусім іншы занятак, чым той, якім мусіў займацца. А гэта значыць, што зусім іншым чалавекам вырас бы і я.

Але ўсё сталася гэтак, як сталася. Мне не прыйшлося глядзець на жыццё народа з вакна камфартабельнага аўтамабіля. Спадчыну маю складаюць неардынарныя, супярэчлівыя, пакутныя лёсы маіх продкаў. І мне несці іх крыж.

Павел ВЕРАБ'ЁЎ

"Правінцыялка"

Менавіта такую, па праўдзе кажучы, нечаканую назву дала сваёй кнізе паэзіі, выпушчанай "Беллітфондам", Зоя Калкоўская. Відаць, тым самым хацела падкрэсліць, што яе муза прапісана ў глыбінцы.А, магчыма, жадаючы нагадаць, што да напісанага трэба паставіцца, прымаючы пад увагу ўсё гэта. Што да апошняга, дык паэзія ці ёсць, ці яе няма, незалежна ад таго, дзе напісаліся творы. А вось жыве З. Калкоўская і сапраўды, калі прытрымлівацца яе вызначэння, у правінцыі. Нарадзілася ў 1957 годзе ў вёсы Шашкі Стаўбцоўскага раёна, скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, а цяпер працуе выкладчыцай Уздзенскага прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча № 210. З'яўляецца аўтарам зборніка вершаў "Ручаінкай весняй", аповесцяў "Жыві, Лёнька", "Вар'яцтва" і "Прарочы шлях". Чытаць іх не давялося, таму цяжка меркаваць аб мастацкіх вартасцях, а пра кнігу "Правінцыялка" трэба сказаць, што яна атрымалася няроўнай. У рэшце рэшт — рэч звычайная. Рэдка якому аўтару ўдаецца вытрымаць аднолькавы мастацкі ўзровень: нешта ўдаецца лепш, штосьці — горш. Але па лепшых творах можна меркаваць, што задаткі таленту ў З. Калкоўскай ёсць. Яе лірычная гераіня паўстае чалавекам са сваім унутраным светам, а жыццё яе — як і трэба было чакаць, звычайнае чалавечае жыццё, у якім ёсць свае ўздымы, радасці, але і знаходзіцца месца расчараванням, горычы. Асабліва, калі параўнаць тое, пра што марылася, з самой рэальнасцю:

Маленькая правінцыялка
Марыла быць русалкай.
Піла з чысцюткай крыніцы
Мрояў святую вадзіцу.
Толькі разбіліся мары
Аб лёсу зласлівага хмары.
Жыве на свеце жанчына
Адна, як у лузе каліна.

Аднак гэтая непрыкаянасць лірычнай гераіні яшчэ і ад таго, што не толькі ў асабістым жыцці "трэшчыны". Сама рэчаіснасць такая, што выклікае нярэдка песімістычны настрой, але ў лепшых вершах З. Калкоўскай не толькі гэта. Відавочна і жаданне адчуць жыццё ва ўсёй яго складанасці і напоўненасці, зразумеўшы не толькі сутнасць сённяшняга, а спасцігнуўшы яго ў паяднанасці часоў і падзей:

Нясцерпна хочацца парою
у глыбіню вякоў зірнуць.
Крануць уласнаю рукою
святыні, продкаў зноў пачуць.
Хто вы? Якімі вы былі?
Аб чым вы марылі,
аб чым тужылі?

Пазіцыя лірычнай гераіні З. Калкоўскай — дзейсная, пагрмадзянску актыўная:

Калі не я, то хто
ачысціць сховы грэшныя душы
ад кар'ерызму,
сквапнасці,
гардыні...
Хто пашкадуе сціплыя святыні
магутнай, богам
дадзенай, імшы?

Але яна, гэтая лірычная гераіня, не адчувае сябе адлучанай ад іншых. Яна — з усёй грамадой:

Калі не я,
то
хто?
Калі не ты,
то
хто?
Калі не мы,
то
хто?

Удаюцца З. Калкоўскай і лірычныя вершы. Асабліва тыя, што падказаны асабіста перажытым.

Алег ГУЛІЦКІ

КРЫТЫКА

Урокі гісторыі Алеся Петрашкевіча

Праблема, якую актуалізаваў Алесь Петрашкевіч у сваёй новай п'есе "Воля на крыжы", у беларускай гуманітарыстыцы з'яўляецца адной з самых балючых: падпарадкаванне (ці мацней, у залежнасці ад пазіцыі "новых а мудрых гісторыкаў" — згодніцтва, калабарацыя) класікаў беларускай літаратуры палітычным патрабаванням Савецкай улады. Падкрэслім, размова вядзецца пра **класікаў** — тых літаратараў, хто меў вялікі жыццёвы, светапоглядны досвед, трывалыя нацыянальна-дэмакратычныя перакананні і немалыя заслугі ў справе беларускага нацыянальнага адраджэння (Я. Купала, Я. Колас, З. Бядуля). Балючасць праблемы ў тым, што гэтыя мастакі, законныя прэтэндэнты на ролю духоўных лідэраў нацыі, выразна ўсведамляючы зусім не гуманістычную, мякка кажучы, сутнасць бальшавіцкай улады, па тых ці іншых прычынах усё ж пайшлі на згоду з ёю, дазволілі ёй выкарыстоўваць сваё імя, свой аўтарытэт. Савецкай палітычнай ангажаванасцю згаданыя вышэй класікі беларускай літаратуры фактычна апраўдалі ўсе людажэрскія дзеянні бальшавіцкай улады 30-х і наступных гадоў, ухвалілі генацыд беларускай нацыі. Вось табе і маеш "духоўнае лідэрства"...

Мы свядома завастраем, радыкалізуем свой пункт гледжання, каб больш выразна выявіць глыбінную сутнасць праблемы. Бо цэнтральнае ядро яе, пры ўсіх магчымых гістарычна абгрунтаваных агаворках, быццам нейкая злавесная пухліна працягвае смылець: як бы пераканаўча даследчыкі ні даказвалі факт унутранага непрыняцця нашымі класікамі дзейнасці Савецкай улады, што называецца, з песні слоў не выкінеш. Сваю даніну ўладзе беларускія песняры сплацілі спаўна. Варта разгарнуць адпаведныя тамы ў зборах твораў (творчасць другой паловы 20—30-х гг.), каб пераканацца ў гэтым.

Атрымліваецца, зламаліся, здаліся нашыя "гусляры"?.. Што тычыць Я. Купалы, то апошнія па часе ўзнікнення даследаванні, грунтоўна падмацаваныя архіўнымі і мемуарна-фактычнымі матэрыяламі (Колас Г. Лёс Купалы — міфы і рэальнасць — "Полымя", 1994, № 10; Тычка Г. Я. Купала і Савецкая ўлада — "Полымя", 1999, № 1 і інш.), доказна сведчаць: паэт не скарыўся, хаця і вымушаны быў "падтакваць гучным рэвалюцыйным рытмам, прыладжваючы сціло да гучлівай "пралетарскай" моды" (Каўка А. Драма асобы — драма ідэі — "Полымя", 1994, № 9). І ўсё ж чым больш чытаеш работы даследчыкаў-інтэрпрэтатараў, нават самыя доказныя і аргументаваныя, чым даўжэй вандруеш па галерэях лагічна выбудаваных, абгрунтаваных меркаванняў, тым неадступней жаданне даведацца-ўявіць, як жа было насамрэч, з усімі псіхалагічна-дэтальнымі падрабязнасцямі. Вось такое адчуванне, магчыма, і з'явілася зародкам мастацкай задумы п'есы Алеся Петрашкевіча "Воля на крыжы".

Найперш адзначым трывалую дакументальную аснову п'есы. Аўтар улічыў, здаецца, усе вядомыя на цяперашні час мемуарныя і дакументальныя звесткі як канкрэтна-біяграфічнага, так і агульнагістарычнага характару. Часам драматург ужыўляе дакументальныя цытаты ў мову персанажаў амаль без ніякай адаптацыі, што месцамі надае твору дэкламацыйна-публіцыстычную афарбоўку. У цеснай сувязі з адзначанай асаблівасцю п'есы, яе дакументальнасцю, знаходзіцца і яшчэ адна праблема: жанравая. Яна мае непараўнальна большы абсяг, чым уласна літаратурны. Аўтар вызначыў жанр п'есы як трагедыю, што, на наш погляд, не адпавядае ні наяўнай мастацкай рэальнасці твора, ні самому "жыццёваму жанру" біяграфіі Я. Купалы 30—40-х гг.

Класічная тэорыя драмы патрабуе ад трагедыйнага героя адчайнадушнага змагання з фатальна непераадольнымі абставінамі. Думаецца, няма падстаў ставіць пад сумненне ці рэвізаваць гэты канон. Але ж ні Я. Купала як гістарычная асоба, ні Я. Купала-мастацкі характар у творы А. Петрашкевіча ролі трагедыйнага героя не адпавядаюць. У першым выпадку размову можна весці хіба толькі пра трагічнасць чалавечага і пісьменніцкага лёсу Я. Купалы, у другім — пра драматычныя (у вузкім азначэнні) калізіі п'есы. Пры ўсёй павазе і пачуцці пієтэту перад маштабам асабістай і мастацкай значнасці постаці Я. Купалы ў беларускай гісторыі XX ст., мы не маем ніякіх звестак, якія б засведчылі сапраўды трагедыйны (то бок — дзейсны, змагарны) характар яго грамадскай пазіцыі. Мы можам толькі меркаваць ды здагадвацца, што на славутых бяседах 20-х гг. у гасцінным Купалавым доме, магчыма, размовы вяліся больш канкрэтныя, чым "кухоннае абгаворванне" заган бальшавіцкага кіравання Беларуссю. Дарэчы, у эміграцкім друку можна знайсці цьмяныя згадкі пра існаванне ў Савецкай Беларусі антыбальшавіцкай падпольнай арганізацыі, быццам бы кіраванай прафесарам У. М. Ігнатоўскім (гл. "З гісторыяй на "Вы". Вып. 3. Мн., 1994, с. 123—125) і пра тое, што Я. Купала падчас сваіх замежных паездак спрычыніўся да падтрымання кантактаў паміж гэтай Менскай арганізацыяй і асяродкам беларускіх незалежнікаў у Празе. Аднак звесткі гэтыя дужа няпэўныя, каб ім можна было безаглядна давяраць, хаця ў выпадку нават частковай іх праўдзівасці дзейнасць нацыянальнай інтэлігенцыі ў 20-х гг. выглядала б зусім у іншым святле, чым уяўленні, што існавалі дасюль пра зачараваных салодкім спевам савецкіх ідэалагічных Сірэн беларускіх нацыянальных дзеячаў. Ды і чыннасць Я. Купалы 20-х гг. у такім выпадку пачынае ўспрымацца зусім па-іншаму, бо набывае шукаемую ўсімі даследчыкамі лагічнасць, паслядоўнасць, мэтаскіраваную дзейнасць.

Зразумела, што ў навукова-публіцыстычных распрацоўках такія дапушчэнні непрымальныя, бо заснаваныя на мінімуме інфармацыі, версіфікаваць якую немагчыма. У мастацкім жа творы пафантазіраваць на гэтую тэму было б можна, але А. Петрашкевіч у дадзеным выпадку выступаў у двуадзінай іпастасі — як гісторык, і як мастак. Драматург не захацеў вольна абыходзіцца з вядомымі гістарычнымі фактамі, непарушна захаваўшы дакументальна вядомую канву падзей, а гэта няўхільна адбілася на сутнасці цэнтральнага мастацкага характару: вобраз Я. Купалы атрымаў у п'есе трактоўку пасіўнай ахвяры.

Атмасфера асуджанасці, чакання найгоршага пануе ў карціне III, у якой Я. Колас прыходзіць да Купалы з чарнавіком вядомага пакаяннага ліста. У карцінах IV, V (допыты ў ДПУ) паэт зноў выглядае ахвярай д'ябальскай гульні, пераважна апраўдваецца, адбіваецца ад навязваемай яму ролі кіраўніка СВБ. Ініцыятывай цалкам валодаюць ДПУшнікі, з'яўляецца адчуванне, што Я. Купала трапіў у пастку, і ўсе яго словы-дзеянні нагадваюць сутаргавыя безвыніковыя рухі істоты ў такім становішчы. Зрэшты, паэт сам пра гэта гаворыць у наступнай VI карціне: "...абклалі чырвонымі сцяжкамі, як ваўка, і гоняць цяпер у катух ды на ланцуг". Спроба самагубства Я. Купалы — па-чалавечы зразумелая і мужная спроба разарваць вязьмо фатальных абставін, у якія трапіў паэт. Але зноў жа — гэта ўчынак не трагедыйнага героя. Тым больш, што самагубства не адбылося, і ў карціне IX падчас цяжкой размовы з У. М. Ігнатоўскім Я. Купала раптоўна з ходу падпісвае падсунутую чэкістам вя-

Петрашкевіч Алесь. Воля на крыжы. Трагедыя "Полымя", 2000, № 2.; Петрашкевіч Алесь. Воля на крыжы: Гістарычныя п'есы. Мн., 2000.

КНІГАРНЯ

Капыльскі том гісторыка-дакументальнай хронікі

Працягваецца выданне шматтомнай серыі гісторыка-дакументальных хронік гарадоў і раёнаў Беларусі. Пабачыла свет чарговая "раённая энцыклапедыя" — "Памяць. Капыльскі раён". Укладальнік — вядомы пісьменнік, літаратурны крытык і краязнаўца Алесь Марціновіч.

Новы том хронікі, выпушчаны выдавецтвам "Беларуская навука", сведчыць аб грунтоўнасці працы, якая папярэднічала збіранню, стварэнню капыльскай "Памяці". Так, пабудова выдання носіць традыцыйны характар, вядомы па папярэдніх гісторыка-дакументальных хроніках. Тыя ж раздзелы: "Ад часоў першабытных — 1917", "1917—1941", "1941—1945", "Ахвяры вайны" (спісы загінуўшых землякоў), 1945 — да нашых дзён". Але ж галоўнае — насычэнне, змест. Адразу ж варта заўважыць, што ўкладальнік (А. Марціновіч — і аўтар амаль дваццаці артыкулаў "Памяці"), увесь аўтарскі калектыў праявілі сябе руплівымі, дасведчанымі знаўцамі капыльскай тэмы. А. Марціновіч у свой час выдаў выключна капыльскую краязнаўчую кнігу "Ля Каменкі бруістай". У "Памяці" — працяг, удакладненне капыльскіх краязнаўчых прыхільнасцяў пісьменніка, лёс якога здаўна паяднаны з Капыльскім краем. І хаця нарадзіўся А. Марціновіч у Казловічах Слуцкага раёна, школу — Навасёлкаўскую сярэднюю — скончыў на Капыльшчыне. У свой час і працаваў у капыльскай раённай газеце "Слава працы".

Капыльская "Памяць" уражвае ўвагай да лёсаў ураджэнцаў раёна. Гісторыю ж робяць людзі, чалавекі-адзінкі. Не забываліся пра філарэта, даследчыка побыту і культуры казакоў Адольфа Янушкевіча, яўрэйскага літаратуразнаўца Абрама Паперню, польскую пісьменніцу Зоф'ю Тшашчкоўскую, класіка яўрэйскай літаратуры Мендэля Мойхера-Сфорыма, вучонага-аграрніка Міхаіла Ачапоўскага, крытыка і публіцыста Льва Клейнбарта, рэвалюцыянера Казіміра Петрусевіча, пісьменніка Лявона Лобіка... У капыльскай "Памяці" — шмат зваротаў да ўжо раней друкаваных крыніц. Прыкладам, нарыс пра малавядомага шырокаму колу чытачоў пісьменніка Лявона Лобіка — старонкі з кнігі Генадзя Каханоўскага "Адчыніся, таямніца часу". Падаючы біяграфіі асобных літаратараў, збіральнікаў "Памяці" дапаўняюць энцыклапедычныя звесткі ўрыўкамі з нарысаў, мастацкіх аўтабіяграфій пісьменнікаў, публіцыстаў. Услед за артыкулам пра Кузьму Чорнага — "Я пішу аб людзях і для людзей" (з аўтабіяграфій Кузьмы Чорнага). За біяграфіяй журналіста і публіцыста Марыі Карпенкі (амаль трыццаць — ! — гадоў узнавальвала калектыў рэдакцыі часопіса "Работніца і сялянка") — старонкі яе эсэ "У Капылі на гары". Чытаем: "Цяжка пісаць пра тое, што ў сэрцы. Не выказаць словамі безліч пачуццяў, успамінаў, роздуму пра тую кропку зямлі, якая звычайна завецца малой радзімай. Хто сказаў — малая? Для мяне яна — найвялікшая..." Чытаем — і, пэўна ж, хваляванне ў душы

домую інвектыву заходнебеларускім "нацыянал-фашыстам", патлумачыўшы да жаху здзіўленаму першаму прэзідэнту БАН свае дзеянні: "... за мяжой жывуць не дурныя людзі. У крайнім выпадку не дурнейшыя за тых, што пісалі гэта "опровержение". І яму будзе столькі ж веры, колькі і таму, што нечая сучка мазь паела і сама сабе мазёнку на галаву надзела". Гэтая калізія зусім не трагедыйная. Увогуле, улічыўшы як мастацкія рэаліі п'есы, так і дакументальна-біяграфічную аснову сутнасці цэнтральнага мастацкага характару, найбольш прымальным падаецца нейтральнае жанравае вызначэнне "гістарычная драма".

Канфлікт у творы разгортваецца своеасабліва: калі бальшавіцкая групоўка ажыццяўляе свае валявыя імкненні мэтанакіравана і напорыста, то супрацьлеглы бок, згуртаванне беларускіх інтэлігентаў, паказана як аб'ект дзеяння ўлады. Што, зрэшты, і адпавядае гістарычнай сапраўднасці. Бо ж не з узброенымі тэрарыстамі змагаліся савецкія чэкісты, а з людзямі выключна цывільнымі і, як усе сапраўдныя інтэлігенты, у пэўнай ступені адасобленымі паміж сабой. Аднак не такія яны і пасіўныя ды бяздзейныя. Галоўны сэнс іх ахвярнага і пераможнага ў канчатковым выніку (бо Савецкая ўлада знікла, а беларуская незалежніцкая ідэя жыве) супрацьстаяння знішчальнай у літаральным сэнсе дзейнасці бальшавікоў драматург выяўляе ў карціне IX, калі спакутаваны пасля спробы забіць сябе Я. Купала пярэчыць безнадзейна-роспачным разважанням У. М. Ігнатоўскага: "...аснова, якую стварылі лепшыя з нашага народа і да Саветаў і пры Саветах, ацалее, як бы ні шалелі вар'яты ад ультраінтэрнацыяналізму. Менавіта на гэтай аснове і паднімецца некалі светлая будыніна нашай навукі, культуры, гаспадаркі... і незалежнасці". Гэтае прарочае сцверджанне і выяўляе глыбінную ідэю п'есы, якая заканамерным чынам пераклікаецца з пафасам знакавага, нават сваёй назвай, для беларускай літаратуры твора А. Петрашкевіча "Напісанае — застаецца".

Увогуле, драма А. Петрашевіча "Воля на крыжы" — вельмі сучасны твор, як прыналежны да лепшых узораў гістарычнага жанру. У сучаснай беларускай літаратуры, здаецца, дагэтуль не было такой плённай спробы выяўлення глыбіннай сутнасці гістарычнай эпохі, якая, на вялікі жаль, для беларусаў не завяршылася разам з адыходам Савецкай улады. Размова вядзецца пра сюжэтную лінію "Сталін — Гей — Рапапорт — Бэндэ — Панамарэнка". Уражвае ступень навуковай і мастацкай ужыўленасці пісьменніка ў гістарычны матэрыял. Пра мэты і задачы сваёй рэпрэсіўна-русіфікатарскай дзейнасці згаданыя вышэй персанажы разважаюць з той ступенню адкрытасці і дакладнасці фармулёвак, якая падаецца найбольш гістарычна імавернай і адначасова максімальна гарманічнай у сэнсе драматургічнай умоўнасці. Па ступені канцэптуальнай выверанасці і маштабу асэнсавання сутнасці палітычнай чыннасці Савецкай улады на Беларусі твор А. Петрашкевіча можна назваць катэхізісам (не ў сэнсе прымітыўнасці, але — асноватворнасці) разумення як бальшавіцкай, так і сучаснай расійскай імперска-шавіністычнай палітыкі. Адначасова драматург пераканаўча індывідуалізуе мастацкія характары бальшавікоў, удала малюе псіхалагічныя партрэты кожнага персанажа згодна яго ролі ў спраўджаным спектаклі яе вялікасці Гісторыі. Пэўныя заўвагі выклікаюць хіба толькі некаторыя моманты ў трактоўцы вобраза Сталіна. Наўрад ці "правадыр народаў" называў бы Беларусь Паўночна-Заходнім краем нават сярод сваіх блізкіх паплечнікаў — гэта не ў правілах бальшавіцкай палітычнай фразеалогіі. Ды і панібрацка-фамільярныя ноткі, якія часам праслізгваюць у размове кіраўніка бальшавіцкай дзяржавы з Панамарэнкам у карціне X ("С чем приехал, что скажешь, Пантюша?"; "Пантюша, не задавай бестактных вопросов товарищу Сталину... пока он тебя уважает") не зусім адпавядаюць нашым уяўленням пра сталінскі тып кіраўніцтва.

Бясспрэчная навацыя і адначасова несумненная ўдача драматурга — мастацкі характар Лукаша Бэндэ. Наколькі вядома, гэтую інфернальную для нашай літаратуры фігуру настолькі маштабна ўвасобіць у мастацкім вобразе не адважваўся ніхто з беларускіх пісьменнікаў. Сутнасць характару Бэндэ, на наш погляд, пісьменнікам схоплена дакладна: гэткая сумесь фанатызму, цытатнага дагматызму, прагі ўлады, неўтаймоўнай цягі да фіскальства і прымерванне на сябе ролі "шэрага кардынала" ў вызначэнні лёсу беларускай літаратуры і яе стваральнікаў. Сапраўды, "сексот-уникум! Доносчик-феномен!", як выказаўся ў п'есе начальнік ДПУ Рапапорт. Дыялог першага сакратара ЦК КП /б/Б Гея і Л. Бэндэ ў карціне II — гэта выключная па дакладнасці, сцісласці і паўнаце характарыстыка сутнасці белапаўска-бэндаўскага разгрому беларускай літаратуры.

П'еса "Воля на крыжы" — шматпланавы твор. У ім рэтраспектыўна з той ці іншай ступенню мастацкага аналітызму асэнсаваны трагічны вопыт беларускага нацыянальна-вызваленчага руху на працягу ўсяго XX ст., бо 30-я гг. сталі пераломным гістарычным этапам беларускага адраджэння, калі палітычны курс дзяржаў-метраполій (санацыя на "крэсах усходніх", барацьба з "нацдэмамі" бальшавіцкай Масквы) канчаткова вызначыўся, і становішча айчыннага незалежніцкага руху набыло канстантную для наступных дзесяцігоддзяў, у тым ліку і сучаснага перыяду, сацыяльна-палітычную пэўнасць. Так, гісторыя — настаўніца жыцця, і А. Петрашкевіч — адначасова і як гісторык, і як мастак — чарговы раз мэтанакіравана стварае ў беларускай драматургіі таленавітыя ўрокі гісторыі, навуковая глыбіня і мастацкая значнасць якіх не выклікае сумненняў.

Змітро МАМАЧКІН

кожнага з нас. Тым болей: у кожнага з капылян — асаблівае хваляванне. А колькі іх, капылян, раскідана за межамі раёна, у Мінску, у Беларусі, па ўсяму былому СССР, а мо і далей. Сённяшні старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь знакаміты вучоны ў галіне фізікі Аляксандр Вайтовіч, акадэмік-машынабудаўнік Міхаіл Высоцкі, географ, палярнік Ісак Даўгін, галоўны кардыёлаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь акадэмік Мікалай Манак, археолаг Вольга Ляўко, доктар філалагічных навук, празаік Алесь Бельскі і шмат хто яшчэ — усё капыляне!

Гісторыка-дакументальная хроніка досыць шчыльна "населена" архіўнымі дакументамі. Пастановы павятовага міравога з'езда, Мінскай палаты крымінальнага суда, справаздачы Мінскага губернатара, рапарт павятовага спраўніка, іншыя дакументы, выцягнутыя з цянётаў гістарычна-архіўнай памяці, — выключны памагаты для вывучэння гісторыі Капыльшчыны і Беларусі ўвогуле ў школах Капыля, Капыльскага раёна.

Безумоўна, нешта засталося "за кадрам". У кнізе "Памяць. Капыльскі раён" шмат месца занялі спісы землякоў, якія загінулі ў войнах, трапілі пад каток сталінскіх рэпрэсій, воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія злажылі галовы ў Афганістане. Няма ніякіх сумненняў, што ў капыльскай "Памяці" будзе працяг. За гады збірання гісторыка-дакументальнай хронікі сфарміраваўся выразны капыльскі краязнаўчы актыў. Пра іх, рупліўцаў захавання памяці, — і асобная частачка "капыльскай энцыклапедыі": "Летапісцы роднага краю". Сярод герояў, грамадскую прафесію якіх вызначылі такім чынам, — навуковы супрацоўнік Капыльскага краязнаўчага музея Фёдар Абрамчык (аўтар тапанімічнага слоўніка "І гэта ўсё мой край"), краязнаўца Барыс Багдановіч (стварыў у свой час школьны музей, які пасля стаў асновай раённага краязнаўчага музея), журналіст Усевалад Гурыновіч (на жаль, памёр у 1997 годзе. Паспеў шмат што зрабіць для збірання матэрыялаў у хроніку.), журналіст Іван Ігнатчык (у выхадных дадзеных хронікі, што датычыць ілюстрацыйнага матэрыялу, адзначана: "Фота І. Р. Ігнатчыка..."), пісьменнік Алесь Марціновіч, журналісты Іван Пракарына (памёр зусім нядаўна), Віктар Семянкевіч, краязнаўцы Павел Сямёнаў, Валянціна Шуракова, намеснік старшыні Капыльскага райвыканкама Марыя Шэіна.

Нельга не адзначыць і такі факт. "Памяць. Капыльскі раён" выдадзена накладам 5100 асобнікаў. Для параўнання: у нядаўна выдадзенага першага тома мінскай (гарадской, сталічнай) "Памяці" наклад роўны 5000 экземпляраў. Што ні кажы, Капыль і тут наперадзе ўсіх!

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

КНІГАРНЯ

Крыгагром — гэта...

Вы не ведаеце, што такое крыгагром? У такім разе паспяшайцеся набыць новую кнігу Казіміра Камейшы з аднайменнай назвай, выпушчаную выдавецтвам "Юнацтва". Ёсць у ёй і верш, які таксама называецца — "Крыгагром". Пра што ? Ды, бадай, лепей з ім пазнаёміцца цалкам, бо ў пераказе ён згубіць многае, а галоўнае — знікне пачуццё навізны, з якой паэт прамаўляе пра з'яву, блізкую і знаёмую многім з тых, хто жыў у вёсцы ці жыве сёння там. Здавалася б, усё звычайнае, але як хораша пра гэта сказана?! Адчуванне такое, што і сам прысутнічаеш пры першым вясновым абуджэнні прыроды, калі да сапраўднай вясны яшчэ далёка, але яна ўжо гучна заяўляе пра сябе, нагадвае: іду я, а таму рыхтуйцеся мяне сустракаць:

Скуль той гром неспадзяваны,
Што трасе, як трасца, дом.
На рацэ прачнуўся рана
Крыгагром,
Крыгагром.

Глянь:
Бушуе,
ломіць,
крышыць.
Гэту плынь не ўгаманіць.
Грозна крыга йдзе на крыгу.
І грыміць,
І грыміць...

Хто той сілы вымагае,
Цяжка дыхае грудзьмі?
З пенаю шуга шугае.
І шуміць,
І шуміць....

Праз гучшэўе,
па ўзбалоццю
Красавік бяжыць з багром.
Чуеш: далечы калоціць
Крыгагром,
Крыгагром!

Аж па крону заліває
Прыбярэжную сасну.
З гулам водгулле сплывае
У вясну,
У вясну...

Верш дынамічны, вобразна насычаны. Чаго варта толькі гэтае: "красавік бяжыць з багром"?! А хіба не яркі, запамінальны малюнак, што ўвасабляе ў сабе вясновую хаду: "З гулам водгулле сплывае..."?! Запамінальна і гэтае: "Грозна крыга йдзе на крыгу..."

Ды і ўся кніжка, адрасаваная дзецям дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту, атрымалася надзіва цікавай і змястоўнай. К. Камейша даўно ўступіў у пару творчай сталасці. Ды і жыццёвага вопыту стае, а без яго ў дзіцячай літаратуры таксама цяжка. Можна мець немалыя задаткі таленту, але слаба разбірацца ў псіхалогіі тых, каму адрасуеш свае творы, а тады пры ўсіх самых лепшых намерах яны наўрад ці выклічуць належны рэзананс у дзіцячых сэрцах. А каб дзеці цябе зразумелі, трэба размаўляць з імі як з роўнымі. І закранаць самыя розныя тэмы. А падобнымі памкненнямі і кіруецца К. Камейша, таму ў яго аднолькава хораша гучаць як творы з традыцыйнымі сюжэтамі, так і такія, у якіх паэт, магчыма, піша і крыху на падрост. Як у вершы "Лазня": Сёння лазня ў дуброве.

Ладзіць лазню
дождж вясновы.
Мые травы
і сцяжыны,
Мые
лісце на галінах.
Хвошча венічкам
краплістым,
Прамяністым і іскрыстым.
Па імху пратупаў
волкім,
Грабянец узняў
вясёлкі.
Роўна кроны прычасаў.
А пасля
схаваўся сам.

Хутчэй за ўсё пры знаёмстве з гэтым творам спатрэбяцца некаторыя ўдакладненні з боку дарослых. Усё ж верш вельмі вобразна насычаны, пры тым асобныя параўнанні, як на першы погляд, крыху цяжкаватыя для дзіцячага ўспрымання. Але гэта і добра. Хлопчыкі і дзяўчынкі, пазнаёміўшыся з "Лазняй", пераканаюцца, наколькі багатым можа быць паэтычнае слова, як шмат ім можна сказаць і выказаць.

З шэрагу падобных твораў і верш "Хітры дождж", у якім К. Камейша таксама жывапісуе словам. І гэтаксама, як і ў "Лазні", атрымаўся запамінальны малюнак:

Ноччу
спорны дождж ішоў
І пайшоў кудысьці,
Але як амаладзіў,
Ажно ззяе, лісце!
. . . . . .
Як галінку я крануў,
Быў і сам не рады.
Ён зваліўся на мяне
Цэлым вадаспадам.

Я не ўбачыў,
не пазнаў,
Так схаваўся ў кроне.
Ён, як крона, шумны сам
І такі ж зялёны.

У вершы ж "Поўня" ёсць і элементы пазнавальнасці, пра што лёгка ўпэўніцца, прачытаўшы твор ад пачатку да канца: "Каціўся ўночы // Кружочак бляшаны // // Праз сонны алешнік // У вёску Альшаны. // Каціўся, // Свяціўся, // З дарогай // Лучыўся. // Не колам, // Не кругам — // Кружочкам лічыўся. // Каціўся над лесам, // Каціўся над полем. // А зваўся кружочак, — // Каб ведалі! — // Поўняй".

Хочацца згадаць і верш "Воўчы білет", у якім, дарэчы, як у некаторых іншых творах, прысутнічаюць гумарыстычныя ноткі, а падобных твораў у беларускай дзіцячай літаратуры якраз і не стае. Мала якія пісьменнікі дазваляюць сабе падобнае "паслабленне". Відаць, мяркуюць, што з хлопчыкамі і дзяўчынкамі трэба размаўляць толькі сур'ёзна. Але ж і пра сур'ёзнае, пры адпаведным таленце, лёгка гаварыць з усмешкай. У чым зноў жа пераконвае К. Камейша. Вельмі шкада зайца, якому "выдалі... воўчы білет": "Хто ж яго ў гвардыю // Возьме служыць?!" Але ж не толькі з-за гэтага:

Выдалі зайцу воўчы білет,
Лепей бы выдалі воўчы абед.

"Крыгагром" — гэта і казкі "Куды заехаў вусень", "Кот Нелавімыш", "Кравец Каняўскі", "Бабёр-сапёр", "Лясная школа танцаў", "Казка зімовай гары". Творы не на фальклорнай аснове напісаныя, а цалкам аўтарскія, што лішні раз пацвярджае, наколькі багатая творчая фантазія ў паэта, як умее ён ствараць адмысловыя сюжэты. Адной гісторыі з катом Нелавімыш дастаткова, каб упэўніцца, што казкі К. Камейшы — варты працяг літаратурных казак, ля вытокаў якіх стаялі многія знакамітыя пісьменнікі свету. Прыгоды, што адбываюцца з Нелавімышам, надзіва займальныя. І шмат у чым павучальныя.

Заслугоўваюць ухвалы і скорагаворкі, загадкі. Апошнія — пазнавальныя, а першыя — магчымасць патрэніравацца ў адчуванні слова, дакладней перадачы яго. А часам зрабіць гэта не так і проста:

Чорны кот,
як камінар,
Лапай кратае
ліхтар.
Зверху каркае варона:
— Кр-р-ратаць лапай
р-р-рызыкоўна!

Кнігу "Крыгагром" трэба залічыць у набытак не толькі самога аўтара, а і выдавецтва "Юнацтва", якое яшчэ раз засведчыла, што здатнае выпускаць кнігі, так патрэбныя юнаму чытачу.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

"Запретные сны"

Валерый Скрыпкін, першы зборнік якога "Запретные сны" пабачыў свет дзякуючы "Беларускаму кнігазбору", як пераконваюць лепшыя творы, здатны ствараць па-свойму адметныя паэтычныя малюнкі, у якіх успрыманне рэчаіснасці вобразна насычанае з ярка выражанай метафарычнасцю. Як у гэтым вершы:

Колдунья-ночь варила зелье,
и в сладкой дреме полусна,
ей пели звезды з опохмелья,
в свой диско-клуб звала луна.

С котла лениво кольца пара
на землю грешную текли...
И жители земного шара
сей пар — туманом нарекли.

Его чарующая дымка
в просвете голубого дня
в душу мою, как ты со снимка,
глядит, не достигая дна.

А душа лірычнага героя прагне імкнецца як бы ўвабраць усё наваколле, зліцца з ім у адно цэлае, адчуўшы ў гэтай повязі заспакаенне і пастаянства. А за ўсім — паўсядзённае жыццё. І чалавечы лёс таксама: "Листает судьба бесстрастно // души отрывной календарь". Дзень за днём, за годам год. А год, як вдяома, складаецца з асобных пораў. Чуйным паэтычным позіркам В. Скрыпкін бачыць адметнасць іх:

Осень... Ветер воет —
он изрядно пьян...
Здесь —- калина стонет:
всю огонь объял;

там — горит рябина,
рядом — дуб в огне...
В стороне — осина
в багряной чалме.

Золотом березы
устилают шлях...
Шустрые стрекозы
прячутся в ветвях.

Аднак "Запретные сны" — гэта і тая душэўная неўладкаванасць чалавека ў свеце, якая тым больш відавочная, калі чалавек гэты шмат у чым непадобны на іншых, а таму адчувальней рэагуе на ўсё, што адбываецца вакол яго, а ў сваім стаўленні да іншых у многім празмерна патрабавальны. І, наадварот, не ўпісваючыся ў грамаду, у нечым можа дазваляць сабе паслабленні. Але яны таксама праяўленне індывідуальнасці, няхай і ў іншай якасці. А ўвогуле, лірычны герой В. Скрыпкіна нярэдка адчувае сябе адзнокім, і матывы адзіноцтва таксама арганічна ўваходзяць у мастацкую канву вершаў, часам нараджаючы нечаканыя асацыяцыі:

За любовь я плачу разлукой.
За счастье — скупой слезою.
Одиночество щенной сукой
заигрывает со мною.

В овальной беспечности круга
в себе я себя теряю.
С мечтой о надежности друга
в огне соблазнов сгораю...

Адсюль недалёка і да звычайнай беззыходнасці, калі здаецца, што аніякага выйсця няма. А калі яно і прадбачыцца, дык нічога добрага не абяцае:

Сетуй на жизнь не сетуй —
она сулит только водку...
Давно синей птицы нету —
ей перерезали глотку.

Можна па-рознаму ставіцца да падобных высноў. Яшчэ гадоў з дзесяць назад В. Скрыпкіна лёгка было б абвінаваціць у песімізме, адсутнасці сацыяльнага аптымізму. Але ці не лепей сказаць, што ён — паэт па-свойму адметны і тым цікавы?

Алег ГУЛІЦКІ

ПАЭЗІЯ

Ніна МАЦЯШ

Бацечку родненькі...

Бацечку родненькі, не галашу.
На роспач не маю дазволу, не маю
Ад часу, як стаў Ты сумотай па маме
Сушыць сваё сэрца, убольваць душу.

Не маю на роспач дазволу Твайго.
Ты гэтага свету даўно ўжо цураўся.
Яшчэ пра зямныя навіны пытаўся,
Але ўжо далёкі быў ад усяго.

Ад часу, як сталася мама журбой,
Як ейны партрэт для Цябе стаў іконай —
Да свечкі ў руках, да жальбы падваконня
Імкнуўся Ты ў вырай, каб бачыца з Ёй.

Сушыў сваё сэрца, убольваў душу,
Хоць догляду, ласкі было Табе ўдосталь...
Усцешнае неба над цесным пагостам...
Бацечку родненькі, не галашу.

Гэтулькі знакаў давалася нам
Пра адыход Твой і свята спаткання,
Столькі наўпроставых звеставанняў!..

І чорная птушка да ўнучкі ўлятала,
І мне
безгалосая сойка
дзівосна спявала,
І ў сне
прыгажэнная, вясёлая мама
цябе забірала,
І святло невымоўнае
постаці вашыя авівала,
І ўжо аніштo не балела Табе,
не даймала...
Адно дзеля гэтага,
нават каб і магла я ўтрымаць Цябе тут,
не трымала б...

Адлятай, мой беленькі голубе...
Не галашу.
Даўкі жаль свой
на ціхія слёзы крышу...

11 верасня 2001 года

Госпадзе, ёсць жа Ты недзе,
калі Ты стварыў
свет гэты гожы, дзівосны
наш свет негадзяшчы!..
Чорнае зло раззяляпіла жудную пашчу...
а ці Ты Сам так пагрозліва загаварыў?..

Я не блюзнеру. Павінен жа недзе
Ты быць,
бачыць, як людцы дарункі
Твае зневажаюць,
чуць, як Твае запаветы
трагічна скажаюць,
як тоесамяць "любіць"
з вычварэнным "забіць!"...

Багаты Манхэтан — не сон,
як і гэты — не сон:
імгненне — і выбухна рушацца
ўніз хмарачосы,
і тысячы жыццяў стаюцца
адным страшным Лёсам,
і свет ужо іншы: свет бачыць
Твой Армагедон...

Як адцяпер — па праяве такой —
жыцьме люд,
і той, хто ў жалобе, і той,
хто ад радасці скача?..

А голас Жыцця над прадоннем
і кліча, і плача:
"...Шон, гэта я... я люблю цябе,
Шон... я люблю..."

●

Дзеля чаго Ты, Божа,
З неба звёў мяне ў бездарожжа?
Каб за прывідам тузалася,
і плакала, і спявала,
Слёзы словам сваім
сама сабе выцірала?

Ужо ж у які бок жыцця ні гляну —
І воддаль, і побліз —
смутку й смутку паляны.

Толькі ў нетры душы —
І хадзіць непатрэбна —
тваім спагаданнем
Вогніцца мая папараць-кветка,
маё шчасце —
трыванне.

Песня змяі

Да спектакля "Маленькі прынц"

Як сцяжыны ні мецяцца —
Іх пяском занясе.
Як зяліны ні квецяцца —
Перавянуць усе.

Колькі б сцюжы ні рынула —
Кветкі зноўку цвітуць.
Колькі б сцежак ні гінула —
Людзі некуды йдуць.

Як разгадкі ні множацца,
А загадкам — ні дна.
Як ні маецца-можацца,
А развязка адна...



Шукаем супакою
У вечнае красы...
І жорсткаю рукою
Збіваем каласы.

Высушваем крыніцы,
Забруджваем бары...
Ці будзе жыта сніцца
Нашчадку праз гады?

Ці знойдзе ён дарогу
Да зор у новы час?
Ці вымаліць у Бога
Ён літасці для нас?

●

За аднастайнасцю жыцця
Таемны важкі сэнс:
Хоць наракаем на свой лёс мярзотны,
Пакутаў кругаверць,
Суцешна дбаем пра гаючы востраў
Нястомнае душы,
Які мацней за смерць.

●

Родныя мае, калі памру,
Сэрцы болем ростані не рвіце,
Яблыньку ў галовах пасадзіце,
Каб суцішыць роспач і тугу.

Каб у светлы радаўніцы час
Да жывых працягвала галінкі,
Каб пялёсткаў Божыя іскрынкі
Чысцінёю бласлаўлялі вас.

Яблынька пяшчотай ахіне,
Загамоніць роднай нашай мовай...
Ўспомніце Паўлінкаю мяне
У святочнай хустцы шаліновай.

Галіна ДАШКЕВІЧ

●

Паміраў паляшук у закутку
вясковае хаты,
Трызніў, клікаў надрыўна усіх
сваякоў і стагнаў.
Сумны месяц агледзеў сялянскі
ўвесь скарб небагаты,
Нібы ў чым вінаваты, свой
позірк паспешна схаваў.

Тры дачкі галасілі над бацькам
памёрлым няўцешна,
Тры свячы дагаралі ў халоднай
вячэрняй імгле,
Месяц доўга глядзеў, як душа
адлятала у вечнасць,
І зайздросціў: які неабсяжны
прастор для яе.

●

Цяжкое зерне падае на ўзмежку,
Як зорны дождж на залатых вятрах,
Рамонкамі абсыпаная сцежка —
Майго юнацтва ясны Млечны Шлях.

Пах васількоў — нябёсаў пах чароўны,
Ніколі не адыдзе у нябыт.
Начное сонца зноў шчыруе — поўня,
Каб адагрэць засмяглых душ граніт.

Каб асвяціць надзеяю бясконцай
Зняверaных, зачатых на крыві...
І ноччу неба асвятляе сонца,
Даверлівае сэрца дабрыні.

●

Б'ецца сэрца Палесся у нетрах
таемных тваіх,
Я дачка твая, Прыпяць,
Гасподзь мне паслаў светлы міг
Лёгкай хвалі вуаллю засланяцца
ад сцюжаў і зла.
Я душой адчуваю — з табою
заўсёды была.
Я тваёй адчуваю ўзнёслае мары крыло,
У чаканні світання мы разам
трымаем цяпло
Найяснейшага сонца, усходу
загадкавы гмах,
Ты на хвалях халодных, а я —
на гарачых руках.
Б'ецца сэрца Палесся у хвалях
тваіх трапяткіх,
Я дачка твая, Прыпяць, вярнуся
к табе хоць на міг,
Ці з вышынь паднябесся,
ці з нетраў бяздонных зямных
Прылячу, прыплыву да тваіх
берагоў залатых.

●

Прысніўся мне бераг
з разбуджаным ветрам трысцём
І вяз з неўгамонным, руплівым
птушыным гняздом,
І маміна вішня з квітнеючай
голькай снягоў,
І прызба ля хаты — буслянка бабуль і
дзядоў.
І серп на гарышчы, што мама
для нас прыпасла,
І папараць-кветка, што з сэрца
праз жвір прарасла.

●

Ціха, пяшчотна наўкола,
А на душы неспакой.
Нехта заплакаў уголас,
Можа, па долі маёй.

Можа, анёл мой руплівы,
Што засланяў ад нягод,
Ператаміў свае крылы
Ад несканчоных згрызот.

Дух пахіснуўся ягоны,
Сэрца скавана ільдом
Непамыслот незлічоных
Пад непакорным чалом.

Божа, вярні мне анёла!
Грэшна бяскрылымі жыць!..
Долі скрыпучае кола
Па каляіне бяжыць.

Жытнёвая дарога

Жытнёвая дарога
Вядзе удалячынь
Ад роднага парога
Да зоркавых вышынь.

У светлым адцвітанні
Залочаных палёў
Шукаем апраўданне
Для ўсіх сваіх грахоў.

ПРОЗА

ХОЛАДНА

АПАВЯДАННЕ

Маргарыта ПРОХАР

"...Адкуль бярэцца гэтае прыкрае пачуццё віны, адчуванне таго, што ты вінаваты перад іншымі, перад самім сабой?

І чаму, калі сыходзіш ад людзей, з якімі нейкі час быў разам, нехта з іх абавязкова скажа ці падумае: здраднік. Нібы пакладзе кляймо: сёння ты быў сябра ім, а заўтра ты — здраднік.

Але так не бывае, калі яны любілі цябе; так бывае, калі не любілі...

Зрэшты, у кожнага свае апраўданні..."

Але чаму пра гэта падумалася менавіта сёння? Хаця ў памяці свае сцежкі, свой нябачны час...

За акном шумяць каштаны. Белыя суквецці іх, падобныя да свечак-пірамід, адгарэлі яшчэ ў маі, і зараз, нібы зялёныя пальчаткі, лісце хавае маленькія ў калючай і такой жа зялёнай, як яны самі, шкарлупіне круглыя і дробныя, быццам няспелыя яблыкі, каштаны. Увосень, калі сухім залатым дажджом асыпаецца лета, каштаны выспеюць і пачнуць ападаць, нечакана зрываццa з галін, з трэскам разрываючы кволае рыжае шкарлупінне, і, ляскочучы па асфальце, доўга каціцца па ім — бліскучыя, карычневыя, нібы круглыя шакаладныя цукеркі.

Гавораць, што такія восеньскія каштаны, калі іх пакладзеш у кішэню, прыносяць добры настрой і адчуванне шчасця. Вера не асабліва прыслухвалася да гэтага, але чамусьці рукі самі цягнуліся да каштанаў. Яна клала іх у сумку — адзін-два — і так яны і ляжалі там, чакаючы другой восені, высыхалі, чэзлі, браліся сухімі баразёнкамі-зморшчынкамі. Але найбольш за ўсё Вера любіла, калі дрэвы-каштаны толькі-толькі пачынаюць зацвітаць на пачатку мая, і з'яўляюцца тады якраз тыя белыя "свечачкі", як яна іх называла.

У такія дні яна заўсёды рана прыходзіла на працу. Ішла пустым гулкім калідорам, падымалася па лесвіцы, слухаючы адзінокае рэха крокаў. Прайшоўшы ў свой кабінет, адразу ж імкнулася да акна, адкрывала старыя рамы і доўга стаяла, гледзячы ў бела-зялёнае мора суквецця ў лісця, дыхаючы свежым водарам белых кветак, і пах гэты здаваўся ёй такім жа белым, чыстым, святочным, і на душы рабілася лёгка і пасапраўднаму, па-вясновому, радасна і шчасліва. І непрыкметна — у такім жа прыўзнятым добрым настроі — праходзілі дні.

Пралятала вясна, і жыццё нібы запавольвала крокі, цішэла, нарастала гарачыня. У рэшце рэшт з'яўлялася лета з асляпляльным сонцам, задухай і доўгачаканымі вечарамі — лёгкімі, напоўненымі цёплым мядовым водарам кветак, які адчуваеш нават у горадзе. Вось і зараз паволі надыходзіць адзін з такіх вечароў. Вера прайшлася па кабінеце, крыху затрымалася ля акна. З вуліцы дыхнула прахалодай, а ў небе — шараватым, нібы засланым туманам — больш не было відаць ніводнага з тых пухкіх бялесых аблокаў, якія несупынна плылі ў ясным гарачым блакіце днём і раз-пораз закрывалі сонца.

Слухаючы, як паволі ўсе навокал цішэе з надыходам вечара, нібы акунаючыся ў жаданую прахалоду, Вера толькі цяпер пачула, як жа яна стамілася. Ад усяго: ад працы, ад бясконцых мітрэнгаў і навалы дробных клопатаў кожнага дня. А больш за ўсё насцярожвалі раптоўныя, нечаканыя хвалі адчаю, неспакою, тугі, якія захлыналі сэрца. Часта гэта здаралася падчас самай што ні ёсць бяскрыўднай гутаркі. Нейкае слова, пагляд, рух... Ды і яна сама, зрэшты, не ведала — што... Яно налятала, як подых халоднага, сцюдзёнага ветру, і Вера ўздрыгвала; пасля каб ніхто не заўважыў, непрыкметна нахіляла галаву, прыкрываючы рукою вочы, слухаючы, як унутры ўсё то ледзянее, то раптам усхопліваецца нервовым, надрыўным, падобным да ўнутранага плачу, узрушэннем...

Праўда, ніколі ніхто гэтага не заўважаў. Усе лічылі яе надзвычай вясёлай, прыемнай, абаяльнай. І нават старэйшыя жанчыны ставіліся да яе, іх маладой начальніцы, даволі прыязна.

І толькі адзін чалавек заўважыў тое, што не бачыў ніхто — выпадковы наведвальнік, які прыйшоў падпісаць нейкую паперу. Яна пачала чытаць, і раптам яе ахапіла гэтая ледзяная нервовая хваля, і Вера ніжэй нахілілася да стала, хаваючы бледны, напружаны твар.

– Вам дрэнна?

Яна ўздрыгнула ад гэтага пытання і разгубілася. Каб неяк усё ж патлумачыць сітуацыю, сказала:

– Мне проста холадна.

– Давайце я зачыню акно.

– Добра.

Пакуль зачынялася старая скрыпучая рама, Вера здолела перамагчы здранцвенне. Але толькі пасля, успомніўшы свае словы, здзівілася: ёй у тую хвіліну і сапраўды было вельмі, надзвычай холадна — унутры...

Наляцеў вецер, і зноў зашумелі каштаны, нібы закалыхалася цёмна-зялёнае мора.

Вера хвіліну моўчкі пастаяла ля акна, а потым пачала збірацца. Усе ўжо даўно пайшлі: было а сёмай гадзіне. Вера часта гэтак затрымлівалася пазней за ўсёх: не любіла пакідаць няскончаныя справы на заўтра.

Праўда, сёння затрымалася па іншай прычыне: проста хацелася пайсці адной, пабыць у цішыні.

Дамоў вырашыла ісці пешшу: было недалёка. Яна выбрала шлях праз парк. Дрэвы закрывалі вечаровае, аднак яшчэ даволі гарачае сонца, таму было прыемна ісці ў гэтай створанай імі лёгкай паўзмрочнай прахалодзе. Знікала стомленасць, на душы станавілася спакойна, добра.

Вера перайшла на вузкую сцежку, якая выводзіла да тралейбуснага прыпынку на вуліцы. Раптам пачула крокі. Хтосьці спяшаўся, магчыма, даганяў яе. Вера не вытрывала і азірнулася.

Побач з ёю спыніўся высокі хударлявы мужчына гадоў трыццаці пяці. Светлыя, коратка пастрыжаныя валасы і незвычайныя — шляхецкія — бародка і вусы, прычым яны яму вельмі пасавалі. Твар інтэлігентны, добры. І ўсмешка прыязная.

– Добры вечар! — першым павітаўся ён.

– Добры вечар, — адказала Вера і таксама ўсміхнулася — іранічна.

Незнаёмец нечакана патлумачыў:

– Вы прабачце, я, відаць, памыліўся. Вы вельмі падобны да адной маёй знаёмай.

Вера прамаўчала.

– Я падумаў, што гэта яна, і таму кінуўся даганяць...

Ён стаяў і моўчкі глядзеў на яе.

– І чаго вы чакаеце? — насмешліва запытала Вера.

– Яшчэ раз прашу прабачэння... — і ён памкнуўся пайсці.

Вера зрабіла крок, аднак неспадзявана зачапілася за корань дрэва — гладкі, выбіты не адной парай ног, — і ўпала б, каб не яе выпадковы сустрэчны: ён паспеў яе падхапіць.

Вера войкнула ад болю ў назе, нават слёзы паказаліся ў вачах.

– Баліць? — спачувальна запытаў мужчына, падтрымліваючы яе пад руку.

Вера маўчала, слухаючы боль, які паволі цішэў, адыходзіў некуды ўглыб. Яна ступіла раз-другі і з палёгкай уздыхнула: абышлося, вывіху няма.

– Я вас праўду, — прапанаваў мужчына, — раптам што...

Вера толькі паціснула плячыма: ёй было ўсё роўна.

Давялося пазнаёміцца: ён назваўся Віктарам, сказаў, што працуе інжынерам у фірме, назвы якой Вера не запомніла. Ды яна асабліва й не слухала яго. Ёй нечакана падумалася: як дзіўна перакрыжоўваюцца лёсы, паўтараюцца сустрэчы. Мінулае не хоча заставацца ў мінулым...

..У такі ж цёплы летні надвячорак — ужо так даўно-даўно, нібыта было ў іншым, не ў тваім, а ў зусім чужым жыцці, — яна, Вера, нядаўна скончыўшы інстытут, крочыла палявою, у жыце, сцежкай да вёскі, у якую прыехала настаўнічаць. "Студэнтачка", — ласкава называлі яе, — танклявую, худзенькую дзяўчынку, якая сама знешне не адрознівалася ад тых дзесяцікласніц, у якіх была настаўніцай. Але гэта — пасля...

А напачатку была сцежка ў жоўта-залатым жыце, звонкі бярэзнік ля незнаёмай, амаль схаванай у зяленіве садоў вёсцы. Вера заблукала тады ў тым ціхім бярозавым гайку і прысела перадыхнуць на паваленую, дзе-нідзе струхлелую і ацярэбленую мурашамі і караедамі бярозу. І толькі тут яна заўважыла непадалёк чалавечую постаць. Вера не ведала, ці радавацца, ці не з такой нагоды.

Чалавек павярнуўся. Гэта быў высокі хударлявы хлапец прыкладна яе ўзросту. Твар сур'ёзны, няўсмешлівы, і цёмныя валасы, здавалася, яшчэ больш падкрэслівалі гэта. Вочы задумліва аглядалі наваколле. Над галавою шумеў гай, і хлопец, здавалася, чуйна прыслухоўваўся да гэтага пошуму, нібыта слухаў толькі яму вядомы голас.

Вера, назіраючы за ім, абаперлася на сухую галінку. Галінка з трэскам зламалася. Хлопец азірнуўся і ўбачыў Веру на паваленым дрэве, якая схапілася, каб не зваліцца, за голле алешніку, што рос побач.

Яны павіталіся, і Вера папрасіла падказаць ёй, як прайсці ў вёску. Аказваецца, ён таксама ішоў туды.

– Ігар Гаўрылюк, настаўнік, — назваў сябе.

Вера ў адказ заўважыла, што, мабыць, іх шэрагі з сённяшняга дня папоўняцца: яна таксама, відаць, будзе працаваць у іх школе ў Бярэзніках.

Ён толькі кіўнуў галавой, але нічога не сказаў. Вера таксама не наважылася пачынаць якую-небудзь гаворку, таму далей ішлі моўчкі.

Хутка яны выйшлі на дарогу, якая вяла праз гай. Пясчаную, прыкатаную, дзе-нідзе ў выбоінах. З поля дыхнула пераспелым жытам, распараным ад сонца. Па ствалах бяроз абапал дарогі беглі сонечныя палоскі святла, збягалі ўніз, хаваліся ў травах.

– Ну як, падабаецца тут? — раптам запытаў Ігар, аглядаючы шырокі абсяг палёў — залатых і бясконцых, з адзінокімі купкамі дрэў між іх.

– Хораша... — згадзілася Вера, дыхаючы цёплым, прывольным ветрам поля.

Яны выйшлі да вёскі. Але спачатку ўбачылі сад — вялікі яблыневы сад з водарам белага наліву ў жніўні: сумна-салодкага, як адыходзячае лета, — мядовы, сонечны водар наліўных, жоўта-белых яблыкаў. Яблыневы сад заўсёды чамусьці нагадваў Веры дзяцінства. На лета яна ездзіла ў вёску, калі яны яшчэ не прадалі там дом. І ў вёсцы быў сад: высокія-высокія грушы і яблыні — ад белага наліву да позніх антонавак, якія Вера каштавала ўжо не ў садзе, а з вялізных скрынак, якія прывозіў ім дзед.

А белы наліў — жнівеньскі белы наліў — яна любіла сама збіраць уранні — крамяныя, халаднаватыя і мокрыя ад расы яблыкі.

Альбо — увечары, калі заходзіць за дрэвы сонца, і яблыкі становяцца залатымі, ружовымі, казачнымі. А потым прыходзіць ноч, і ў яе цішыні, напоенай водарам саду, добра моўчкі сядзець і слухаць, як падаюць, зрываючыся з галін, яблыкі...

Убачыўшы яе міжвольнае захапленне садам, Ігар спытаў:

– Прыгожа?

– Так, — шчыра прызналася Вера і ў сваю чаргу запытала: — А вы даўно тут?

– Нядаўна, з год. — Ён замаўчаў, аб нечым задумаўся, аплятаючы вакол пальца зялёную сцябліну. Пасля дадаў: — Цяпер мне здаецца, што трэба любіць не толькі тыя мясціны, дзе ты нарадзіўся, але і тыя, куды цябе скіраваў лёс: там, дзе ты сёння. Гэта вельмі важна: усюды сваё хараство, свая радасць. І ты проста вучышся любіць, і сэрца тваё ад гэтага робіцца чыстым і спакойным.

– Вы, аднак, філосаф, — Вера ўсміхнулася.

– Гісторык. Па адукацыі. Хаця мы ўсе ў пэўны час свайго жыцця становімся філосафамі.

Вёска была як вёска: хаты з агародамі, прысадамі, а далей — палі, пашы.

Выйшлі да будынка школы — двухпавярховага, сучаснай планіроўкі. Вера нават здзівілася: думала ўбачыць звычайную хату.

Прайшлі ў настаўніцкую. Вера, пазнаёмілася з такімі ж маладымі, нядаўнімі выпускнікамі інстытута, настаўнікамі. Высокі чарнявы хлопец з птушыным носам назваўся Сяргеем, а светленькая дзяўчына са смешнай кароценькай грыўкай над вачыма — Кацяй. За сталом чытаў газету трэці — юнак у акулярах, Сямён, сарамлівы, ціхі, з мяккім, цёплым характарам.

Чаму гэтыя першыя хвіліны знаёмства, тое першае ўражанне так урэзалася ў памяць?..

У жыцці кожнага чалавека ёсць знаёмыя, а ёсць сябры, з якімі табе добра не толькі гаварыць — проста маўчаць, якія цябе разумеюць і якіх разумееш ты, якія давяраюць табе і якім ты давяраеш. І за тыя паўгода працы яны, маладыя, сталі такімі добрымі, шчырымі сябрамі. Дык чаму, чаму ўсё так здарылася? А можа, гэта яе выдумкі, нічога не адбылося, ніхто ні ў чым яе не абвінавачвае, а прычына ўсяму — лёс, які рана ці позна раскідвае людзей, як вецер лісце? І гэта ўсе разумеюць, і толькі яна не можа з тым змірыцца. Але чаму засталася гэтая прыкрасць, чаму хочацца зноў вярнуцца туды і нешта патлумачыць, апраўдацца? Але...

– Вы мяне не слухаеце?

Вера страпянулася. Яны, аказваецца, падышлі да тралейбуснага прыпынку. А яна не заўважыла і нічога не чула. І так заўсёды, калі пачынала ўзгадваць тыя далёкія гады і той час...

Яна ўздыхнула і сказала:

– Так... Успомніўся выпадак...

Ён прамаўчаў.

– Мне — далей, праз вуліцу, — патлумачыла яна. — Тут блізка, так што не турбуйцеся...

– Не, я праваду.

Вера толькі паціснула вачыма: няхай.

Яны спыніліся ля святлафора. І Вера хутчэй не ўбачыла — адчула яго позірк. Так калісьці глядзеў Ігар — закаханымі, цёплымі вачыма. Аднойчы, калі яму таксама здавалася, што яна гэтага не бачыць, не ведае...

Ігар... Яна і да гэтага часу не можа сябе зразумець. Ды і ці было каханне? І ніхто з іх пра яго не гаварыў, і прызнанняў не было. А вось яна не можа забыць... І разумее: гэта смешна, ніхто пра такое не помніць, трэба стаць, як усе, яна ж сучасны чалавек. Але штосьці не адпускае — там, глыбока ў душы... Стаць, як усе... А можа, гэта толькі здаецца, што ўсе — шчаслівыя і нікога не трывожыць памяць?..

А ім было так добра разам... Ніколі ні з кім Веры не было гэтак добра. Ігар часта пасля сваіх урокаў заходзіў да яе ў кабінет. Яны доўга гаварылі — пра ўсё: пачынаючы ад надвор'я і заканчваючы абмеркаваннем Голдынга ці Брэдберы. І ніхто з іх так і не сказаў галоўнага. Ды і не магла яна тады і падумаць, што ніхто не здолее заняць ягонае месца ў яе сэрцы: шчыры, у многім наіўны, безабаронна адкрыты. Яна была больш практычнай, больш абачлівай. Але ці выратавала яе гэта? Чаму зноў і зноў яна вяртаецца думкамі туды, у тое далёкае, сваё, нібы пакінуўшы там, у мінулым, штосьці такое, без чаго яе сёння — як рака без вады, як птушка без крылаў, як халоднае сонца? Так, халоднае сонца. Ці халоднае сэрца. Для чалавека гэта тое самае.

Вера адарвалася ад успамінаў, калі падышлі да яе дома — старой сямёпавярховай будыніны. Развіталіся ля пад'езда.

– Бывайце, — проста сказала Вера.

– Бывайце... — у ягоным голасе яна адчула сум.

Аднак не азірнулася. Хутка зайшла ў пад'езд і зачыніла дзверы. А ноччу не магла заснуць: наноў успамінала тое, даўняе. За акном забарабаніў дождж. Вера паднялася, каб зачыніць фортку. Некалькі кропель упала ёй на руку — начныя, халаднаватыя, нібы зусім не летнія.

Раптам успыхнула, нібы одум: зрэшты, чаго яна перажывае? У яе ж усё ёсць. Усё тое, пра што яна марыла калісь як пра штосьці нязбытнае. Дык чаму так пуста, адзінока, чаму ёй холадна гэтак?.. У яе ўсё ёсць.

Вера прытулілася лбом да начнога шкла, і ёй упершыню за столькі год захацелася — як у дзяцінстве — заплакаць...

Прайшло тры дні пасля той дзіўнай сустрэчы ў парку. Вера і забылася пра яе за клопатамі, справамі. Напомніў тэлефонны званок. Званіў Віктар, запрашаў вечарам у кафэ.

– Як вы даведаліся нумар тэлефона? — строга запытала Вера.

– Гэта няважна. Дык вы прыйдзеце?

Вера ўсміхнулася сама сабе. Што ж, гэта ці не займальна. І яна згадзілася.

Віктар чакаў яе ля ўваходу: нібы памаладзелы ў белай кашулі, акуратна падстрыжаны вусы і шляхетная бародка. Праўда, усмешка, якою ён сустрэў яе, была нейкая вінаватая, асцярожная.

(Працяг на стар. 12)

ЧАСАПІС

"Палюбоўнік"

15 студзеня на сцэне Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі адбыўся адзіны паказ монаспектакля літоўскай актрысы і рэжысёра Біруты Марцінкявічутэ "Палюбоўнік". Гэтая пастаноўка Літоўскага нацыянальнага тэатра драмы распачала ў Мінску культурную акцыю, ініцыятарамі якой сталі Пасольства Літоўскай Рэспублікі ў Беларусі і Літоўскі цэнтр культуры, адукацыі і інфармацыі. Акцыя разлічана на адзін год, яе мэта — азнаямленне беларускай грамадскасці з культурнымі набыткамі суседняй дзяржавы.

"Палюбоўнік" пастаўлены па аўтабіяграфічным рамане французскай пісьменніцы М. Дзюра. У монаспектаклі, які доўжыцца ўсяго гадзіну, адлюстравана глыбокая і палкая споведзь маладой французжанкі-эмігранткі, закаханай у кітайца. Маладых людзей падзяляюць яшчэ і розныя традыцыі, у якіх яны былі выхаваны (у Кітаі пачатку XX стагоддзя французжанкі — толькі жанчыны лёгкіх паводзін). Шчырыя пачуцці — каханне, страсць, рэўнасць, замілаванне, боль ад вымушанага расстання Б. Марцінкявічутэ ўвасабляе ў неверагодна пластычных рухах цела. У абсягах сцэны, падобнай па інтэр'еры на кітайскія пакоі, маналог яе гераіні гучыць ці то як дыханне стомленых палюбоўнікаў, ці то як жалобны нацыянальны спеў (спектакль іграўся на рускай мове, але спявала актрыса палітоўску), ці то як шум мора ў ракавінках, якіх шмат раскідана на падлозе. Кінутай палюбоўнікам гераіні Б. Марцінкявічутэ, засталося толькі... мора. І тонкі, няўлоўны дым цыгарэт, які з дапамогай светлавых штукарстваў

ператвараецца на белых палотнах задніка ў хвалі... мора адзіноты і няспраўджанага кахання...

У 1998 годзе Б. Марцінкявічутэ ўдзельнічала ў мінскім фестывалі монаспектакляў "Я". Як прызналася актрыса, менавіта цёплыя ўспаміны пра Мінск, надалі ёй рашучасці паставіць свой монаспектакль у Вільні. "Палюбоўнік", прэм'ера якога адбылася ў 2001 годзе, ужо мае 1-ю прэмію на Міжнародным тэатральным фестывалі ў Санкт-Пецярбургу, з поспехам прайшоў на фэсце монаспектакляў у Кіеве, а таксама ў іншых гарадах Еўропы.

В. БАРАБАНШЧЫКАВА

На здымку: сцэна са спектакля.

"Крыніца", № 1

Выйшаў у свет першы нумар літаратурна-культуралагічнага часопіса "Крыніца". У ім чытач знойдзе творы вядомых і маладых беларускіх і замежных пісьменнікаў. Рубрыка "Я" прадстаўляе "постаць" паэта Аляксея Пысіна. Друкуюцца артыкулы пра яго творчасць А. Вярцінскага, А. Пісьмянкова і інш. У рубрыцы "Яна" надрукаваны раман-бестселер украінскай пісьменніцы А. Забужкі "Палявыя доследы ўкраінскага сексу". Пераклад на беларускую мову гэтага "скандальнага" твора зрабіў А. Астраўцоў, вершы А. Забужкі, змешчаныя ў ім, пераклала Г. Булыка. Рубрыку "У нас" прадстаўляюць вершы беларускага паэта М. Шчура, які жыве цяпер у Празе. У гэтай жа рубрыцы надрукавана апавяданне У. Дамашэвіча "Развітанне ў 37-м". У рубрыцы "Я маю твор..." друкуецца верш С. Явар. Рубрыка "Наша" падае дзённік Б. Сачанкі "З запісак рэдактара", які раней ніколі не публікаваўся, датаваны 60-мі гадамі XX ст. Пісьменнік адлюстраваў у ім сваю працу ў часопісе "Полымя", сустрэчы з аўтарамі тых гадоў.

Лаўрэатамі штогадовых прэмій часопіса "Крыніца" ў 2001 годзе былі названы: В. Аксак (паэзія), Б. Пятровіч (проза), В. Калацкая (мастацкі пераклад), А. Астраўцоў (крытыка і эсэістыка).

СБС

ГАСЦЁЎНЯ

У хоры ўся музыка — духоўная...

Адзін з самых яркіх музычных калектываў Беларусі — Дзяржаўны камерны хор, створаны ў 1988 годзе. За час існавання калектыў прайшоў цікавы творчы шлях, насычаны шматлікімі запамінальнымі падзеямі. Удзельнічаў у міжнародных фестывалях, якія праводзіліся ў Беларусі, Польшчы, Славакіі, Нарвегіі; выступаў у Швецыі, Германіі. Яго ведаюць у Маскве, Санкт-Пецярбургу, Таліне, Вільні, Кіеве, іншых гарадах былога СССР.

З 2000 года калектывам кіруе Наталля Міхайлава, выпускніца Беларускай акадэміі музыкі, энергічная і абаяльная жанчына. Мы пагаварылі з ёй пра мінулае, пра сучасны стан хору, пра яго будучыню.

— Дзяржаўны камерны хор пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Ігара Мацюхова ў краіне ведалі добра. Хор пад вашым кіраўніцтвам — для шырокага кола слухачоў пакуль таямніца. Ці можна паміж "двума" калектывамі паставіць знак "роўнасці"?

— Наш калектыў быў створаны як першы ў рэспубліцы камерны хор. Былі сабраны найлепшыя творчыя сілы. Адбыўся імклівы творчы ўзлёт калектыву. Малады таленавіты кіраўнік... Першыя гастролі — у Нарвегіі... Аднак мы ведаем, што жыццё развіваецца па спіралі. Узлёты чаргуюцца з падзеннямі. За час існавання калектыў спазнаў сур'ёзныя змены, у прыватнасці, кадравыя. Гэта першае адрозненне. А другое — у мяне свой, жаночы падыход да канцэпцыі харавога мастацтва, іншае стаўленне як да вакалу, так і да рэпертуарнай палітыкі.

— А якім вам запомніўся хор Ігара Мацюхова? Якія ў яго былі характэрныя рысы?

— Мабільны і разам з тым стабільны калектыў, высокапрафесійны, хуткай "вывучкі". Ігар Мацюхоў — таленавіты музыкант, і яго асабісты прафесіяналізм уплываў на якасць гучання хору. Адсюль — тонкая нюансіроўка ў музычных тэкстах, асаблівае стаўленне да слова. Я імкнуся прытрымлівацца таго ж шляху. Аднак мы, у адрозненне ад палітыкі Ігара Мацюхова, аддаём перавагу рускаму, славянскаму вакалу. У выяўленчым плане ў нас гучыць добрае "фортэ" і вельмі насычанае "піяна". Адвучаем тэнараў спяваць фальцэтам, каб чуць у хоры сапраўдныя мужчынскія тэмбры.

— З энергіяй першаадкрывальніка Ігар Мацюхоў стварыў на абсягах культуры Беларусі нешта новае, "прабіўся" праз "асфальт" неіснавання, пакінуў калектыву багатую творчую спадчыну і... З'ехаў у Санкт-Пецярбург. Можна сказаць, што дырыжор скончыў свой адрэзак працы і меў поўнае права пайсці далей?

— Ігар Мацюхоў вучыўся ў Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі і, напэўна, імкнуўся ў той горад вярнуцца. Яго можна зразумець. Музычны бамонд паўночнай расійскай сталіцы больш патрабавальны за наш, больш "зубасты" і "слухасты". Музычнае жыццё там больш бурнае, чым у нас. Але не скажу, што ад'езд кіраўніка быў гладкі. Развітваліся ў непаразуменні, разгубленасці...

— Ваш хор мае цікавую гісторыю. Ён шмат гастраляваў, запісваў альбомы, перамагаў на фестывалях. Гэта адбываецца на фоне ўнутранай барацьбы, імкнення да творчага росту. Як гэты працэс уплывае на харыстаў? Усе яны таксама змагары?

— Дырыжор — хор — неразрыўны тандэм. Харысты на роўных падзяляюць поспех дырыжора. А няўдачы, бадай, больш адбіваюцца на кіраўніку. Як сапраўдныя музыканты, харысты таксама глыбока перажываюць усё, што адбываецца з калектывам. Аднак паміж імі і дырыжорам усё ж ёсць розніца. Чалавек, які спявае ў хоры, не можа дакладна чуць агульнае гучанне. Тым і адрозніваецца conductor, каардынатар усіх, хто спявае. Колькі разоў было: харысты кажуць — "цудоўна спявалі", а дырыжор хітае галавой — "жудасна".

— Пасля "бурнай" маладосці Дзяржаўны камерны хор пачынае "дарослае" жыццё . Натуральнае падарожжа калектыву па хвалях рэальнасці працягваецца. Ці ёсць у вас упэўненасць, што хор знаходзіцца ў добрай вакальнай форме і можа імкнуцца да новых перамог?

— У мяне ёсць натуральнае для кіраўніка жаданне, каб у нашым хоры спявалі высокапрафесійныя, добра навучаныя выканаўцы. На жаль, праблема кадраў сёння па-ранейшаму вострая! Таму я добра разумею, за які рэпертуар наш хор яшчэ не можа ўзяцца. Таму поўнага задавальнення сітуацыяй у калектыве пакуль няма. Ды і ўвогуле, — за канцэрт бываюць толькі адзін-два моманты, калі "мурашкі па скуры бегаюць"; калі адчуваеш поўнае задавальненне. Усё астатняе — як у спартсменаў: "пампаванне мышцаў". Трэніруемся, працуем, пакуль "колькасць" не пераходзіць у "якасць".

— Калі з калектыву сыходзяць людзі, як вы гэта перажываеце?

— Гэты працэс вось ужо 5 гадоў як пачаўся. Што там казаць — я прыйшла да таго, да чаго прыйшла: да "паваленай, закінутай вежы". Кадравая "цякучка", людзі не затрымліваліся. За той год, што я працую кіраўніком, удалося ў пэўнай ступені стабілізаваць становішча. Набралася мужчынская група хору. У параўнанні з той, да якой я год таму падышла, новая ў творчым плане больш-менш мяне задавальняе. З ёй можна працаваць цікава. Буду спадзявацца, што сітуацыя вакол харавой культуры зменіцца, і мы зможам надаваць больш увагі нашым творчым работнікам, харыстам, зможам павялічыць іх заробак.

— Творчыя сувязі паміж тымі, хто сыходзіць і хто застаецца, не знішчаюцца?

— Безумоўна, мы адно аднаго вельмі любім, сустракаемся, узаемна цікавімся поспехамі. Удзельнікі першапачатковага складу хору цяпер працуюць у розных калектывах, і нашы былыя выканаўцы там знаходзяцца на вельмі высокім рахунку. Яны — прафесіяналы вышэйшага класа. І ўвогуле, сярод харыстаў проста не можа быць ніякай варожасці. Былыя нашы ўдзельнікі прыходзяць да нас на канцэрты, параўноўваюць уражанні, успамінаюць лепшае.

— Можна сказаць, што працэс "перабудовы" і стабілізацыі хору скончаны?

— За год харысты навучыліся разумець, чаго я ад іх чакаю. Скажам так: яны "схопліваюць" мае заўвагі не з 20-га разу, а ўжо з 5-га. Асноўныя моманты кіравання, мае патрабаванні яны ўжо ўспрымаюць значна хутчэй. Ужо загадзя адчуваюць, калі я зраблю заўвагу. У гэтых адносінах калектыў стаў значна больш стабільны і мабільны. За год мы адно ў аднаго многаму навучыліся.

— На што вы абапіраецеся, ствараючы рэпертуар хору? Ці ёсць у вас пэўныя тэмы, аўтары або выдатныя прыклады калег, якія адыгрываюць ролю арыенціраў, лоцманаў?

— Спачатку вакальныя дадзеныя выканаўцаў дазвалялі ўзяцца толькі за жанр "Заходняй мініяцюры", які добра падыходзіць для музычнай "настройкі". Так сабралі рэпертуар заходняй музыкі. Потым пачалі пераходзіць да скарбаў праваслаўнай музычнай культуры. Паступова склалі адпаведны рэпертуар, на аснове якога робім канцэрты тэматычнага кшталту. Мы знайшлі шмат твораў, прысвечаных асобе Божай Маці. Потым стварылі канцэрт, сабраўшы тое, што адлюстроўвае тэму Нараджэння Хрыстова. Зрабілі канцэрт да свята Вялікадня. У сваіх паездках па краіне часта выступаем перад дзіцячай аўдыторыяй, адпаведна карэктуючы рэпертуар. Мне важна, каб дзеці, пачуўшы харавое гучанне, захацелі зноў пабываць на нашых канцэр-

ІМПРЭЗЫ

Крок насустрач

Сёння ёсць нагода казаць пра пашырэнне беларуска-польскіх адносін, лічыць дырэктар Польскага інстытута ў Мінску спадар Цэзары Карпіньскі, але наладжваць працу будзе новае пакаленне гісторыкаў і грамадскіх дзеячаў.

Польскі інстытут у Мінску і Фонд Стэфана Баторыя з нагоды перадачы ў падарунак Нацыянальнай бібліятэцы РБ серыі кніг "Гістарычныя сшыткі" з архіва Літаратурнага інстытута Ежы Гедройца, а таксама іншых кніг польскіх выдавецтваў наладзілі прэзентацыю. На ёй прысутнічалі, акрамя супрацоўнікаў бібліятэкі, многія вядомыя асобы — прафесар А. Мальдзіс, старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў В. Іпатава і іншыя. Перададзеная ў мінулым годзе першая частка гістарычных сшыткаў са збору нашага слыннага суайчынніка Е. Гедройца выклікала вялікую зацікаўленасць даследчыкаў і навукоўцаў. Цяпер поўны збор перададзеных кніг будзе захоўвацца ў фондах бібліятэкі, а ў бліжэйшы час з'явіцца ў электронным каталозе.

Іншыя кнігі польскіх выдавецтваў, якія таксама застануцца беларускім чытачам, датычаць гісторыі, а таксама праблематыкі сучасных польска-нямецкіх адносін, якія заўжды былі складанымі і неадназначнымі. Спадар Карпіньскі зазначыў на адкрыцці, што апошнім часам кантакты Польшчы з Германіяй будуюцца на прыязнай і прымальнай аснове, таму гэта павінна стаць прыкладам і для кантактаў паміж Польшчай і Беларуссю, калі заходзіць гаворка пра сумесную і аб'яднаную Еўропу.

Зрэшты, апошнюю прэзентацыю кніг і шэраг папярэдніх, калі пры дапамозе Польскага інстытута ў Мінску засталіся унікальныя выданні, можна аднесці да аднаго са спосабаў наладжвання прыязных адносінаў і вырашэння даўніх гістарычных спрэчак. Польскі бок выказвае жаданне абмяркоўваць адносіны паміж нашымі краінамі, але працэс размовы зацягваецца і рэальнае рашэнне складаных гістарычна-нацыянальных пытанняў, як лічыць спадар Карпіньскі, будзе, хутчэй за ўсё не за нашым пакаленнем, а за новай маладой кагортай навукоўцаў і грамадскіх дзеячаў. Магчыма, гаворку падштрухне прэзентацыя ў пачатку вясны кнігі па гісторыі Беларусі, якую разам з кнігамі па гісторыі Польшчы, Літвы і Украіны будзе выдаваць польскі бок. На працягу апошніх пяці-шасці год кніга гэта складзена з матэрыялаў, падрыхтаваных беларускімі навукоўцамі. На жаль, пакуль што яна выйдзе ў перакладзе на польскую мову, хоць мяркуецца надалей выданне ўсіх запланаваных кніг у перакладзе на іншыя мовы, у тым ліку на мове арыгінала.

Канешне, спрэчныя пытанні паміж нашымі краінамі вырашацца не сёння. Як зазначыў пасля адкрыцця выставы прафесар А. Мальдзіс: "Калі я бываю ў Польшчы, слухаю польскае тэлебачанне, чытаю польскія газеты і кнігі, параўноўваю іх з беларускімі, я лаўлю сябе на думцы, што нам выгадна ўяўляць адзін аднаго не суседзямі, а весці засцерагальную палітыку, даваць авансам аплявухі. А на гісторыю, нельга глядзець аднабакова, нельга пагаджацца з тым, што беларуская нацыя была толькі мужыцкая і хамская, якая жыла пад польскім прыгнётам. Рэч Паспалітую нельга блытаць з Польшчай сучаснай. Палітычна — гэта была супольная дзяржава двух народаў, а этнічна — не менш чатырох. На жаль, пазіцыя польскага прыгнёту дасюль выгадна некаторым гісторыкам. Будаваць жа адносіны трэба не на супрацьпастаўленні, а на супастаўленні".

Н. ШАРАНГОВІЧ

тах. Хочацца, каб на канцэрце ім не было сумна ад мудрагелістай праграмы. Наладжваем супрацоўніцтва і з нашымі беларускімі кампазітарамі. З Уладзімірам Карызнам мы разам вучыліся ў кансерваторыі. Ён, дарэчы, знаёміць нас і з творчасцю сваіх сяброў-кампазітараў. Часам асабістыя сувязі ўплываюць на рэпертуар хору, а бывае, што спачатку заёмімся з добрым творам і потым "выходзім" на яго аўтара.

— А ці бяруць удзел у фарміраванні рэпертуару самі харысты?

— Іх пажаданні ўлічваюцца. Калі кіруеш калектывам, трэба быць псіхолагам. Падчас чую: "Давайце лепш паспяваем Баха". Калі адчуваю, што твор выконваецца без драбочка навізны, мы рэзка мяняем кірунак. Калі твор пачынае гучаць надта кансерватыўна, трэба папрацаваць у іншым жанры, і тады страчаная зацікаўленасць выканаўцаў вяртаецца. Студэнты Акадэміі музыкі часам самі прыносяць у хор творы, якія ім падаюцца цікавымі. А летась у нас працаваў нават студэнт кампазітарскага аддзялення, быў «свой» "кампазітар, і ён рабіў для нас харавыя апрацоўкі. Пасля заканчэння акадэміі ён быў размеркаваны на працу ў Маладзечна, а яго апрацоўкі мы выконваем і сёння.

— Ваш хор удзельнічаў у VI Міжнародным фестывалі праваслаўных песняспеваў, што праходзіў у Мінску, і выконваў творы А. Архангельскага, М. Балакірава, П. Часнакова, А. Туранкова, А. Хадоскі. Наколькі моцны будзе гэты музычны кірунак у вашых перспектыўных планах?

— Праваслаўная музыка — велізарны пласт нашай музычнай культуры. Без яе не абыходзіцца ніводны з нашых канцэртаў, нават у музычных школах. На мой погляд, у рэпертуары хору ўвогуле не можа быць б е з д у х о ў н а й музыкі. Уся музыка для хору ў той ці іншай ступені — духоўная. А праваслаўныя спевы — глыток чыстага паветра. Заўсёды будзем звяртацца да яе. Да таго ж, гісторыя харавога мастацтва і пачынаецца ад царкоўнай традыцыі. Калі наконт музыкі іншых кірункаў меркаванні харыстаў не заўсёды супадаюць, дык спрэчак вакол духоўнай музыкі не ўзнікае.

— Увосень Дзяржаўнаму камернаму хору споўнілася 13 гадоў. Лічба, што б ні казалі некаторыя людзі, — цудоўная! Царква забабоны не прымае, бачыць у лічбе "13" сімвалічны сэнс. Апосталаў было дванаццаць. Трынаццаты, — дакладней, п е р ш ы сярод 13-ці, — быў Хрыстос. Вы верыце, што сёлетні сезон, акрамя звыклых цяжкасцяў, прынясе і шмат радасных, светлых імгненняў хору?

— Прапаноў у нас мноства, і мы спадзяёмся апраўдаць чаканні нашых слухачоў і "заказчыкаў". З'явілася шмат сяброў-кампазітараў, якія жадаюць з намі працаваць. Мы зрабіліся запатрабаваныя. Вельмі спадзяюся, што гэты сезон будзе новай прыступкай да чарговай вяршыні ў творчасці хору. Тым больш, што для мяне асабіста лічба "13" таксама вельмі шчаслівая. Прыкладаем намаганні мы і для таго, каб зрабіць рэкламу хору за мяжой. Калі б знайшліся людзі, якія змаглі ў гэтым дапамагчы, мы былі б вельмі ўдзячныя.

Гутарыў Андрэй АХМЕТШЫН

На здымках: Дзяржаўны камерны хор Беларусі і яго мастацкі кіраўнік Н. МІХАЙЛАВА.

Выстава польскай кнігі *Фота М. ПРУПАСА*

ВЫСТАВЫ

Мемарыял са "знятых" твораў

Выстава гэта адбылася ў канцы мінулага года ў сталічнай недзяржаўнай галерэі "Золата". Яна вельмі кідка абазначыла сваю тэматыку, прапанаваўшы гледачам творы "недазволеныя цэнзурай". Арганізатары разлічвалі на скандал, таму і ўвага да экспазіцыі з боку журналістаў была немалая, асабліва незалежнага друку, які прыняў выставу з найлепшымі адзнакамі. Што і зразумела, акцыя рыхтавалася доўга, чуткі пра яе зараней "хадзілі" ўжо пэўны час. Тое, што выстава ўсё ж адбылася, не была забаронена і "правісела" ў прыватнай галерэі амаль два тыдні, было для яе арганізатараў пэўнай перамогай. Праўда, улады на выставу ўвагі не звярнулі — тактыка, якая апошнім часам выкарыстоўваецца і супроць іншых, больш маштабных дзеянняў апазіцыі. Скандала не адбылося, экспазіцыя, прайшла досыць непрыкметна, па звыклых законах шараговых выставаў.

На выставу я патрапіла ў дзень закрыцця, цікавасці надалі самыя розныя водгукі. Невядомых мне экспанатаў не чакала, бо гісторыя стварэння многіх з іх была добра вядомая, нараджалася на вачах. Памятаю, як усе дзесяць гадоў, калі суполка "Пагоня" ладзіла свае знакамітыя выставы 25 сакавіка кожнага года, мы прыходзілі спецыяльна задоўга да адкрыцця, каб не прапусціць новую "спрэчную" інсталяцыю, карыкатуры Алега Карповіча, усё тое, што, меркавалася, праіснуе не больш за адзін вечар. А наступным днём "лёталі" паглядзець на пустыя сцены.

Гісторыя мастацтва апошняга дзесяцігоддзя дала нямала прыкладаў грамадзянскай мужнасці мастакоў, якія не цураліся забароненых тэм, не баяліся адзначаць нацыянальныя святы, адстойвалі Курапаты, былі на мітынгах у першых шэрагах, неаднойчы паспрабаваўшы на сваіх плячах моц міліцэйскіх "дэмакратызатараў". Думаю, многія творы А. Марачкіна, А. Шатэрніка ды іншых мастакоў сярэдняга і маладзейшага пакаленняў стануць адзнакамі часу.

Згадак пра "былое" на экспазіцыі было досыць. Памятныя інсталяцыі А. Карповіча і А. Марачкіна з вядомымі і ўжо падзабытымі тварамі былых дзяржаўных дзеячаў. Калажы-краты Т. Маркавец, плакаты У. Крукоўскага, нацыянальная сімволіка, ганаровыя медалі Пэн-цэнтра, зробленыя Л. Талбузіным, макет нявыдадзенай кнігі Э. Акуліна, жывапісны твор А. Клінава і вельмі шмат адвергнутага А. Пушкіна... Эпоха палітычных змаганняў 90-х прадстала перад вачыма як жывая. І магла б скласці вельмі цікавую і змястоўную залу, напрыклад, музея гісторыі канца мінулага стагоддзя ці частку мемарыяльнай экспазіцыі, прысвечаную дэмакратычнай апазіцыі. Чаму б і не? У гэтым выпадку былі б апраўданымі і выбар твораў, і шматслоўныя каментарыі да іх. Калі адносіцца да выставы як да мастацкай, паўстае пытанне да прынцыпу выбару твораў, не заўсёды высокай мастацкай якасці, што натуральна для палітычна-эпатажных аднадзёнак. Разгорнутыя каментарыі з прозвішчамі вінаватых у "рэпрэсіях" пэўнага твора маюць права на існаванне, але толькі калі яны не нясуць неўдакладненую, непраўдзівую інфармацыю. Інакш губляецца сэнс акцыі, да якой будуць у любым выпадку прыглядацца больш пільна, чым да шараговай выставы.

Асабіста ж мне "запалі" ў памяць экспанаты, якія пакінулі пытанні. Вырваныя з кантэксту экспазіцыі, з палітычнага моманту стварэння, яны, мне здаецца, не маюць самастойнага і мастацкага існавання: так, напрыклад, "Адзенне беларуса XX стагоддзя" (1991, А. Пушкін) — апранутыя на манекен замурзаная вясковая апратка. "Плавільшчыкі расы" таго ж аўтара, забароненыя ў свой час за залішні эратызм, выклікаюць у памяці нядаўнюю выставу ў Літаратурным музеі Янкі Купалы, дзе нямецкі мастак Д. Браунс пасля запатрабавання адміністрацыі без асаблівых перажыванняў "прыкрыў" аголенага мужчыну на адным са сваіх фотаздымкаў. І зараней можна было б зразумець, што праваслаўная царква не дазволіць роспіс з выяваю Язафата Кунцэвіча (тым больш у епархіяльным упраўленні Віцебска), альбо закрые покрывам 28 кв. метраў капліцы Св. Язэпа ў магілёўскім кафедральным касцёле. Але ж і Мікеланджэла вымушаны быў змірыцца з запатрабаваннем Папы "прыкрыць" часткі мужчынскага цела ў роспісах Сіксцінскай капэлы...

Але горш за ўсё, што выстава выпраўляецца ў падарожжа па замежных краінах. І там незнаёмы з нашымі палітычнымі рэаліямі глядач даведаецца пра Беларусь — абарваную і зласлівую, што смяецца з сябе не ад моцы, але зыходзячы з сённяшняй палітычнай кан'юнктуры...

Наталля ШАРАНГОВІЧ

Трыццаць гадоў у мастацтве

Споўнілася 30 гадоў творчай дзейнасці рэжысёра, сцэнарыста, акцёра Міколы Макарцова. Сваю дзейнасць ён пачынаў у Гомелі, дзе працаваў пасля заканчэння Магілёўскай культурна-асветніцкай вучэльні і Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута. Менавіта тады вызначыў свой галоўны творчы прынцып: у аснове ўсяго павінны быць здабыткі народа. М. Макарцоў пачынае актыўна прапагандаваць беларускае слова, нацыянальныя народныя песні і танцы, народную тэатральную культуру. Менавіта Гомель для М. Макарцова стаў тым горадам, які прынёс яму сапраўдныя творчыя набыткі. Тут ён паставіў шэраг спектакляў па творах беларускіх пісьменнікаў, стварыў славуты фальклорны тэатр "Жалейка", які выступаў аж у Індыі. Значнае месца ў яго рэпертуары заняла творчасць Янкі Купалы.

Дваццаць гадоў М. Макарцоў працаваў у Гомелі, потым 10 — у Мінску галоўным рэжысёрам і рэжысёрам-пастаноўшчыкам шматлікіх рэспубліканскіх свят і фестываляў. Сярод іх — усебеларускае "Купалле" ў Тураве, "Гуканне вясны" ў Жыткавічах, "На крылах Палескага фальклору" ў Лельчыцах, а таксама святы, прысвечаныя Паўлюку Багрыму ў Крашыне, 500-годдзю Мірскага замка... Як адзін з рэжысёраў-пастаноўшчыкаў М. Макарцоў прымаў удзел у фестывалі "Беларусь — мая песня", у святах горада Мінска, Беларускага пісьменства і друку, ва ўрачыстасцях з нагоды 200-годдзя Адама Міцкевіча ў Навагрудку, вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Здымаўся ў кіно, выпусціў некалькі кніжак.

З нагоды 30-годдзя творчай дзейнасці Міколы Макарцова ў Гомельскім гарадскім культурным цэнтры адбылася вечарына. Юбіляра віталі прадстаўнікі абласнога ўпраўлення і гарадскога аддзела культуры, драмтэатра, абласной філармоніі, Цэнтральнага парку культуры і адпачынку, пісьменніцкай арганізацыі, заслужаная дзяячка культуры Беларусі дацэнт Беларускага універсітэта культуры Н. Загорская, віншавальныя тэлеграмы паступілі ад народнай артысткі Беларусі М. Захарэвіч і доктара мастацтвазнаўства А. Сабалеўскага з Мінска. А на сцэне гучалі песні, жарты, выступалі музыкі і танцоры.

А. ШНЫПАРКОЎ

З лінгвістычнай спадчыны

Філолагі Беларускага дзяржаўнага універсітэта падрыхтавалі два зборнікі выбраных прац вядомых у нашай краіне і за мяжой навукоўцаў — дактароў філалагічных навук прафесараў Льва Шакуна і Адама Супруна.

Вучні і калегі Л. Шакуна з кафедры гісторыі беларускай мовы далі зборніку назву "Карані роднай мовы", змясціўшы ў ім 33 артыкулы па самых розных пытаннях гісторыі беларускай мовы. Як вядома, вучоны на працягу ўсяго жыцця займаўся менавіта распрацоўкай перыядызацыі працэсаў фарміравання і развіцця мовы беларускага народа, ужо ў канцы 50-х — пачатку 60-х гадоў падрыхтаваўшы такія фундаментальныя працы, як "Станаўленне і развіццё беларускай літаратурнай мовы" (1959), "Нарысы гісторыі беларускай літаратурнай мовы" (1960), "Гісторыя беларускай літаратурнай мовы" (1963; выд. 2-е. перапрац, 1984), якія і сёння служаць надзейнай асновай пры распрацоўцы многіх актуальных пытанняў беларускай лінгвістыкі.

Кніга складаецца з трох раздзелаў: "Гісторыя беларускай літаратурнай мовы", "Сучасная беларуская мова і яе сувязі і дыялектамі і з іншымі славянскімі мовамі", "Мова асобных літаратурных твораў і роля пісьменнікаў у развіцці беларускай мовы". Артыкулы ў кожным з раздзелаў падаюцца ў храналагічным парадку, што дае магчымасць не толькі прасачыць ход навуковай думкі вучонага, але і ўбачыць, якія праблемы прыцягвалі ўвагу даследчыка на працягу яго шматгадовай навуковай дзейнасці. Сабраныя пад адной вокладкай артыкулы і выступленні сведчаць аб мэтанакіраванай працы вучонага ў галіне гісторыка-лінгвістычнай праблематыкі. Менавіта Л. Шакуну належыць прыярытэт у распрацоўцы такіх праблем, як значэнне царкоўнаславянскай мовы ў развіцці беларускай літаратурнай мовы, дыялектызмы ў помніках старажытнага пісьменства, мова як фактар нацыянальнай самасвядомасці, узаемадзеянне беларускай літаратурнай мовы і дыялектаў, "усходнія" і "заходнія" крыніцы папаўнення лексічных сродкаў беларускай мовы, беларуска-польскія моўныя ўзаемасувязі і інш. Шмат увагі надаваў вучоны вызначэнню месца і ролі ў гістарычным развіцці беларускай мовы Ф. Скарыны, Я. Купалы, Я. Коласа, К. Крапівы, грунтоўныя працы прысвяціў ён паэмам "Энеіда навыварат" і "Тарас на Парнасе", творам палітычнай сатыры XVII ст. "Прамова Мялешкі" і "Ліст да Абуховіча". У зборніку змешчаны таксама артыкулы, у якіх характарызуецца дзейнасць Я. Карскага і І. Насовіча, вызначаюцца функцыянальныя стылі беларускай літаратурнай мовы, аналізуецца моватворчасць Ф. Скарыны і інш.

Энцыклапедычнай шырынёй інтарэсаў выдзяляўся і прафесар А. Супрун, вучні якога выдалі зборнік "Исследования по лингвистике текста". На працягу многіх гадоў вучоны займаўся тэксталінгвістыкай, будучы фактычна піянерам у гэтым накірунку. Прычым у яго працах удала спалучаліся розныя падыходы да тэксту як канцэнтрацыі асобных структурных адзінак розных узроўняў. Асноўным прадметам аналізу А. Супруна пры гэтым была лексічная арганізацыя тэксту, якая ўзаемадапаўнялася граматычнымі магчымасцямі слова: "Узаемадзеянне лексікі і граматыкі ажыццяўляецца не толькі на ўзроўні сказа, але і на ўзроўні групавання сказаў, што складаюць тэкст" ("Лексическая структура в ее соотношении с грамматической"). Асновай для зместавай, семантычнай інтэрпрэтацыі, — як лічыць вучоны, — можа быць і фанетычны паўтор. Напрыклад, спалучэнне "выбухны гук +р" з яўляецца знакам крывавых дзействаў тыранаў у вершы Г. Ахматавай ("Языковая структура одного стихотворения Анны Ахматовой").

Выбраны метад аналізу тэкстаў быў праверан А. Супруном на творах самых розных па характары, часу стварэння, камунікатыўных установках, розных аўтараў. Сярод апошніх былі і беларускія паэты, у прыватнасці аналізавалася лексічная структура вершаў У. Караткевіча "Дзяўчына пад дажджом", Я. Коласа "Ручэй", Я. Купалы "З асенніх напеваў", М. Танка "Самыя балючыя раны..." і "Як збіраць кветкі". Ёсць у зборніку і артыкулы, прысвечаныя вершам рускіх паэтаў — Б. Пастарнака, К. Чукоўскага, У. Маякоўскага, А. Блока, В. Хлебнікава, А. Вазнясенскага, М. Цвятаевай.

Зборнікі выбраных прац Л. Шакуна і А. Супруна — надзейная аснова для далейшых пошукаў у галіне слова.

Мікалай ПРЫГОДЗІЧ

АЛЬФА-БЭТА

Хочацца верыць!

На адной з маіх паэтычных сустрэч у Гомелі, ужо на разыходжанне, калі схлынула чарга за аўтографамі, да мяне падышла невысокая танклявая дзяўчына, яшчэ амаль падлетак, з вучнёўскім сшыткам у руках, і, відочна саромячыся, ціхім голасам папрасіла: "Прабачце, калі ласка, я вельмі хачу, каб вы прачыталі мае вершы..." — "Зараз? Але ж мы ўжо ад'язджаем, я спяшаюся". — "Не, — сказала, — не зараз, пасля, дома..." — "А хто вы?" — "Студэнтка Рэчыцкага педкаледжа. Мы прыехалі ў Гомель на сустрэчу з вамі..." — "Пачытаць я змагу, але не ўпэўнены, што знойдзецца час напісаць вам пра свае ўражанні", — сказаў, гледзячы ёй у вочы, шчыра як ёсць. — "Такой бяды, — кажа, — усё роўна пачытайце, калі ласка..."

Усміхнуўшыся ў думках, я сшытак узяў, канешне. Дзіўная дзеўчынёха. Колькі помню — усе прасілі "пачытайце" менавіта дзеля таго, каб пасля пачуць водгук, атрымаць ацэнку, а тут... Проста — пачытайце.

Сшытак я пагартаў толькі праз дзень. Спачатку прачытаў тое, што аўтарка вершаў напісала пра сябе. "Мяне завуць Валасюк Марына. Мне 17 гадоў. На гэты час я вучуся ў Рэчыцкім педагагічным каледжы. У мяне ёсць ваша кніга вершаў. Яна называецца "На высокім алтары". Многія вершы ў ёй мяне закранулі. Я ўвогуле люблю вершы і люблю чытаць. Пісаць я пачала яшчэ ў 1998 годзе. Тут — мае больш спелыя вершы, апошняга часу. Увогуле-то пасля заканчэння каледжа я хачу паступіць у музычнае што-небудзь. У каледжы я хаджу на хор, мяне запісалі ў групу першых сапрана, чаму я вельмі рада. Музыка, напэўнае, для мяне значыць трохі больш, чым паэзія. Я яе абагаўляю. Я нават сама ствараю мелодыі, але толькі ў галаве, запісаць не ўмею. Яшчэ адно маё захапленне — астраномія. Усё сабіраю пра неба, пра зоры і г.д. Я свае вершы яшчэ нідзе не друкавала. Сама я нарадзілася ў Хойніках, 26 чэрвеня 1984 года". Прачытаў гэта і задумаўся. За два гады да Чарнобыля, у Хойніках. Дзіця-ахвяра. І прачытаў вершы — і на рускай, і на беларускай мовах. На рускай у сшытку больш. Але на беларускай лепшыя — яны ў меншай залежнасці ад начытанасці, ад паэзіі "куміраў", у іх больш свайго ўласнага пачуцця і жывога, непасрэднага рэагавання на свет. Менавіта ў іх я знайшоў і боль Чарнобыля, хоць самога гэтага слова і няма. І мне таксама забалела. У 17 дзявочых гадоў пісаць: "Паплач, мая прыроданька, пра лёс дачкі сваёй!" — гэта ўжо не вершаскладанне, гэта ўжо — лёс, а значыць — паэзія.

Не ведаю, што стане на ўсё жыццё выбарам Марыны Валасюк — паэзія (а падставы ёсць), ці музыка (напэўна, таксама ёсць задаткі), ці можа... астраномія? А можа, і тое, і другое, і трэцяе разам? А чаму б і не?

Божа, як хочацца верыць, што з нашай роднай беларускай зямлі будуць узыходзіць і ўзыходзіць маладыя прыгожыя таленты, і іх будзе столькі, што ніякая чорная сіла не зможа іх ні заглушыць, ні затаптаць, ні вынішчыць. Бо толькі ў іх, у талентах — будучыня нашай любай Беларусі.

Ніл ГІЛЕВІЧ

Марына ВАЛАСЮК

•

Я палеткам сваім пакланюся,
Да зямлі прыпаду, памалюся,
І яе пацалую пяшчотна
Дый заплачу. Але не гаротна.

Дакрануся рукою калосся
І травіначкі кожнай крануся,
І паміж усяго сугалосся
Я ад шчасця душою прачнуся.

І лугі, і лясы, і палеткі
Абдыму, акраплю іх слязою,
Кожны родны куточак палескі
Я прылашчу пяшчотнай рукою.

Пакланюся, душой залячуся,
І з бярозкай сваёй абдымуся,
І, пачуўшы гарачае сэрца,
У бацькоўскую хату вярнуся.

•

Плач, зямелька родная,
Плач аб сваіх дзецях:
Як і яны, гаротная, —
Для іх адна ты ў свеце.

Паплачце, травы з зёлкамі,
Пачуйце боль грудзей,
Свае слязінкі горкія
Праліце як хутчэй.

Паплач, мая прыроданька,
Пра лёс дачкі сваёй.
"Шчаслівае дарожанькі!" —
Скажы й махні рукой.

Што долечка пастылая,
Што гэткі жорсткі люд,
І што я ўсім нямілая —
Ці ёсць тут Божы суд?

•

Душа паэта — гэта слова!
Яно з ім звязана навек.
І што ж, скажыце, тут благога?
Паэт са словам — чалавек!

Душа паэта — гэта радасць.
Ён мусіць рад быць усяму:
Траве, дажджу, расе на градах, —
За гонар радасць мець яму.

Душу паэта раніць лёгка,
І гэта трэба помніць-знаць.
Не прычыняйце ж болю многа!
Бо можа... можа й не стрываць.

2001, Вясна—лета.

ХОЛАДНА

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 9)

Яны занялі столік ля акна. Афіцыянт прынёс шампанскае.

– За нашу сустрэчу! — прамовіў Віктар.

– За нашу выпадковую сустрэчу, — іранічна ўдакладніла Вера.

Віктар сумеўся. А потым сказаў праўду. Аказваецца, офіс фірмы, у якой ён працуе, непадалёк ад іх, у адной з тых шэрых будынін, што насупраць. І ён часта бачыў, як Вера вяртаецца дамоў альбо спяшаецца на працу. Карацей кажучы, ён закахаўся і не знайшоў ніякага іншага спосабу знаёмства, акрамя гэтай па-хлапечы арганізаванай сустрэчы, за якую зараз сам сябе дакарае і просіць у яе прабачэння.

Вера з цікавасцю разглядала яго. Нечым падобны да Ігара. Гэтаксама чырванее, такі ж няўмелы, няздатны на самыя простыя і бяскрыўдныя хітрыкі.

Напачатку яны гаварылі абы пра што: проста ветлівая размова двух чужых людзей. Потым Віктар ажывіўся і расказаў, як ён стаў інжынерам.

– Спачатку вучыўся на юрыста. Пасля паспрачаўся з выкладчыкам і кінуў універсітэт. На наступны год падаў дакументы ў політэхнічны...

Вера здзівілася: хто б мог падумаць, што часам за мяккасцю, ціхмянасцю хаваецца такая цвёрдасць, такая вытрымка характару! Яе, Веру, лічылі на курсе самай смелай, самай рашучай. Аднак атрымалася наадварот — тады, у тым далёкім годзе, успамінаў пра які яна ніяк не можа пазбавіцца.

...Яны, маладыя, не любілі дырэктара. Ды і не толькі яны, а нават многія са старых выкладчыкаў. Прыдзірлівы да нудоты, рэзкі, часам, раззлаваўшыся з-за дробязі, мог чалавеку нагаварыць такое... Аднак выступаць супраць яго баяліся, бо меў нейкія моцныя знаёмствы ў раёне. Але выпадак, калі ён пачаў пры вучнях крычаць на Лідачу — маладую сарамлівую выкладчыцу музыкі, — абурыў усіх. Лідачка прыбегла ўся ў слязах у настаўніцкую. Там у той час быў Ігар і яна, Вера. Канешне, суцяшалі, як маглі. А ўвечары сабраліся ўсе маладыя настаўнікі і вырашылі на сходзе адкрыта і шчыра выказаць усё тое, што раней гаварылі толькі між сабой.

А ў той дзень прыехала якраз праверка. Былі на Верыных уроках, хвалілі і сур'ёзна паабяцалі, што змогуць з вясны перавесці ў горад: адкрывалася вакансія. А тут гэты сход... Вера доўга думала, вагалася і... не пайшла. Спаслалася на тое, што падскочыў ціск (гэта і сапраўды часта з ёю здаралася — спадчыннае). Але тады ён якраз быў у норме. Яна проста не пайшла. Пасля даведалася: многія з настаўнікаў "проста не пайшлі", гэтак жа "захварэлі", як і яна.

Дырэктара тады не знялі. Толькі праз год, калі адкрыліся нейкія яго фінансавыя махінацыі. Вера даведалася пра гэта, калі была ўжо ў горадзе.

Аднак хопіць успамінаў. Яна сама тады вырашыла так, а не інакш. Яна сама выбрала такі шлях. Ёй па ім і ісці...

У кафэ яны з Віктарам пабылі нядоўга: гаварыць асабліва больш не было аб чым, і Вера не хацела, каб ён падумаў, што нешта для яе значыць — больш, чым проста знаёмы.

Пасля, як выйшлі з кафэ, Віктар сказаў:

– Прабачце, зусім забыў, што абяцаў занесці сябру часопіс, ён вельмі прасіў. Не пашчасціла яму: трапіў у аварыю, пералом нагі. Ляжыць у бальніцы, сумуе. Я хуценька забягу, гэта побач, — і ён махнуў рукою ў бок бальніцы. — Вы пачакаеце?

І Вера, незразумела для сябе, прапанавала:

– А давайце зойдзем разам. Гэта лепш, чым я буду чакаць на вуліцы.

Зрэшты, ёй асабліва і не трэба было нікуды спяшацца.

У палаце амаль усе ложкі былі занятыя. Нягучна іграла радыё. Трое чалавек спала. Адзін чытаў дэтэктыў і еў размяклыя ад спёкі суніцы з вялікай талеркі, над якою кружыла муха. Пяты, той, хто быў ім патрэбен, ляжаў ля акна — там, дзе іграла радыё.

– Ігар, прывітанне! — Віктар памкнуўся да ложка.

Хворы павярнуўся.

Вера ўздрыгнула ад нечаканасці. Яна адчула, як ад хвалявання хутчэй забілася сэрца: Ігар! Узмужнелы, пастражэлы твар, лёгкія зморшчыны. Але гэта ён, той, далёкі і неспадзявана блізкі цяпер — Ігар.

Ён відаць, так і не заўважыў яе, адразу ўбачыўшы Віктара.

– Як маешся?

– Паціхеньку... — Ігар уздыхнуў. — Ляжу, як апошні лайдак

Вера ціхенька выйшла, асцярожна, бязгучна прычыніўшы за сабою дзверы. Амаль бегла па калідоры, ледзь знайшла лесвіцу, што вяла ў вестыбюль.

На вуліцы пахаладала. Крапчэў вецер. Глуха шумелі каштаны. Пацямнелае неба абяцала дождж. І ён не прымусіў чакаць. Кроплі былі халодныя. Чамусьці ўспомнілася бабуля Ганна з далёкай вёскі, дзе прайшло Верына дзяцінства, дзе застаўся сад з крамянымі яблыкамі белага наліву, якія з шумам падаюць уначы, зрываючыся з галін, і праз сон добра слухаць, як яны коцяцца па сцежцы, у траве... Бабуля Ганна гаварыла: "Увесну дажджы свежыя, улетку цёплыя, увосень халодныя..."

"Цяпер лета, а дождж — як увосень..." — падумала чамусьці Вера.

Наляцеў дажджысты вецер, і яна закрылася ад яго парасонам, азябла павёўшы плячыма: холадна...

ВАНДРОЎКІ

Рамантык з пэндзлем і сахаром

Над самым вухам гуднуў цеплавоз, далучаючы энергію чалавечага розуму да шалёнага свісту ветру. Я прачнуўся, аглядзеўся і ўспомніў, што знаходжуся ў зале чакання сусветна вядомага чыгуначнага пераезду Чоп, што на венгерска-ўкраінскай мяжы. Вакол гаманілі "чаўнакі", мірна адбрэхваліся "жоўта-блакітныя" мытнікі, бы неахвотна працавалі замест сваіх вялізных аўчарак, якія моўчкі, але злосна рваліся з павадкоў.

Нечакана сярод бруду і павуціння зашмальцаванай раскошы я заўважыў нешта незвычайнае, нешта такое, што зусім выбівалася з абыдзённага. Я ўбачыў высокую дзяўчыну гадоў дваццаці пяці з невялічкім рукзаком, якую ніяк нельга было ўявіць менавіта тут. Высветлілася, што Яна (так звалі прыгажуню) працавала ў кіеўскай маладзёжай арганізацыі, а зараз вярталася з камандзіроўкі ў Галандыю дахаты, у Львоў. На электрычках, ужо трэція суткі, ужо праз восьмую мяжу, намотваючы чатырнаццатую сотню кіламетраў. Гэткім жа недарэкам, відаць, выглядаў і я са сваімі дзвюма торбамі сербскіх кніжак, якія па чарзе здзіўлена гарталі югаслаўскія, венгерскія, украінскія і беларускія афіцэры. Таму мы і пазнаёміліся, і з захапленнем прагаманілі ўсе шэсць гадзін да цягніка.

Яна перадала мне нясцерпнае і незгасальнае жаданне пабываць у таямнічай і загадкавай Скандынавіі. Там, дзе, здавалася б, шмат падобнага да нас, толькі холадна і бязлюдна.

Размова гэтая адбылася ў верасні 1999 года, але толькі летась з'явіліся нейкія надзеі. Нарвежскія фермеры прасілі дапамогі. Паляцелі лісты, тэлеграмы, факсы ў Маскву, Осла, Мінск, Рыгу. І нарэшце зеленаватая віза з запаветным словам "Norge" («Нарвегія») заўсміхалася са старонкі майго пашпарта.

ЭКСПРЭС МІНСК — ХЕРМАНСВЕРК

І вось мы ў цягніку Мінск — Масква, каб пасля ляцець на Осла. Гэта зараз усамаў ловяць ды ладанаў ладанам ганяюць, а тады (у ліпені) пра іх яшчэ нічога не чулі, а талібы былі недзе далёка. Таму патрапілі мы на «ТУ-154» без лішніх пытанняў. Даляцелі добра, хоць і баяліся, наглядзеўшыся апошнім часам па тэлебачанні розных авіякатастроф.

Не вельмі радаваліся мы, калі з трыццаціградуснай маскоўскай цеплыні патрапілі ў пахмурныя пятнаццаць еўрапейскай сталіцы. І вось першая сустрэча, першае знаёмства з таямнічымі нарвежцамі.

А я тым часам параўноўваў шыльды. На адной, пад якой імгненна прайшлі амаль усе пасажыры і дзе стаяў усяго адзін таўстун у форме, было пазначана «Для грамадзян Еўрасаюза». А на другой, дзе нас дваіх матлашылі чатыры афіцэры паведамлялася: «Для ўсіх грамадзян». Неяк прыкра мне стала і зусім-зусім не хацелася ўспамінаць бессмяротныя словы: «Я беларус, я ганаруся, што нарадзіўся на гэтай казачнай зямлі...»

Але ўсё скончылася добра, нас прапусцілі, толькі папыталіся: «Ці ведаеце, што павінны на працягу сямі дзён зарэгістравацца ў паліцыі?»

«ТРОХІ» ПАПРАЦУЕМ

Гаспадар нам трапіўся неверагодна добры, уважлівы, гасцінны і — так, так — вясёлы і гаваркі. Часта сам жартаваў і нашыя досціпы разумеў (і гэта па-англійску!), ні хвілінкі не мог пасядзець спакойна, ціхенька.

Нарадзіўся ён на ферме на беразе Согне-ф'ёрда, што на захадзе Нарвегіі, і пасля сельскагаспадарчага універсітэта вярнуўся дахаты, дзе і разводзіць зараз авечак.

Дядзька Юка, як мы празвалі яго, працаваў вельмі шмат, ад цямна да цямна, а ўвосень неаднойчы мы бачылі, як бегаў ён па двары, прычапіўшы да брыліка ліхтарык. Амаль усе выхадныя праводзіў у гарах, у клопаце пра свой непаслухмяны статак.

Наш гаспадар шмат распытваў студэнтаў-беларусаў, дый сам, як высветлілася, шмат чаго ведаў, асабліва пра нашыя памежныя спрэчкі з суседзямі ў дваццатыя гады. Нават карту аднекуль з падвала выцягнуў, дзе Польшча даходзіла аж да Стоўбцаў. Не адзін вечар правялі мы ля каміна, абмяркоўваючы заганы вялікіх дзяржаў і самадурства дыктатараў, амерыканцаў, немцаў, камуністаў... — зусім як недалўжныя інтэлігенты на савецкіх кухнях шасцідзесятых гадоў.

Вось толькі працаваў ён нязвыкла для нас. Пачалося гэта літаральна па прыездзе. Сказаў нам фермер, што трэба яму забраць у сястры "some furniture" ("трохі мэблі"). «Ну добра, — падумалі мы, — джып ёсць джып, тое-сёе пакладзём». Але потым гаспадар узяў прычэп... І мы заклапаціліся. А калі высветлілася, што сястра пераязджае і што нам трэба пагрузіць мэблю з двухпакаёвай кватэры, зажурыліся. Пасля ж Юка задуменна зазначыў: «Паехалі возьмем яшчэ трохі». Тут мы ледзьве не залямантавалі, бо тыя «трохі» былі халадзільнік, газавая пліта і пральная машына. І ўсё гэта пасля ночы ў цягніку Мінск — Масква, пасля самалёта да Осла і цэлага дня блуканняў па горадзе...

Але і сам ён, толькі напярэдадні позна вечарам прыехаўшы, працаваў разам, ды што там разам — больш за нас.

І гэтае "трохі" паўтаралася неаднойчы. "Трохі фарбавання" зацягнулася на поўныя два месяцы, "трохі пагуляем у гарах" — пяць гадзін угару і дзве з паловаю ўніз, усё бягом і з авечкамі. За гэты час падняліся мы на паўтары тысячы метраў, да снягоў, на вышэйшую кропку Заходняй Нарвегіі. "Трохі пазбіраем фрукты" ператварылася ў тону сліў, паўтоны груш і тону яблыкаў. Звычайна яго штодзённы план прадугледжваў дватры такія "трохі", кожнага з якіх нам з сябрам хапала на некалькі дзён.

СЯМ'Я

Пра гаспадара нашага я ўжо напісаў, але дом трымаўся на жонцы, незабыўнай Карыне. Калі б не яна — засмеціў бы хату наш фермер ад падвала да гарышча. Толькі ад'едзе Карына — ужо посуд не змяшчаецца ў ракавіне, халадзільнік пусты, а праз дзверы не ўвайсці: заваленыя абуткам і вопраткаю. А Карына, наша незвычайная, мілая і сціплая Карына ўжо бяжыць з пылососам, расцягвае смецце, прыбірае — і дом заззяў, хочацца прыходзіць, сядзець, заставацца ў ім.

Дарэчы, пра дамы. У гаспадара нашага іх было чатыры: адзін, дзе мы жылі, — шаснаццатага стагоддзя, другі, гаспадарскі, — канца дзевятнаццатага, і два — васемнаццатага! І гэта не выключэнне, а звычайная практыка нарвежскіх вёсак. Так яны будавалі і будуюць. Грунтоўнасць — вось, бадай, найлепшае азначэнне іх стаўлення да працы.

ХАРЧЫ І ПІТВО

На вялікае маё здзіўленне не толькі беларусаў, як высветлілася, можна называць «бульбашамі». Па колькасці спажываемай бульбы і яе месцы ў штодзённым рацыёне нарвежцы мала нам саступаюць. Чатыры-пяць разоў на тыдзень сям'я гатуе стравы з яе. Між тым, разнастайнасцю ім пахваліцца цяжка — бульба ў асноўным толькі варыцца. А вось чаму я да самага апошняга дня не пераставаў здзіўляцца, дык таму, што гэтыя чысцюлі-еўрапейцы вараць яе ў мундзірах і часта ядуць не лупячы. Ды ўвогуле, смажаць яны вельмі рэдка, і любую смачную рыбу «знішчаюць» сваёю варкаю. Так, галоўнаю ўрачыстаю стравою, адзнакай найвышэйшай увагі ў іх лічыцца вараная гарбуша са смятанай.

Але на кухні поркацца нарвежцы не любяць і гатуюць звычайна толькі на вячэру. Сняданак — гэта бутэрброды з рыбай, каўбасой, мясам, варэннем, сырам і яшчэ чым заўгодна. Але сказаць "з сырам" — значыць не сказаць амаль нічога, бо сыр яны вырабляюць жоўты (тыпу галандскага), белы, карычневы і спецыфічны горкі, прычым многія віды як з каровінага, так і казінага малака, а таксама змешваючы — усяго каля васьмідзесяці гатункаў. Таму, відаць, і не надакучае ім усе трыста шэсцьдзесят пяць дзён есці тое самае на снеданне.

У 1925 годзе Тур Б'ёрклунд прыдумаў спецыяльны нож для нарэзкі сыру, і зараз гэта — адзін з самых папулярных (і карысных) нарвежскіх сувеніраў.

Гародніну нарвежцы не вельмі шануюць, у актыўным ужытку, бадай, толькі морква ды капуста брокалі. Невялічкі памідор ці агурок могуць парэзаць на тоненькія лустачкі і есці цэлы тыдзень. Салатаў амаль не ўжываюць. Не любяць тут ні супоў варыць, ні кашаў. Але кулінарныя кнігі разыходзяцца вялікімі тыражамі, а на кожным тэлеканале абавязкова ёсць штотыднёвая перадача пра харчаванне. Не застаюцца без увагі і замежныя рэцэпты, бо нарвежцы любяць каштаваць нешта экзатычнае: мексіканскае, кітайскае, індыйскае, любяць італьянскую і англійскую кухню. Вялікае месца належыць соусам і прыправам.

Да рыбы тут пашана асаблівая. Яе ядуць два-тры разы на тыдзень, і заўсёды з асалодаю. Нацыянальнымі стравамі лічацца "лакс" (смажаны ці вэнджаны ласось), "рэкер" (вараныя крэветкі) і «торск» (траска).

Абавязковы кампанент да любой стравы — гарлачык вады, што пачэсна займае цэнтр стала. Запіваюць яны ўсё — ад славутых бутэрбродаў да цукерак. З гарачых напояў "нацыянальным" лічаць чай, які часта п'юць з малаком, але ў дваццатым стагоддзі чай моцна пацясніла кава. Між тым у апошнія два дзесяцігоддзі ўсё больш і больш людзей вяртаецца да чаю, але зараз ужо з адвараў, лісця, збораў.

Пра здароўе грамадзян увесь час клапоціцца дзяржава, што нас, грэшных беларусаў, часам раздражняла. Бо пачак цыгарэт каштуе пяць-сем долараў, і нават калі наскрабеш іх, то ледзьве знойдзеш, дзе засмаліць: амаль ва ўсіх памяшканнях забаронена, а на вуліцы на цябе пазіраюць са спачуваннем і некаторай грэблівасцю.

Яшчэ складаней у Нарвегіі з выпіўкай. Сухі закон — амаль равеснік нарвежскай незалежнасці: Нарвегія разарвала унію са Швецыяй у 1905 годзе, а ўжо ў 1919 годзе ўвяла поўны сухі закон, толькі ў 1932 годзе абмежаваўшыся "паўсухім", які шчасліва дажыў да сённяшняга дня. Некаторыя гарадкі захавалі сухі закон яшчэ і зараз, а ў гасцініцах там спіртное падаюць толькі замежнікам. Аднак дасведчаныя сталічныя грамадзяне, зларадна падміргваючы, зазначаюць, што па невядомых прычынах у гэтых высокамаральных гарадах вельмі шмат дамоў з першымі паверхамі без вокнаў. Як лічыцца, на гэтых першых схаваных паверхах бавяць час за самагонаварэннем і п'янствам.

Спіртное прадаецца выключна ў магазінах дзяржаўнай сеткі "Vinmonopol", — манапольках па-нашаму, — і толькі піва (прычым найчасцей безалкагольнае) можна адшукаць ва універсамах. Арганізавана манапалька выдатна. На ўваходзе ляжаць прыгожыя ілюстраваныя каталогі, якія маляўніча прадстаўляюць яе багатыя запасы. Вы выбіраеце па каталозе жаданую прадукцыю, быццам на антыкварным аўкцыёне (тым больш, што і цана амаль аднолькавая), адрываеце квіток з нумарам на дзіўнаватым аўтамаце, які падобны да тых, што былі раней у нашых аўтобусах, і чакаеце, пакуль ваш нумар не з'явіцца на табло. Скарбніца манапалькі ўліку не паддаецца: тут знойдзецца літаральна ўсё — ад мексіканскай тэкілы да маскоўскай "Сталічнай". Аднак некалькі "але". Па-першае, манапалькі сустракаюцца вельмі рэдка: адна прыкладна на сто тысяч жыхароў. Так, у Осла іх пяцьшэсць.

Такім чынам, трапіўшы ў манапольку, вы прапіхваецеся да памянёнага ўжо аўтамата і адрываеце квіток з нумарам вашай чаргі. Нумар будзе прыемны, верагодна трохзначны, скажам, нешта паміж чатырыста трыццаць і шэсцьсот пятнаццаць. Можна тут і мацюкнуцца, але адразу разумееш: без квіткоў тут пачаліся б нашыя славутыя бойкі ля вінных крамаў часоў Міхаіла Сяргеевіча. Тут жа без чаргі ніхто не лезе, а ўсе дружна лупяцца на табло, дзе змяняюцца выклікаемыя да касы нумары. Займальна і карысна.

Калі вам усё ж такі хапіла часу дастаяцца да запаветнага прылаўка, праверце, ці хопіць вам універсальных сродкаў абмену. Літр нарвежскай гарэлкі каштуе каля сарака долараў, "Абсалют" ці "Маскоўская" пойдзе за сорак пяць, віно — пятнаццаць-дваццаць, лікёр — пад сорак долараў. Нацыянальны ж напітак нарвежцаў, "akevitt" ("аквавіта") вельмі паважаюць і высока ацэньваюць — сорак-пяцьдзесят пяць долараў за літр. Гэта гарэлка, настоеная на садавіне. Вылучаецца, бадай, адзін від аквавіты — L?iten Linie, бо яго пасля належнай вытрымкі, яшчэ грузяць на карабель і адпраўляюць у мора на пяць-шэсць месяцаў: выявілася марская боўтанка робіць смак гарэлкі вельмі адметным.

У цэнах гэтых каля васьмідзесяці працэнтаў займаюць падаткі: дзяржава не хоча, каб грамадзяне пілі, і таму падаражанне ідзе за падаражаннем. І грамадзяне ўжо прывыклі: на вуліцах ніколі не сустрэнеш п'янага, нармальным лічыцца за вечар абмежавацца бакалам віна ці кілішкам каньяку: глыточак гарэлкі ў Осла каштуе прыкладна столькі ж, колькі цэлая яе бутэлька на нашай з вамі радзіме.



ВАКОЛІЦЫ

Так, мы любім родны край,
Горы, фіёрды, цёмны гай,
Мора, вецер адзінокі,
Неба, хмары і аблокі.

Так пачынаецца дзяржаўны гімн Нарвегіі, і вось ужо трэцяе стагоддзе ён дае сілы і надзею нарвежцам, дапамагаючы ім захоўваць бадзёрасць і ўсмешку. Яны любяць і ганарацца сваёй зямлёй, а супраць кожнага слова незадаволеных ці скептыкаў сведчаць натоўпы турыстаў, якія з году ў год лічаць за шчасце трапіць сюды.

Нарвегія — краіна, у якой каля 80 % тэрыторыі займаюць горы, узгоркі і ўзвышанасці. Прырода і людзі не адно тысячагоддзе сумесна апрацоўваюць першабытныя камяні, і зараз турысты едуць "проста паглядзець" на вяршыні, захутаныя ў футра аблокаў, спыніцца пад пырскамі магутных вадаспадаў, прыязджаюць, каб доўга-доўга паднімацца, паўзці ўверх і, нарэшце, адчуць усю веліч свету і мізэрнасць чалавека перад тварам прыроды. Горы ў Нарвегіі немаладыя і невысокія, схілаў стромкіх няма. Але цвёрдая скальная парода часта змяняецца падманліва роўнымі забалочанымі ўчасткамі, дзе лёгка праваліцца да пояса. Хоць і цяжка па гэтых гарах хадзіць, але ніадкуль большай бадзёрасці не прынясеш.

Адзін з любімых атракцыёнаў — горная чыгунка Флом. Гэта дваццаць шэсць кіламетраў рэек паміж Арландам і Лэрдалем на захадзе Нарвегіі, вандраванне па якіх займае ўсяго сорак хвілін у кожны бок. Прыцягваюць жа іншаземцаў перш за ўсё паўтара кіламетра, пераадольваючы якія цягнік узнімаецца на восемдзесят метраў, абвіваючыся змяёю вакол гары.

(Заканчэнне на стар. 14 — 15)

Амбасадар ставіць лаву, пракуратура — шматкроп'е

Надзіва гучна прайшла ў Курапатах цырымонія адкрыцця памятнага знака "Ад амерыканскага народа". Славутая "лава Клінтана", усталяваная ва ўрочышчы падчас візіту ў Беларусь амерыканскага прэзідэнта (1994 г.), нейкі час знаходзілася на рэстаўрацыі пасля пашкоджання невядомымі вандаламі. Пра гэты ганебны ўчынак зараз нагадвае бронзавы вянок і мемарыяльная шыльда, дзе, апроч іншага, адзначана, што знак "адрэстаўраваны і пераўсталяваны амбасадарам ЗША Майклам Козакам. (Усю працу выканаў скульптар Алесь Шатэрнік.). 15 студзеня ўрочышча наведалі не толькі апазіцыйныя палітыкі, якія ў сувязі з падзеямі вакол пашырэння Мінскай кальцавой дарогі тут бывалі неаднойчы, але і прадстаўнікі ўрада на чале з намеснікам міністра замежных спраў Аляксандрам Сычовым. Некаму гэты факт можа падацца ледзь не пакаяннем беларускай дзяржавы перад народам за палітычныя рэпрэсіі 30—40-х гадоў. Здавалася б, пасля згаданай падзеі і нядаўняга афіцыйнага заключэння пракуратуры РБ у справе Курапатаў пастаўлена нарэшце кропка. Аднак такі пункт гледжання нам падаецца наіўным.

Тое, што пошукі так званага "нямецкага следу" масавых расстрэлаў могуць аднавіцца, калі ў тым узнікне палітычная мэтазгоднасць, сведчыць і адказ начальніка аддзела па наглядзе за выкананнем закона ў войсках і на транспарце А.Доўбыша старшыні грамадскага аб'яднання "Дыярыюш" Л.Андросіку. Не адмаўляючы злачыннай ролі НКУС БССР, старшы саветнік юстыцыі паведамляе, што маюцца сведкі, якія сцвярджаюць: расстрэлы праводзіліся і нямецкімі акупантамі. Аднак, маўляў, гэта "немагчыма пацвердзіць аб'ектыўнымі дадзенымі", паколькі "пошукі неабходнай інфармацыі па гэтым пытанні ў архіўных установах РБ і ў Расіі аказаліся безвыніковымі". Пакуль безвыніковымі? Тут варта звярнуць увагу на той факт, што матэрыялы апошняга следства не публікаваліся цалкам і на некаторыя пытанні грамадства дагэтуль не атрымала адказу. Напрыклад, адкуль у шэрагу пахаванняў узяліся нажы, брытвы, залатыя рэчы і г.д? Якія карнікі дапускалі такія хібы: савецкія ці ўсё ж нямецкія? Сумніўна, каб у архівах КДБ не знайшлося адпаведнай інфармацыі на гэты конт. Незразумелым застаецца, чаму не былі задзейнічаны нямецкія калегі і іхняя дакументацыя часоў Трэцяга рэйху? На жаль, у аб'ектыўнасці апошняга следства дае падставу сумняваецца і выснова пракурораў пра значна завышаную колькасць ахвяраў (30 тысяч чалавек). Маўляў, былі арганізаваныя раскопкі 23 меркаваных пахаванняў, а чалавечыя астанкі знойдзеныя толькі ў дзевяці. Аднак згаданыя "ілжэпахаванні" знаходзяцца па-за межамі курапацкіх могілак і на ранейшыя лічбы ніяк не ўплываюць (хіба што іх павялічваюць). Улічваючы вышэйсказанае даводзіцца канстатаваць пытанне: "хто і каго страляў у Курапатах?" прагучыць яшчэ неаднойчы. А паколькі афіцыйныя органы дагэтуль не здолелі ўцямна патлумачыць канфліктуючым бакам грамадства ўсе нюансы справы, новае разбіральніцтва па Курапатах цалкам магчымае. А калі так, то і мемарыяла на месцы масавых пахаванняў давядзецца чакаць яшчэ доўга.

Вадзім ДОЎНАР

"Беларускі гістарычны часопіс", № 6

Завяршальны ў 2001 годзе нумар "БГЧ" багаты на шэраг матэрыялаў. Адкрываецца ён віншаваннем міністра адукацыі РБ П. Брыгадзіна чытачам і калектыву рэдакцыі. Галоўны рэдактар В. Кушнер знаёміць з работай II з'езда настаўнікаў Беларусі ("Рэформа адукацыі набывае новыя якасці"). Змешчаны артыкулы Д. Лука і В. Шайкова "Паходжанне і ранняя гісторыя Полацка (VIII—X стст.)", М. Смяховіча "Метадалагічныя прынцыпы Нікало Макіявелі", В. Кісялёва "Строга сакрэтная аперацыя "Радзіма" (зіма—лета 1941 г.)", С. Маслоўскага "Музеі і музейная справа ў Мінскай вобласці", Т. Лянкевіч "Мінскі абласны краязнаўчы музей", Д. Лаўрыновіча "Дзейнасць Прагрэсіўнага блока ў IV Дзяржаўнай думе", В. Чаропкі "Паходжанне і радавод вялікіх князёў літоўскіх", В. Мянькоўскага "Англа-амерыканская гістарыяграфія палітычнай сістэмы СССР (1980—1990-я гг.)", А. Французава "Казімір Андрэй Ягаўлавіч". Прадстаўлены радзелы "Методыка. Вопыт", "Матэрыялы для ўрокаў", "Для студэнтаў і выкладчыкаў", "Рэцэнзіі".

ПАМЯЦЬ

Можа, прыдадуцца для "Хмаркі"?

Наша мінулае бездзяржаўе дазволіла расцягнуць па розных народах і краінах шматлікія таленты і слынныя імёны.

Возьмем кампазітара Мечыслава Карловіча (1876—1909). Да нядаўняга часу яго лічылі польскім. Пасля пачалі называць беларуска-польскім кампазітарам. Такое азначэнне яшчэ куды ні ішло.

Нарадзіўся М. Карловіч у Вішневе колішняга Свянцянскага павета. Ягонае маленства праходзіла на вачах слыннага песняра Францішка Багушэвіча. Такі кранальны абразок пакінуў ён з часу маленства Карловічавых дзяцей:

"Паважаны і ласкавы пане! Вось цяпер я пазнаёміўся з усёй панскай сям'ёю! Чароўнае ўражанне робяць хлопчыкі! З малодшым інфантам я быў на Замкавай гары, у Батанічным садзе; аглядалі Вільню з гары, бо абысці ўвесь горад не было часу. Распавядаў мне пра свае паштовыя намеры. Ага, яшчэ былі мы на гімнастыцы, стралялі па мішэнях. Мілы хлопчык, нейкі мяккі ў рухах, лагодны, як яго бацька".

Францішак Багушэвіч

Мечыслаў Карловіч

Гэтая згадка пра Мечыслава 1887 года. Яму было адзінаццаць гадкоў. Характарыстыкі Ф. Багушэвіча кранаюць: "Мілы хлопчык, нейкі мяккі ў рухах, лагодны, як яго бацька". Гэта дазваляе адчуць, наколькі хлопчык быў мяккі і далікатны, калі іграў на фартэпіяна ці піяніна. Ф. Багушэвіч інтуітыўна адчуваў, што з яго прарасце таленавіты музыка. І гэта цешыла песняру душу. У яго самога расла дачушка. Яна была Мечыславава равесніца, таксама мела схільнасці да музыкі, спеваў. Усё гэта нейкім чынам лагодзіла Ф. Багушэвіча, стварала добры настрой, спрыяла цэлы дзень быць у гуморы, вандраваць па Вільні. Вунь колькі ён усяго абышоў з малодшым Карловічавым інфантам! Пабылі на Замкавай гары, у Батанічным садзе, зазірнулі на гімнастыку, стралялі па мішэнях! Думаецца, побач з Карловічавымі дзецьмі была і паэтава дачка Канстанцыя! А як жа інакш! Які бацька не скарыстае нагоду, каб не ўзяць з сабою дзіця на вандроўку, калі і сам вандруе ды яшчэ з дзецьмі такой шанаванай сям'і.

Не паспеў агледзецца Мацей Бурачок, як Мечыслаў стаў дзецюком, знаным у краі музыкам, скрыпачом. Аднаго разу Францішак Багушэвіч наважыў-

Рамантык з пэндзлем і сахаром

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 13)

Яшчэ адна славутасць Нарвегіі — гэта фіёрды. Нягледзячы на тое, што значная частка тэрыторыі краіны ляжыць за Палярным кругам, мора ля яе берагоў не замярзае. Гэта дазваляе караблям з турыстамі амаль цэлы год вандраваць ля ўзбярэжжа, а іх пасажырам любавацца на сапраўдны цуд прыроды — нарвежскія фіёрды. Скалы тут стромка ўздымаюцца на дзесяткі метраў над морам, смарагдавую паверхню якога прарэзваюць шматлікія плыні і патокі з гор. Буйныя круізныя кампаніі арганізуюць на тыдзень ці два паездкі вакол Нарвегіі з заходам у Ісландыю ці нават у Грэнландыю, але больш звыклымі застаюцца аднадзённыя экскурсіі.

Мне ж асабіста найбольш спадабаліся нарвежскія паромы: вандраванне на іх не адніме ні шмат часу — рэдка больш за гадзіну, — ні шмат грошай — у межах дзесяці долараў. А задавальненне атрымліваеш незвычайнае.

І нарэшце зазначыў, што летась Нарвегію наведала каля трох мільёнаў турыстаў, — пры чатырох з паловай мільёнах уласнага насельніцтва. На Беларусі ў мінулым годзе пабывала... каля дваццаці пяці... тысяч іншаземцаў, — пры насельніцтве самі ведаеце якім.

ЛЮДЗІ І НОРАВЫ

Нарвегія па тэрыторыі пераўзыходзіць Беларусь амаль у два разы, а насельніцтва мае ўсяго чатыры з паловай мільёны чалавек. Каля 98% жыхароў краіны — нарвежцы, на поўначы жывуць невялікія кампактныя групы саамі і фінаў (прыкладна 40 тысяч). Гарадоў тут няшмат, ды і тыя, нават па беларускіх мерках зусім невялікія.

Як мне падалося, нарвежцы — прастадушны і адкрыты народ. Калі нарвежац, запрашаючы ў госці, кажа вам: "Прыходзьце ў любы дзень, як будзе зручна", гэта значыць, што ён сапраўды заўсёды вас рады бачыць. Заднія думкі — гэта не пра нарвежца.

Такой жа адкрытасці яны чакаюць і ад партнёраў па бізнесе, любая крывадушнасць ці мана адразу адпрэчваюцца. Таму няварта, бадай, везці занадта каштоўныя "сувеніры", мэта якіх будзе прасвечваць праз залатую абгортку. Якія б выдатныя адносіны не ўсталёўваліся ў вольны час паміж нарвежцамі, на працы яны забываюцца на іх. Калі для нас досыць натуральным будзе спецыфічнае стаўленне да сябра ці сваяка на службе, нарвежац выканае свой абавязак аднолькава для ўсіх грамадзян, аднолькава, але выдатна, на вышэйшым узроўні.

Далікатнасць, шчодрасць і гасціннасць неаднойчы прымушалі мяне ўзгадваць нашую стандартную ацэнку скандынаваў як "пахмурных троляў сучаснасці". Ці так гэта? Ну хто, скажыце, у нас прыйдзе да нейкіх наймітаў і будзе гадзіну на каленях поўзаць, дапамагаючы распальваць печку? Хто дасць сваю машыну і тры месяцы дзень за днём пусціць глядзець свой відэамагнітафон? А яшчэ і пытацца: "А можа, чаю, хлопцы, хочаце?"

Гумар там разумеюць і цэняць. Нарвежцы ўмеюць жартаваць і любяць гумарыстычныя перадачы, ахвотна расказваюць анекдоты пра сябе, але, вядома, больш любяць пра фінаў і шведаў — адвечных суседзяў-сапернікаў.

Нарвежцы вельмі любяць пагаварыць. Каля 99 % насельніцтва Нарвегіі пісьменныя, а дванаццацігадовая адукацыя становіцца абавязковай. Дадамо яшчэ, што вышэйшая адукацыя бясплатная, калі ж малады чалавек вырашае запісацца на сельскагаспадарчае аддзяленне — ільготы пералічыць становіцца цяжка. Нарвежцы любяць вандраваць па свеце і знаёміцца з іншымі краінамі па кніжках. Чытаюць яны шмат, і бібліятэкі маюць выдатныя фонды. Дзякуй богу, час для чытання ёсць: рабочы тыдзень — трыццаць сем з паловай гадзін, а калі застаешся пасля працы — значыць, не спраўляешся з абавязкамі.

НАРВЕГІЯ НА КОЛАХ

Машыну тут любяць і імкнуцца набыць як мага раней. Вадзіцельскія правы выдаюць з васемнаццаці гадоў, але ездзіць пачынаюць ужо ў дзесяць — адзінаццаць, прычым і хлопцы, і дзяўчаты. Таму два-тры аўтамабілі ў сям'і — з'ява звычайная: па статыстыцы ў Нарвегіі каля двух мільёнаў легкавушак.

Але нарвежскаму ўраду такая сітуацыя, відаць, не падабаецца: кожны год ён павышае падаткі на аўтамабілі, дарогі, паліва, павялічвае мытныя зборы. Машыны ў Нарвегіі — адны з самых дарагіх у свеце, цэны тут разы ў тры вышэйшыя за беларускія, таму многія (ну, зусім як у нас) ездзяць купляць іх у Германію ці Галандыю. Літр бензіну, каштуе амаль адзін амерыканскі долар, а саляркі — каля дзевяноста цэнтаў.

Японскія аўтамабілі займаюць самыя моцныя пазіцыі на мясцовым рынку: каля 55 % прададзеных у мінулым годзе аўтамабіляў прыйшлі з Японіі. Гэта і "Таёта", і "Нісан", і "Хонда", і многія іншыя. Любяць нарвежцы і надзейныя "Вольву" з суседняй Швецыі, шмат тут "Аўдзі" і "Мерсэдэсаў", а апошнім часам, з-за дарагога бензіну, усё больш папулярным становіцца "Фольксваген". Амерыканцаў тут не вельмі шануюць, хоць "Форд" знайсці няцяжка. З савецкіх аўтамабіляў найбольш вядомы ВАЗ ("Лада"), але прыхільнікаў яго вы наўрад ці знойдзеце.

Асаблівая гаворка пра дарогі. Тут, звычайна праз нейкіх шэсцьдзесят метраў — ці паварот, ці спуск, або мост, тунель ці яшчэ якая «забава». Дарогі будаваліся даўно, і разлічаныя яны ў асноўным на гужавы транспарт. І таму зараз, хоць пакрыццё і выдатнае і дагледжанае, заўсёды напружана ўглядаешся наперад і з жахам даеш убок перад сустрэчнай фурай ці аўтобусам. Кюветаў тут няма, толькі скала ці абрыў, а дарога вузенькая-вузенькая. Іхнія магістралі (асабліва ў заходняй частцы краіны) у нас называюць трохі інакш — дарога з аднабаковым рухам.

Затое нарвежскі вадзіцель заўсёды ўважлівы і натрэніраваны, і ніколі не спіць за рулём.

МОВА

Нарвежская мова разам з дацкай, шведскай, ісландскай і фарэрскай уваходзіць у паўночна-германскую групу індаеўрапейскіх моў. Пісьменнасць на ёй вядомая з IX стагоддзя. З-за уній з Даніяй і Швецыяй мясцовае насельніцтва доўга не мела агульнанацыянальнага сродку зносін, а захоўвала свае дыялекты, якія ў большай ці меншай ступені падпадалі пад уплыў магутных суседзяў. Нарвежцы, шведы і датчане без праблем разумеюць адзін аднаго. Розніца, як мне тлумачылі, у тым, што нарвежцу лягчэй размаўляць з датчанінам, чым са шведам. А вось чытаць нарвежцам лягчэй па-шведску, чым па-дацку.

У 1380 годзе Нарвегія аб'ядналася з Даніяй, і дацкая мова стала афіцыйнай мовай Нарвегіі. Надышла "чатырохсотгадовая ноч", — як ацэньваюць той перыяд зараз у Осла. Аднак увесь гэты час вуснай, размоўнай моваю заставалася мясцовая. Саюз з Даніяй перапыніўся ў 1814 годзе, тады ж была прынята першая канстытуцыя. Тым не менш дацкая мова заставалася адзінай пісьмовай мовай, што не падабалася многім нарвежцам.

Заслуга ў стварэнні новай нарвежскай пісьмовай мовы належыць перш за ўсё Хенрыку Вергелянду і Айвару Осэну. Толькі рабілі

ся прапанаваць маладому музыку колькі сваіх твораў, каб той прыкінуў іх на якуюсь мелодыю. Пра гэты яго намер захаваўся ліст. Датуецца ён 25-ым сакавіком (6.04.1896 года). Юнаму музыканту было ўжо дваццаць гадоў. "У вялікую суботу вярнуўся з Дрэздэна, быў у Берліне 3 сутак; шукаў п. Мечыслава, праз пасыльнага знайшоў кватэру, але яго не было дома... Калі пан Мечыслаў яшчэ ў Варшаве, — дасылаю яму сведчанне мае пашаны і павагі, а таксама прыкладаю дзве беларускія народныя песенькі з такімі матывамі, як мне далі: можа, яны прыдадуцца для "Хмаркі".

Гэтак Ф. Багушэвіч скіраваў маладога кампазітара ў беларускае рэчышча, ладзіў з ім творчае супрацоўніцтва.

У 1896 годзе Мечыслаў вучыўся ў Берлінскім універсітэце, куды паступіў у 1895 годзе. Гэтай парой Ф. Багушэвіч і прапанаваў юнаму музыку напісаць мелодыю на верш "Хмаркі". Прыслаў М. Карловічу колькі беларускіх мелодый і два аўтографы свайго верша: адзін — у арыгінале, другі — у перакладзе на польскую мову. Арыгінал быў перапісаны рукою песняровай дачкі Туні, пераклад — самім аўтарам. Такое творчае спалучэнне было памкненнем Ф. Багушэвіча зблізіць сваю дачку з маладым кампазітарам. А Туня той парою таксама вучылася музыцы і спевам у Нямеччыне.

Бясспрэчна, творчых і сяброўскіх повязяў між Ф. Багушэвічам і ягонай сям'ёй з М. Карловічам было значна больш, чым мы ведаем. Але досыць і гэтых, каб іхнія імёны ставіліся побач у нашых энцыклапедыях, даведніках. Гэтага, на жаль, пакуль няма. А ў тым, што М. Карловіч у сваіх творах скарыстоўваў беларускія фальклорныя тэмы мелодый, ёсць, безумоўна, уплыў і аўтара "Дудкі Беларускай".

Уладзімір СОДАЛЬ

яны гэта па-рознаму: Хенрык Вергелянд, вядомы паэт, лічыў, што нарвежцам трэба не адразу парываць з дацкай, а паступова ўводзіць новыя словы, выразы, звароты. Так узнік букмол — кніжны стандарт. Вось сёння датчане і жартуюць, што букмол — гэта дацкая з памылкамі.

Айвар Осэн быў больш радыкальны. Ён доўга вывучаў паўночна-германскія дыялекты і свой варыянт (ансмо) заснаваў на прастамоўі і дыялектах. Мадэрнізаваны, "акультураны" ансмо атрымаў назву нінорск ("новая нарвежская мова"). Адрозненні паміж букмолам і нінорскам невялікія, лексікон у іх агульны, а дыферэнцыяцыя адбываецца ў марфалогіі і фанетыцы.

У Нарвегіі існуе і некалькі іншых формаў нацыянальнай мовы — гэта самнорск ("пан-нарвежскі") і рыксмол ("агульны стандарт").

Неаднойчы праводзіліся апытанні, рэферэндумы, вяліся шматлікія даследаванні і дыскусіі, як жа ў рэшце рэшт трэба размаўляць, чаму вучыць дзяцей. Адно з найбольш вядомых і вырашальных апытанняў прайшло ў 1968 годзе. Рэспандэнтам прапанавалі тры аднолькавыя тэксты — адзін на нінорску, другі на букмоле, трэці на рыксмоле — і папрасілі выбраць найбольш прыемны і пажаданы для іх дзяцей. Вынік быў такі: 52 % выказаліся за рыксмол, 31 % за букмол, 10 % за нінорск і 7 % не змаглі вызначыцца.

Барацьба паміж прыхільнікамі розных варыянтаў працягваецца і зараз. У той жа час урад і акадэмія навук імкнуцца праводзіць мэтанакіраванае зблізжэнне ўсіх трох формаў, якое, аднак, і зараз яшчэ ўскладняецца прыхільнасцю многіх нарвежцаў да родных дыялектаў. Між тым іншаземцу палохацца няма чаго: для чужога вуха адрозненні гэтыя амаль незаўважныя, у паўсядзённым жыцці неістотныя. Да таго ж большасць з традыцыйнай ветлівасцю стараецца прынаравіць сваё вымаўленне да вымаўлення і асаблівасцей мовы суразмоўцы, асабліва калі той — замежнік, які імкнецца, хай не вельмі паспяхова, размаўляць па-нарвежску.

І яшчэ адно сведчанне незвычайнасці гэтых вялікіх дзяцей вікінгаў. Калі іншаземец (не жыхар Скандынавіі) не разумее па-нарвежску, гэта чыноўнік, а не мы з вамі, павінен прыкласці ўсе намаганні, знайсці перакладчыка ці на пальцах вытлумачыць, толькі адказ павінен дайсці да наведвальніка!

Увогуле ж нарвежцы разумеюць, што іх мова сусветнай ніколі не стане, таму старанна вучацца. Расце цікавасць да моў замежных: нямецкай, французскай, кітайскай, японскай, амаль кожны валодае англійскай, у той ці іншай, зразумела, ступені.

Мікіта СУПРУНЧУК

Уладзімір КУЗЬМЯНКОЎ

29 студзеня 2002 года на шэсцьдзесят шостым годзе жыцця памёр пісьменнік, навуковец Уладзімір Іванавіч Кузьмянкоў.

Уладзімір Іванавіч нарадзіўся 27 чэрвеня 1936 года ў вёсцы Успеннае Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям,і. Пасля заканчэння сярэдняй школы (1955г.) працаваў у калгасе, з 1955 па 1957 год служыў у Савецкай Арміі. Пасля дэмабілізацыі працаваў адказным сакратаром Казлоўшчынскай раённай газеты «Сцяг перамогі». Вучыўся на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, потым працаваў у газетах «Чырвоная змена», «Звязда», «Настаўніцкая газета», у часопісе «Беларуская мова і літаратура ў школе».

З 1966 года Уладзімір Іванавіч Кузьмянкоў выступае ў друку з апавяданнямі, нарысамі, аповесцямі. У хуткім часе свет пабачылі кніга «Ішла вясна» і іншыя творы.

Актыўная грамадская пазіцыя, высокая прафесійная адказнасць, душэўная прыязнасць і любоў да людзей заўсёды вызначалі Уладзіміра Іванавіча.

Ён сапраўдны сын беларускага народа, і светлая памяць аб ім назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах.

Саюз беларускіх пісьменнікаў

АСОБЫ

Калі вучань цалкам адзіны

"Всецело единственный" — так азначыў вядомага этнамузыколага Яўгена Гіпіуса яго настаўнік, стваральнік інтанацыйнай тэорыі акадэмік Б. Асаф'еў. Такая характарыстыка ні ў якім разе не датычыцца колькаснага боку. Асаф'еўская інтанацыйна-працэсуальная школа налічвае мноства паслядоўнікаў. Але ж, так бы мовіць, мноства — плюс адзіны.

Тамара Якіменка

Быць цалкам адзінай сярод беларускіх музыказнаўцаў-фалькларыстаў, былых вучняў нашай кансерваторскай Настаўніцы Лідзіі Савулаўны Мухарынскай, наканавана прафесару Беларускай акадэміі музыкі Тамары Сямёнаўне Якіменцы. Сягоння, калі, дасягнуўшы ўзросту "заслужанага адпачынку", творчы чалавек схільны падсумоўваць усё ім зробленае (і чым больш творчы, тым больш знаходзіць усё яшчэ няздзейсненага!), гэта становіцца відавочным.

Сапраўды, можна быць прадаўжальнікам свайго настаўніка ў навуковай і выкладчыцкай дзейнасці. Але ці шмат хто здолее трымацца ва ўсім сваім жыцці таго маральнага "катэгарычнага імператыву", якому было падпарадкавана жыццё Лідзіі Савулаўны.

Дзякаваць Богу, цяпер не ўзнікае патрэбы пайсці добраахвотнікам на фронт, як гэта зрабіла пасля заканчэння Маскоўскай кансерваторыі ўжо малады педагог Беларускай кансерваторыі Л. Мухарынская, усю вайну прайшоўшы медсястрой у палкавых шпіталях і медпунктах. Але ж "знак бяды" прысутнічае і ў нібыта мірныя часы, калі такому найвысакароднаму Мастаку слова, як Васіль Быкаў, лепей працуецца і жывецца ў краіне, супраць якой ён ваяваў, чым у сябе на Радзіме, гонарам якой ён з'яўляецца.

Як жа ўтрымаць у абставінах "вялікай дэпрэсіі" нашага сучаснага жыцця тую навуковую і грамадзянскую планку, якая так высока ўзнята нашымі Настаўнікамі — пецярбургскімі вучонымі Я. Гіпіусам, З. Эвальд, Ф. Рубцовым і выдатнымі беларускімі дзеячамі навукі і мастацтва — М, Гарэцкім, Р. Шырмам, Г. Цітовічам, Л. Мухарынскай? І ў абставінах "гетэратопнага скасоўвання і пераварочвання" не страціўшы прафесійнай і чалавечай годнасці, таленту, інтэлекту, нацыянальнай самадастатковасці, імкнуцца данесці беларускую прысутнасць у сучасную еўрапейскую этнамузыкалагічную навуку?

Кожны з нас шукае ў гэтых абставінах свае механізмы ўнутранай самаабароны. Для Т. Якіменкі гэта ў значнай меры — цвёрды маральны стрыжань і непахісная інтэлігентнасць нашай Настаўніцы.

Можна захапляцца, нават здзіўляцца, як гэта ўдаецца Тамары Сямёнаўне — так бездакорна па высокім кошце трымаць і асабістую навуковую дзейнасць, і падрыхтоўку маладых спецыялістаў, і навукова-арганізацыйную работу, і творчыя кантакты з калегамі розных навукова-даследчых і вучэбных устаноў.

Прынцыповай вяхой у беларускай этнамузыкалагічнай навуцы і вучэбнай практыцы сталася створаная Т. Якіменкай у Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі (цяпер Акадэміі музыкі) на пачатку 90-х, адраджэнскіх, гадоў кафедра беларускай музыкі. Тут этнамузыкалогія зрабілася ўрэшце прафілюючай дысцыплінай — з часу выпуску падрыхтаваных ёю магістраў этнамузыкалогіі.

Ажыццяўленнем шматгадовай мары Л. Мухарынскай стаўся таксама вучэбны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых музычных навучальных устаноў "Беларуская народная музычная творчасць", падрыхтаваны на аснове захаваных рукапісных работ Лідзіі Савулаўны і ўласнай працы Т. Якіменкі. Кніга выйшла ў 1993 г. у выдавецтве "вышэйшая школа", пазначаная адпаведна двума аўтарамі. У чатырох раздзелах дапаможніка, прысвечаных ранне- і познетрадыцыйнай класіцы, песням змагання XIX — пач. XX ст., наватворчасці савецкага перыяду (у тым ліку знакамітай партызанскай творчасці), паслядоўна раскрыты адметныя асаблівасці беларускага музычнага фальклору, яго месца ў музычнай культуры славян, паказаны працэс гістарычнага развіцця як самой народнай мастацкай традыцыі, так і яе навуковага асэнсавання.

Пэўным этапам у творчым жыцці не толькі Беларускай акадэміі музыкі сталіся заснаваныя Тамарай Якіменкай штогадовыя навуковыя чытанні памяці Л. Мухарынскай, лік якіх на сягоння дасягнуў ужо дзесяці. У прадмове да аднаго са зборнікаў, што сістэматычна друкуюцца паводле дакладаў прадстаўленых на Чытаннях, іх заснавальніца і рэдактар зазначае: "Пры камернасці жанравага профілю і разнапланавасці тэматыкі ёсць у Чытаннях цэментуючы іх стрыжань унутранай адпаведнасці даследчым памкненням Мухарынскай, кірунку яе навуковых роздумаў і колу творчых ідэй". Перш за ўсё гэта "гістарызм і інтанацыйнасць падыходу да вывучэння з'яў музычнай творчасці і культуры" ("Музычная культура Беларусі: пошукі і знаходкі". Мн., 1998).

Для маладых спецыялістаў навуковыя чытанні памяці Л. Мухарынскай адкрылі значныя магчымасці для творчага ўзлёту. Асабліва ў 1996 г., калі да 90-годдзя з дня нараджэння Настаўніцы ў сценах Беларускай акадэміі музыкі адбылася Міжнародная навуковая канферэнцыя "Славянская этнамузыкалогія: Напрамкі. Метады. Канцэпцыі", дзе маладыя этнамузыколагі (аспіранты і студэнты) мелі магчымасць выступіць з дакладамі і паўдзельнічаць у абмеркаваннях разам з вядомымі, знакамітымі вучонымі: доктарам мастацтвазнаўства Соф'яй Грыца (Кіеў), доктарам філасофскіх навук Уладзімірам Конанам (Мінск), доктарам мастацтвазнаўства Ігарам Мацієўскім (С.-Пецярбург), этнамузыколагам і культуролагам, прафесарам Любінкам Мількавічам (Бялград), вучоным сакратаром Дзяржаўнага інстытута мастацтвазнаўства Вольгай Пашынай (Масква), прафесарам Інстытута музыкалогіі Аннай Чаканоўскай (Варшава), загадчыкам лабараторыі этнамузыкалогіі Музея Чалавека. доктарам Тран Куанг Хай (Парыж).

Атмасферы высокай духоўнасці спрыяюць і творчыя кантакты Т. Якіменкі з калегамі і вучнямі, і яе ўласная навуковая дзейнасць.

Глыбокі гістарызм яе работ, што налічваюць больш за паўсотню публікацый, знаходзіць свой адбітак і ў яе "прачытанні літаратуры", пазбаўленага нават ценю таго хапальнага інстынкту, які так распаўсюдзіўся цяпер у "серыйнай вытворчасці" кандыдатаў і дактароў, прывучаных хвацка кампіляваць чужыя думкі, звычайна ў спрошчаным выглядзе.

Як і ў Л. Мухарынскай, у творчым жыцці Тамары Сямёнаўны важнае месца займаюць водгукі і рэцэнзаванні навуковых работ. У гэтым яна заўсёды дае волю роздуму, нібы вядзе дыялог з аўтарам па ўзнятых праблемах. Так, ацэньваючы аўтарскія (З. Мажэйкі і Т. Варфаламеевай) аналітычныя зборнікі, прысвечаныя песеннай культуры Палесся, Паазер'я, Панямоння, Падняпроўя, як курс, узяты на сістэмнае раскрыццё ўсёй прасторы мелагеаграфічнага ландшафту Беларусі, яна разважае ўжо і пра перспектывы этнамузыкалагічных даследаванняў у новым, XXI ст. — пра выхад на ўзровень тыпалагічных універсаліяў традыцыйнай песеннай культуры, пра раскрыццё наддыялектных і надрэгіянальных яе феноменаў.

Як і ў кожнага сапраўднага вучонага, у Т. Якіменкі — свой непаўторны творчы дар, які лучыць нібы два полюсы навуковага бачання: неабсяжнасць сістэмнага асэнсавання і аналітычную тонкасць, часам на ўзроўні амаль няўлоўных нюансаў. Дзякуючы гэтаму ёй падуладныя і ахоп сістэмнай цэласнасці беларускага песеннага фальклору, і арыентацыя ў песенным стылі "такой ступені размытасці і несфакусаванасці", якая "бянтэжыла навукоўцаў (тэарэтыкаў і сістэмных збіральнікаў-практыкаў) няпэўнасцю і таму — незразумеласцю сваёй музычна-стылявой арыентацыі" ("Музычная культура Беларусі: праблемы гісторыі і тэорыі". Мн., 1998).

Такая музычна-стылявая размытасць, несфакусаванасць мае месца ў песеннай традыцыі Панямоння, якая ў даследаванні Т. Варфаламеевай высока ацэнена Т. Якіменкай, і (з дабаўленнем музычна-жанравага разгрупавання, гістарычнай шматпластавасці) у характары беларускай балады, якую Тамара Сямёнаўна даследуе з часоў кандыдацкай дысертацыі. Яе публікацыі па гэтай праблематыцы дазваляюць меркаваць, што пасля завяршэння даследавання на доктарскім узроўні ў беларускай этнамузыкалагічнай думцы не толькі праясніцца сістэма лірыка-эпічнай плыні народнай традыцыі, але і пазначыцца яшчэ адзін крок да пасціжэння нацыянальнай ментальнасці праз усепранікальную эпічную стрыманасць песнятворчасці.

Хутчэйшая абарона работы такога кшталту — найпершае пажаданне Тамары Сямёнаўны Якіменцы з нагоды яе "двойчы выдатнай" даты ў дзень народзінаў.

Зінаіда МАЖЭЙКА,
вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

Суфлёр

ПАДКАЗКІ—АНОНСЫ—ПАРАДЫ АД "ЛіМа"

Бібліятэка

Нягледзячы на імклівае пранікненне ў сённяшні дзень найноўшых інфармацыйных тэхналогій, усеагульную камп'ютэрызацыю і ўсё больш шырокае распаўсюджванне Інтэрнета, для многіх з нас кніга застаецца галоўнай крыніцай атрымання ведаў — добрым, старым сябрам на непрадказальных жыццёвых пуцявінах. Так ужо атрымалася, што зараз набыццё добрай якаснай кнігі з'яўляецца пэўнай праблемай, галоўным чынам праблемай матэрыяльнай. І тут неацэнную дапамогу можа аказаць бібліятэка. З сённяшняга нумара наша газета адкрывае новую рубрыку "Бібліятэка", у якой мы будзем знаёміць сваіх чытачоў з новымі і найбольш цікавымі паступленнямі ў аддзел мастацтва Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь.

Кніга Алены Яскевіч "Падзвіжнікі і іх святыні" — пра духоўную культуру старажытнай Беларусі. Выйшла яна ў выдавецтве "Полымя". Выданне знаёміць чытача з айчыннымі цудадзейнымі іконамі Прасвятой Троіцы, Збаўцы Хрыста, Божай Маці, анёльскіх чыноў і сабораў святых, яўленымі для падтрымкі нацыі на працягу ўсёй гісторыі існавання не толькі на спрадвечных беларускіх землях, але і на этнічнароднасных тэрыторыях.

"Слоўнік тэрмінаў" Барыса Лазукі тычыцца архітэктуры, выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і выйшаў у выдавецтве "Беларусь". У слоўніку прыведзена каля 800 тэрмінаў, кожны з якіх суправаджае кароткае тлумачэнне названай з'явы, паняцця, прадмета. Тэрміны, якія з'яўляюцца запазычаннямі з іншых моў, суправаджае этымалагічная даведка. Слоўнік ілюстраваны каляровымі і чорна-белымі здымкамі, малюнкамі, чарцяжамі. Кніга разлічана на вучняў агульнаадукацыйных школ і школ з мастацкім ухілам, студэнтаў, выкладчыкаў, настаўнікаў, а таксама мастацтвазнаўцаў, гісторыкаў, этнографаў, на шырокае кола чытачоў.

Альбом Святланы Гнутковай "Крыжы. Іконы. Складні" упершыню апісвае калекцыю меднага мастацкага ліцця з Цэнтральнага музея старажытнарускай культуры і мастацтва імя Андрэя Рублёва. У альбом уключаны 249 помнікаў меднага мастацкага ліцця XI — пачатку XX стагоддзя.

Даследаванне Алега Трусава "Манументальнае дойлідства Беларусі XI—XVIII стагоддзяў" распавядае пра гісторыю будаўнічай тэхнікі на Беларусі і выдадзена ТАА "Лекцыя". У кнізе ўпершыню падаецца падрабязная характарыстыка ўзнікнення і развіцця мясцовых будаўнічых матэрыялаў, асвятляецца арганізацыя ў сярэднявеччы будаўнічай працы, прасочваецца эвалюцыя будаўнічых канструкцый і малых архітэктурных формаў. Выданне праілюстравана арыгінальнымі фотаздымкамі і адрасавана архітэктарам, археолагам, этнографам, мастацтвазнаўцам, рэстаўратарам, музейным работнікам.

Выдавецтва БДУ выдала кнігу Аляксандра Гужалоўскага "Нараджэнне беларускага музея". Яна расказвае пра ўзнікненне музейнай справы на Беларусі ў дакастрычніцкі перыяд. На аснове шматлікага дакументальнага матэрыялу і гістарычнай літаратуры разглядаецца і аналізуецца працэс стварэння і дзейнасці розных музейных устаноў Беларусі. Адрасуецца кніга навуковым супрацоўнікам музеяў і студэнтам, якія спецыялізуюцца ў галіне музеялогіі і аховы помнікаў гісторыі і культуры, а таксама ўсім зацікаўленым.

Альбом "Беларускія мастакі ў замежжы" засведчыў правядзенне 25-ці штогадовых выстаў беларускага мастацтва і народных вырабаў у Беларускім Грамадзянскім Цэнтры ў Саўт-Рыверы (ЗША). Уступны артыкул да выдання напісаў Янка Запруднік. Тлумачальны тэкст падаецца на беларускай і англійскай мовах.

Са старонак кнігі Алеся Станюты "Жыццё актрысы" паўстае незабыўны вобраз вядомай актрысы тэатра і кіно Стэфаніі Станюты, якая ў дыялогах з сынам-пісьменнікам расказвае пра свой творчы і жыццёвы шлях.

Чацвёрты том гістарычна-этнаграфічнага даследавання "Беларусы", які называецца "Вытокі і этнічнае развіццё", падрыхтаваны Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН РБ. Том прысвечаны навуковаму аналізу праблем паходжання і этнічнага развіцця беларускага народа, яго вытокаў, каранёў, змен, якія адбываліся ў яго культуры на працягу стагоддзяў.

Пабачыў свет буклет "Архітэктурныя помнікі Полацка", які падрыхтавала і склала Т. А. Джумантаева, а выпусціла выдавецтва "Беларусь". У буклеце фотаздымкі Сафійскага сабора, Спаса-Праабражэнскай царквы, Богаяўленскага сабора, Крыжаўзвіжанскай царквы, даецца кароткі агляд гісторыі Полацкага дойлідства на беларускай, рускай і англійскай мовах.

"Віцебск. Жыццё мастацтва, 1917—1922", — кніга Аляксандры Шацкіх асвятляе адзін з самых паказальных феноменаў XX стагоддзя, вядомы ў айчыннай гісторыі як "віцебскі рэнесанс". У 1917—1922 гадах жыццё гэтага правінцыяльнага горада было звязана з імёнамі Марка Шагала, Казіміра Малевіча, Эля Лісіцкага, Міхаіла Бахціна, Мікалая Малько і многіх іншых. Аналіз віцебскага перыяду ў творчасці выдатных дзеячаў мастацтва спалучаецца ў кнізе з узнаўленнем шырокай панарамы творчых падзей у Віцебску паслярэвалюцыйных гадоў.

Цікавым уяўляецца ілюстраваны даведнік "Антыкварыят. Срэбра і фарфор", выдадзены ў расійскім выдавецтве "Эгмонт". Гэта пераклад з англійскай кнігі Ціма Форэста. У ёй змешчаны падрабязныя звесткі пра значную колькасць прадметаў сталовага посуду: фарфоравыя аксесуары, падносы і талеркі, сярэбраныя кафейнікі і чайнікі. Альбом уключае больш як 4000 каляровых фотаздымкаў і чорна-белых ілюстрацый.

Серыю маскоўскага выдавецтва "Веча", якое распачало серыю "Сто вялікіх", працягвае кніга "100 вялікіх палацаў свету", што знаёміць чытачоў з такімі шэдэўрамі сусветнай архітэктуры, як палац цара Саламона, "Залаты дом" Нерона, Віндзорскі замак, замак графа Дракулы, фантаны Версаля, Царскі палац у Лівадыі, Зімні палац...

Маскоўскі выдавецкі цэнтр "Акадэмія" выдаў дапаможнік "Слоўнік па сусветнай мастацкай культуры", складзены Таццянай Грушавіцкай. У ім змешчаны артыкулы пра найбольш вядомыя помнікі сусветнай мастацкай культуры, агляд асноўных мастацкіх стыляў і жанраў усіх відаў мастацтва, біяграфічныя звесткі пра жыццё і творчасць вядомых мастакоў, скульптараў, архітэктараў, музыкантаў, пісьменнікаў.

Падрыхтавала Наталля МАТУСЕВІЧ

"Браты Блюз-2002" граюць у Беларусі

Не верыцца, але з таго моманту, калі мы з журналістам Вітаўтам Мартыненкам наладзілі сустрэчу былога вакаліста "Бонды" Ігара Варашкевіча і маладых музыкаў гурта "Рокіс" на пляцы Перамогі, прайшло ўжо дзесяць гадоў! Менавіта з гэтага часу можна лічыць і пачаліся іх сумесныя рэпетыцыі, а затым і сам легендарны беларускі рок-гурт "Крама", які не так даўно адзначыў сваё дзесяцігоддзе выданнем альбома "Хавайся ў бульбу" і яго ўдарнай прэзентацыяй на сцэне аднаго з мінскіх канцэртных залаў.

Але да гэтай падзеі была перамога на расійскім рок-фестывалі "Поколение", а таксама званне першых беларускіх "Рок-каралёў", запіс цудоўных альбомаў "Хворы на рок-н-рол", "Гэй, там, налівай", "Што дапаможа нам", выданне на брытанскай фірме RTX-records першага беларускага кампакт-дыска "Гарэлка і лёд", на якім "крамчукі" прадставілі свае рытм-энд-блюзавыя хіты для еўрапейскага слухача...

І, як бывае ў сапраўдных артыстаў, поспехі гурта "Крама" і яго лідэра Ігара Варашкевіча змяняліся няўдачамі, крызісамі, расчараваннямі... Але мы ведаем, што гісторыя творыцца, менавіта, з высілкаў.

...Яшчэ адно захапленне жыцця Ігара Варашкевіча і ўсіх "крамчукоў" — музыка блюз і рытм-энд-блюз, якая сілкуе іх жыццёвай энергіяй, вяртае аптымістычны погляд, надае жыццю хоць нейкі экзістэнцыяльны сэнс. Музыкі, быццам тыя героі культавага музычнага фільма "Браты Блюз-2000)", не ўяўляюць сябе без блюзавага ладу ў музыцы і ў жыцці. І ўслед за героямі гэтай стужкі беларускія музыкі таксама могуць паўтарыць: "Ні адно зелле на свеце на дае такой асалоды, якую атрымліваеш, калі граеш у гурце, калі ўсе людзі навокал таньчаць, крычаць, калі ўся зала "ўзрываецца" ад апладысментаў".

Менавіта аматарам блюзу была адрасавана прэм'ера ў ДК МТЗ новага сумеснага рэліза BMA-group і "Бульба-рэкардз" — кампакт-дыска з альбомам гурта "Крама" з ідэяматычнай назвай "Хавайся ў бульбу".

Новая кружэлка — традыцыйная ў тым сэнсе, што слухачам прапануе і рытм-энд-блюзавыя песні, якія з цягам часу стануць прызнанымі хітамі ў рэпертуары гурта, мінорныя блюзавыя песні-роздумы, каверы ўжо вядомых песень...

Да першага патоку трэба аднесці ўжо добра раскручаны хіт "Сябра мой Вярэніч Лёнік", які Ігарам Варашкевічам быў прысвечаны гэтаму вядомаму беларускаму інструменталісту — настаўніку многіх лепшых беларускіх гітарыстаў. Л. Вярэніч на канцэрце-прэзентацыі не толькі назваў творчасць "Крамы" музыкай высокага кшталту, але і сам выканаў некалькі віртуозных гітарных уставак-сола ў тым жа духу.

Рытм-энд-блюзавы сэт на дыску лагічна працягваецца галоўнай іранічнай песняй "Хавайся ў бульбу". "Мы не камандас, мы — партызаны. Мы маем бульбу, а не банаы!" У ёй рытм-энд-блюзавая на мяжы з лацін-рокам структура падкрэслена імклівымі партыямі пакуль экзатычнай для беларускіх музыкаў steel-гітары.

Традыцыйная старонка рэліза — каверы ўжо вядомых твораў "Дай мне шанец", "Стары сабака", антыалкагольнай песні "Гэй там, налівай". Адрозніваюцца новыя версіі большай інструментальнай дасканаласцю, і, як ні парадаксальна, адкрыццём новых сэнсавых адценняў сваіх твораў. Ну кампазіцыя "Свабоды мне дай" можа лічыцца пэўным адказам Славу Кораню, "Улісу" і іх рок-гімну "Радыё Свабода". Што ж, можна канстатаваць, што тэма свабоды — адна з дамінуючых у творчасці рок-музыкантаў усяго свету.

Блюзавая тэматыка заўсёды хвалявала музыкантаў гурта "Крама": яны заўсёды вынаходзілі мелодыі, якія былі адначасова і структурна блюзавымі, рок-н-рольнымі, і мелі беларускія карані, альбо, прынамсі, абапіраліся на беларускія рэаліі ў тэкстах. Так нараджаліся і "Чыкага найтс", "Ім не трэба мой блюз", а на новым альбоме яскравы беларускі рытм-энд-блюзавы стандарт — гэта кампазіцыя "Ведай, гэта наш блюз". Тэкст да гэтага блюза вельмі небанальна ўвасобіла новы тэкставік гурта Н. Гулак, чый паэтычны талент становіцца на ўзровень тэкстаў "Крамы" лепшых часоў аўтарства Зміцера Лукашука.

Дарэчы, Зміцер быў ганаровым госцем канцэрта-прэзентацыі, як і іншыя ўдзельнікі гурта, што супрацоўнічалі з "Крамай" у розныя часы: былы бас-гітарыст Руслан Праўда, вакаліст гурта "Тарнада" Ангус, які на дыску выступіў у якасці мікс-інжынера. Ды й новыя музыканты гурта — бубнач А. Філатаў, басіст Ю. Фядзюк, акардэаніст У. Гаўрыленка — выглядалі ўпэўнена, бо за іх спінамі слухачы ўбачылі вакаліста і кампазітара І. Варашкевіча, гітарыстаў С, Трухановіча і І. Шэўчыка, клавішніка А. Лявончыка і нязменнага гукаінжынера гурта Алеся "Клаўса" Белязяка...

З дзесяцігоддзем гурт "Крама" прыйшлі павіншаваць і маладыя музыканты гурта "Long Play" і салідны "Палац", музыкі якога дапамаглі выканаць чарнобыльскі "Гомельскі вальс". Усе гэтыя нумары праграмы (хоць не ўсе яны ўваходзілі ў прэзентуемы рэліз) былі выкананы так, што многія, у тым ліку і я, адчулі сябе маладзейшымі. Зала стоячы вітала музыкаў на працягу ўсяго канцэрта, падпявала лепшым песням калектыву: "Стэфцы", "Каханню а шостай гадзіне", "Анёлу", "Малдаванцы", знакамітай "Слуцкай браме"...

...Ведаю, што ў цяжкія часы Ігар Варашкевіч, бывала, скрушна скардзіўся на стомленасць, абяцаў пакінуць сцэну з яе вечнымі праблемамі арэнды памяшканняў і папсовай публікі. Не ведаю, як зараз, але пасля такой ўражваючай прэзентацыі і канцэрта хочацца нагадаць яшчэ адну немалаважную сентэнцыю з фільма "Браты Блюз-2000", калі герой Элвуд Блюз гаворыць сваім музыкам, якія хочуць пакінуць у цяжкія часы яго блюзавы гурт: "Калі вы сыдзеце, то развітаецеся са сваімі здольнасцямі, талентам, натхненнем, а наступным пакаленням пакінеце толькі сінтэзаваныя камп'ютэрамі пустыя тэхнамелодыі, квазірытмы, псеўдапесні бандыцкага рэпа пра гвалт, кіслы, рыкаючы поп і саладжавы піск"...

Анатоль МЯЛЬГУЙ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА ЛіМ ГАЗЕТА ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БЕЛАРУСІ

ЗАСНАВАЛЬНІК

ГА "Саюз беларускіх пісьменнікаў"

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 ГОДА

Галоўны рэдактар Алесь ПІСЬМЯНКОЎ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:
Вольга БАРАБАНШЧЫКАВА
Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
Павел ВЕРАБ'ЁЎ,
Алесь ГАЎРОН — *адказны сакратар,*
Мікола ГІЛЬ,
Уладзімір МАРУК — *намеснік галоўнага рэдактара,*
Алесь МАРЦІНОВІЧ,
Яўген РАПІН,
Людміла РУБЛЕЎСКАЯ,
Віктар ШНІП — *першы намеснік галоўнага рэдактара*

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220005, Мінск, вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
прыёмная рэдакцыі — 284-8461
намеснікі галоўнага рэдактара — 284-8525, 284-7985
АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 284-8204
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-7985
літаратурнага жыцця — 284-8462
крытыкі і бібліяграфіі — 284-7985
паэзіі і прозы — 284-7985
музыкі — 284-8153
тэатра, кіно — 284-8153
выяўленчага мастацтва — 284-8462
фота-карэспандэнт — 284-8462
бухгалтэрыя — 284-8462
Тэл./факс — 284-7965

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра тыднёвіка "ЛіМ"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах
Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
(г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 79)
Індэкс 63856 Наклад 2601
Нумар падпісаны ў друк 31.01.2002 г. у 17.30
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ 635

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12